Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. АЎТОРАК № 191 (28301)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**У педагогі — з партфоліа**

СТАР. 5



**Новыя вежы Любчанскага замка**

СТАР. 8



**Падаць у суд... на дзяцей**

СТАР. 11

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Праект указа аб павышэнні пенсій падрыхтаваны, усімі ўзгоднены і цяпер знаходзіцца ў Савеце Міністраў. Дакументам прадугледжана, што не менш чым адзін раз (у год — **рэд.**) павінен быць пераразлік пенсій. Як бы ні развівалася сітуацыя (а сёння ў нас 2 млн 605 тыс. пенсіянераў), мы павінны з боку дзяржавы гарантаваць узровень пенсій не ніжэйшы за 40% сярэдняй заработнай платы. Менавіта для гэтага сёння зроблены пэўны запас і ў рэспубліканскім бюджэце».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9159 | ▼ |
| Еўра | 2,1513 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0306 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0739 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# КНІЖНАЯ ХАТКА



Жыхарка Браслава Вольга Гапанёнак і яе дачка Аляксандра ўпершыню сталі чытачамі незвычайнай бібліятэкі.

У Браславе хутка адкрыецца «маленькая вулічная бібліятэка». Праект задуманы супрацоўнікамі Цэнтральнай раённай бібліятэкі, падтрыманы выканаўчымі ўладамі Браслаўшчыны, а ажыццявілі яго — шапік, каваныя лаўкі, інфармацыйны стэнд — спецыялісты Відзаўскага каледжа. Кожны ахвотны можа ўзяць кнігу з гэтага шапіка, а потым, прачытаўшы, вярнуць назад. На месца выбранай кнігі наведвальнік альбо чытач (як каму падабаецца) павінен пакласці сваю кнігу або часопіс. Тут і проза для дарослых, і чытанкі для дзяцей. Кніжная хатка ўстаноўлена ў маляўнічым кутку — каля Дома культуры і бібліятэкі. Нягледзячы на тое, што ўрачыстае адкрыццё яшчэ наперадзе, браслаўчане ўжо карыстаюцца паслугамі гэтай вольнай, заўсёды адкрытай бібліятэкі.

— У Год культуры мы хацелі парадаваць нашых землякоў цікавым і змястоўным праектам, — падзялілася дырэктар Браслаўскай ЦРБ Вольга Ляснеўская.— Нам прыемна, што ў Віцебскай вобласці першы праект «маленькай вулічнай бібліятэкі» — у нас!

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

## СТВАРЭННЕ СУЧАСНАЙ ЗАКАНАДАЎЧАЙ БАЗЫ ДЛЯ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ПАСПЯХОВАГА САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ КРАІНЫ

*Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь МЯСНІКОВІЧА М.У. на адкрыцці дванаццатай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання*



Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Запрошаныя!

Дванаццатая сесія завяршае работу Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

**11 верасня 2016 года адбыліся выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і 13 верасня — членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь** шостага склікання. У бліжэйшы час Парламент Беларусі ў новым складзе пачне работу.

Галоўны вынік мінулай выбарчай кампаніі — праўдзенне яе ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь, сумленна і дэмакратычна, у спакойнай атмасферы, адкрытай канкурэнцыі і на высокім арганізацыйным узроўні. Гэта пацвярджаюць і заключэнні міжнародных назіральнікаў. У Нацыянальны сход абраныя годныя людзі.

СТАР. 3

## У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ — БЮДЖЭТНАЯ ПАЛІТЫКА

*Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь АНДРЭЙЧАНКІ У.П. на адкрыцці дзясятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання*



Паважаныя дэпутаты, члены Урада і запрошаныя!

Пачынае сваю работу заключная дзясятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

Яна будзе непрацяглай, але досыць насычанай. Нягледзячы на напружаны міжсесійны перыяд, звязаны з праўдзеннем у краіне грамадска-палітычнай кампаніі па выбарах у Парламент, дэпутацкі корпус з усёй адказнасцю падышоў да фарміравання парадку дня сесіі. Плануецца разгледзець каля 26 пытанняў. Цэнтральнае месца сярод іх, безумоўна, займае пакет бюджэтных законапраектаў на 2017 год.

Дэпутаты падключыліся да работы над праектам бюджэту яшчэ вясной, стварыўшы тым самым добрую аснову для яго дэталёвага аналізу і абмеркавання ў пастаянных камісіях. Нядаўна адбылося так званае нулявое чытанне бюджэту. Мы з Урадам пастараліся выпрацаваць узгодненыя падыходы адносна найбольш прынцыповых напрамкаў бюджэтнай і падатковай палітыкі.

СТАР. 3

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «Усе рэформы мы правялі. Цяпер трэба ўдасканальваць тое, што сёння ў нас ёсць»

### З удзелам Прэзідэнта адбылася нарада па пытаннях узаемадзеяння з МВФ

**Пры абмеркаванні новай крэдытнай праграмы Беларусі з Міжнародным валютным фондам неабходна, безумоўна, улічваць інтарэсы беларускага народа, заявіў Аляксандр Лукашэнка, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Прэзідэнт адзначыў, што ў МВФ ёсць стандартная форма ўзаемадзеяння з любой дзяржавай пры вядзенні перагавораў аб прадастаўленні крэдыту, і патрабаванні, што выстаўляюцца, таксама ў цэлым аднолькавыя. «У мяне склалася дакладнае ўражанне, чаго хочуць акцыянеры, заснавальнікі МВФ ад тых дзяржаў, з якімі вядуцца перагаворы. Гэта значыць, у МВФ ёсць пэўная палітыка, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Рашэнні прымаюцца ўсё ж такі па рэкамендацыях тых, у каго ў МВФ больш грошай, хто мае кантрольны пакет акцый. Дамінуючыя акцыянеры — ЗША і ЕС. Без іх рашэнне МВФ ніколі не прымалася».

«Гэта суперліберальныя патрабаванні (стандартна выстаўляемыя МВФ. — **Заўвага БЕЛТА**). Скажу больш — у канчатковым выніку яны нічога не маюць з той палітыкай, якую дэклараваў Прэзідэнт на першых прэзідэнцкіх выбарах, магчыма, на другіх, і нават цяпер, — заявіў беларускі лідар. — Калі іх (патрабаванні. — **Заўвага БЕЛТА**) прачытаеш, усё зводзіцца да аднаго (калі гаварыць аб сацыяльных напрамках): ніякага павышэння зарплаты, неадкладнае павышэнне тарыфаў і іншага. Камуністы сказалі б — на ўдушэнне народа. Я не хачу сказаць, што нас хто-небудзь хоча ўдушыць. Нас ніхто не панукае, але, на жаль, формула такая».

«Хачу вас папярэдзіць — тых, хто вядзе гэтыя перагаворы: калі вы хочаце перакрэсліць усё, што зроблена народам і Прэзідэнтам за 20 гадоў, гэтага не атрымаецца. Гэтым не займайцеся. Бедным беларускі народ мы рабіць не маем права», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Я не кажу, што ўсё, што вы прынеслі сёння, падыходзіць пад гэту негатыўную фармулёўку. Але я хачу пачуць вас, вашу матывацыю», — дадаў Прэзідэнт, звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады.

У якасці аднаго з прыкладаў Аляксандр Лукашэнка прывёў патрабаванні МВФ адносна палітыкі па распараджэнні дзяржуласнасцю. «Я заўсёды гаварыў, што мы ніколі не будзем адмаўляцца ад дзяржаўнай уласнасці, калі яна нармальна функцыянуе. Больш таго, мы будзем абапірацца на яе, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Нам у выніку прапануецца праз нейкі прамежак часу не тое што прыватызаваць усё і ўся, а наогул адысці ад прыватызацыі. Прыняць нейкі там закон, і не закранаць гэта».

«І нават калі атрымаецца бандыцкая прыватызацыя, то праз 10 гадоў да гэтага пытання вярнуцца нельга. Пасля заканчэння трох гадоў як была прыватызацыя, так і застанецца», — зазначыў Прэзідэнт.

Даўно нагнаўшым аскому кіраўнік дзяржавы назваў і пытанне павышэння тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі. «Разважаючы над гэтым пытаннем, я спрабаваў падысці да яго з іншага боку: хто павінен плаціць і можа, той павінен плаціць. Давайце паглядзім, а хто зможа заплаціць па тых тарыфах, якія нам сёння навязваюцца (з папярэджаннем не павышаць зарплату), — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Хто? Рабочы — не, селянін — не, настаўнік — не, урач — не, дзяржслужачы — не, афіцэр — не. А хто? Няхай 100—200 тыс. бізнесменаў, а ў нас амаль 5 млн працоўных. Які мы эфект ад гэтага атрымаем? Усё роўна за кошт бюджэту пачнём плаціць за настаўніка, урача, рабочага, селяніна, дзяржслужачага, ваеннага. Але ў нас і патрабаванні да бюджэту вельмі строгія з боку МВФ».

На думку Прэзідэнта, такая ж сітуацыя можа адбыцца і ў рэальным сектары эканомікі.

Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў, што, як правіла, у выніку рэзкага павелічэння кошту паслуг у ЖКГ маюць месца вялікія неплацяжы. «Дарэчы, у нас пры цяперашніх цэнах ужо, на маю думку, неплацяжы існуюць па паслугах ЖКГ. Няхай невялікія, але яны існуюць. Чаго мы даб'ёмся?» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён канстатаваў, што некаторыя, у тым ліку ў складзе ўрада, выказваюць меркаванне аб неабходнасці абавязковага правядзення тых ці іншых рэформ. «Я ўжо тысячу разоў гаварыў: усе рэформы мы правялі. Мы ўдасканальваем тое, што сёння ў нас ёсць», — заявіў Прэзідэнт.

## Сёння пачынаецца візіт Прэзідэнта ў Пакістан

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 4—6 кастрычніка здзейсніць афіцыйны візіт у Ісламскую Рэспубліку Пакістан, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Праграмай візіту запланаваны перамовы з прэм'ер-міністрам краіны Навазам Шарыфам, прэзідэнтам Мамнунам Хусэйнам, кіраўніцтвам пакістанскага парламента.

Па выніках сустрэч чакаецца падпісанне двухбаковых дакументаў па розных кірунках супрацоўніцтва.

Аляксандр Лукашэнка таксама прыме ўдзел у цырымоніі адкрыцця 4-га Беларуска-пакістанскага дзелавога і інвестыцыйнага форуму ў Ісламабадзе. Шэраг сустрэч і перамоў з пакістанскімі партнёрамі запланаваны ў чэнняў беларускай дэлегацыі.

■ Супрацоўніцтва

# У ПОШУКАХ КРОПАК РОСТУ

**Прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ падчас сустрэчы з прэм'ер-міністрам Малдовы Паўлам Філіпам заявіў, што наша краіна разлічвае выйсці на тавараазварот з Малдовай у 400 млн долараў. Андрэй Кабякоў таксама падкрэсліў, што галоўная мэта перамоваў — знаходжанне канкрэтных «кропак росту», дзякуючы якім стане магчымым істотна актывізаваць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва.**

Таксама падчас двухдзённага афіцыйнага візіту ў Малдову Андрэй Кабякоў адзначыў, што сёлета ў першым паўгоддзі, нягледзячы на няспынныя крызісныя з'явы ў сусветнай эканоміцы, намеціўся рост тавараабароту дзвюх краін. «За сем месяцаў аб'ём узаемнага гандлю павялічыўся ў параўнанні з мінулым годам амаль на 10% і склаў 150 млн долараў. Нам трэба замацаваць гэты станоўчы вынік і ставіць перад сабой мэту вярнуцца на ўзровень 2014 года — каля 400 млн долараў», — растлумачыў Андрэй Кабякоў.

«Сур'ёзную перспектыву мы бачым у кааперацыйных сувязях. Зараз у Малдове вырабляюцца беларускія тралейбусы і трактары. Працуюць над праектам зборачнай вытворчасці аўтобусаў МАЗ», — адзначыў Андрэй Кабякоў. Паводле яго слоў, беларускія вытворцы гатовыя да павелічэння аб'ёмаў выпуску прадукцыі на дзеючых вытворчасцях, рэалізацыі новых значных для дзвюх краін праектаў. Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што цікавым сумесным праектам з'яўляецца зборка гібрыдных тралейбусаў, якая пачалася ў гэтым годзе ў Малдове. Яшчэ адзін прыклад супрацоўніцтва — нядаўна створанае зборачнае прадпрыемства беларускіх трактароў малой і сярэдняй магутнасці ў Гагаузіі.

«Акрамя таго, мы зацікаўлены ў арганізацыі сумеснай перапрацоўкі малдаўскай плодаагароднінай прадукцыі ў Беларусі для далейшай яе пастаўкі на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза, у тым ліку з дапамогай развітой прамысловай і транспартна-лагістычнай інфраструктуры Беларусі», — сказаў Андрэй Кабякоў. Паводле яго слоў, Беларусь гатова падзяліцца сваімі напрацоўкамі ў галіне будаўніцтва дарог і інфраструктуры, узвядзення малочнатаварных ферм і іншых сельскагаспадарчых аб'ектаў.

Па словах **начальніка ўпраўлення інфармацыі — прэс-сакратара МЗС Беларусі Дзмітрыя МІРОНЧЫКА**, адносіны паміж Беларуссю і Малдовай носяць дружалюбны характар і вызначаюцца узаемаразуменнем, актыўны палітычны дыялог адбываецца на самым высокім узроўні. Для Беларусі Малдова з'яўляецца важным гандлёва-эканамічным партнёрам. За 7 месяцаў 2016 года ў аб'ёме беларускага экспарту Рэспубліка Малдова заняла 18-е месца ў свеце і 4-е месца па аб'ёме тавараабароту сярод краін СНД (пасля Расіі, Украіны і Казахстана). Таксама Беларусь застаецца важным спажыўцом малдаўскай вінаробнай і плодаагароднінай прадукцыі — каля 25% і 10% малдаўскага экспарту адпаведна.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■

❍ КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

## РЫНКІ МАЛДОВЫ ДЛЯ НАС АДКРЫТЫ

**Пра тое, якія перспектывы ёсць у двухбаковым супрацоўніцтве, «Звяздзе» расказаў загадчык сектара даследаванняў праблем знешняга гандлю Інстытута эканомікі НАН Дзмітрый БЕРАСНЕЎ:**

— За першыя сем месяцаў бягучага года назіраецца невялікі спад (11,6%) у беларускім экспарце ў Малдову адносна аналагічнага перыяду мінулага года. Асноўныя пастаўкі ў 2015 годзе склалі нафтапрадукты (амаль 40%). Сёлета іх доля скарацілася да 25% па большасці з-за цэнавых умоў, паколькі кошт прадукцыі знізіўся. Мы пастаянна пастаўляем прадукцыю машынабудавання. Нашы трактары на першым месцы па аб'ёмах паставак у параўнанні з іншымі краінамі. Мы замацаваліся на гэтым рынку. Акрамя гэтага, сёлета ў нас выраслі пастаўкі цукру і бульбы.

Імпартуем у асноўным сельскагаспадарчую прадукцыю. Гэта яблыкі і грушы. У 2015 годзе іх доля склала 23,9%, а за сем месяцаў гэтага года павялічылася да 39,6%. У цэлым, увесь імпарт з Малдовы ў нас вырас на 35,2% у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Другое месца па аб'ёмах займае натуральнае вінаграднае віно (17,4%).

Мы прааналізавалі, што наогул закупляла Малдова ў 2015 годзе за ўсіх краінах свету, і высветлілі, што першае месца — гэта нафтапрадукты. Беларусь дастаткова трывала замацавалася ў гэтай галіне на малдаўскім рынку, аднак ёсць патэнцыял і для павелічэння паставак. Да таго ж бачыцца ўяўляецца выхад на малдаўскі рынак беларускіх лекавых сродкаў. Яны мала прадстаўлены ў краіне, таму аб'ёмы неабходна нарошчваць. Малдова ў досыць буйных памерах закупляе правады ізаляваныя і кабелі. У Беларусі ёсць прадпрыемствы, якія вырабляюць гэтую прадукцыю, аднак пастаўкі ў краіну вельмі невялікія. Варта звярнуць увагу на сродкі абароны раслін, шыны, мэблю і халадзільнікі, якія таксама актыўна імпартуюцца малдаўскім бокам. Ва ўсіх гэтых галінах ёсць патэнцыял для Беларусі па павелічэнні паставак.

Перспектыўным выглядае і кааперацыйнае супрацоўніцтва. Калі беларускае прадпрыемства з'яўляецца ў іншай краіне, гэта «прывязвае» жыхароў да нашай прадукцыі. Адбываецца павелічэнне паставак спадарожных кампанентаў, лягчэй прасоўваюцца работы па стварэнні дылерскай сеткі. Аднак развіццё гэтага кірунку шмат у чым залежыць ад фінансавых магчымасцяў краін.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Акцэнты тыдня



# НЕМАГЧЫМА ІГНАРАВАЦЬ

Дастаткова значны для будучыні Еўрасаюза **рэферэндум прайшоў у нядзелю ў Венгрыі**. Венгерскае кіраўніцтва рашуча выступала супраць планаў Еўракамісіі раўнамерна размяркоўваць бежанцаў па тэрыторыі ўсіх краін ЕС, каб пазбегнуць іх празмернай канцэнтрацыі ў некалькіх самых багатых дзяржавах. Прэм'ер-міністр краіны Віктар Орбан лічыць, што ўсіх нелегальных мігрантаў трэба дэпартаваць з тэрыторыі ЕС, а не рассяляць па ёй. Нягледзячы на пазіцыю Венгрыі, у выніку рашэнне прынялі. Правядзенне рэферэндуму, на якім грамадзяне павінны былі сказаць сваё важкае слова, стала чарговай спробай абысці непапулярнае рашэнне. Па ўсіх апытаннях большасць грамадзян рашуча падтрымала сваё палітычнае кіраўніцтва, не жадаючы прымаць бежанцаў на сваёй тэрыторыі. Вынікі рэферэндуму пацвердзілі папярэднія апытанні — адмоўна на магчымасць завозу мігрантаў у Венгрыю адказалі 98,21 працэнта грамадзян, якія наведалі рэферэндум. Так што пэўным сігналам для Брусэля ён стаў. Але пазіцыя Венгрыі была падарваная тым, што рэферэндум прыйшлося прызнаць несапраўдным — на яго прыйшло толькі каля 40 працэнтаў грамадзян пры неабходнасці ўбачыць на ім не менш за 50 працэнтаў. Гэта важна для захавання Еўрасаюза як дзеяздольнай арганізацыі, улічваючы, што прэстыж ЕС і так ужо моцна падарваны планаваным выхадам Вялікабрытаніі.

На мінулым тыдні і **Вялікабрытанія вызначылася з датай выхаду з ЕС** — неабходны для гэтага запыт будзе зроблены не пазней чым у сакавіку 2017 года, пасля чаго пачнецца доўгая двухгадовая працэдура афіцыйнага разводу. Прэм'ер-міністр прызнала, што працэс выхаду негатыўна адаб'ецца на эканоміцы Вялікабрытаніі, але, магчыма, не так цяжка, як чакалася раней. Адным з крокаў па выхадзе стане адмена «Закона аб еўрапейскіх супольнасцях 1972 года», які ўвёў у дзеянне вяршэнства заканадаўства Еўрапейскага саюза на тэрыторыі Вялікабрытаніі і вяртанне згубленых пазіцый нацыянальнаму праву.

Важная сімвалічная падзея адбылася ў суботу, 1 кастрычніка. У гэты дзень **скончыўся кантракт карпарацыі па кіраванні даменнымі імёнамі і IP-адрасамі (ICANN) з міністэрствам гандлю ЗША і Нацыянальным кіраваннем інфармацыі і сувязі**. Цяпер склад карпарацыі радыкальна зменіцца — замест ранейшай падпарадкаванасці ўладам ЗША, у яе ўвойдуць прадстаўнікі ўлад усіх краін — членаў урадавага камітэта ICANN, работнікі інтэрнэт-галіны і нават карыстальнікі сеткі.

У саміх ЗША галоўнай падзеяй тыдня стала **пераадоленне вета Прэзідэнта на закон, які дазваляе пацярпелым ад тэракту 11 верасня 2001 года падаваць іскі супраць урада Саудаўскай Аравіі**. Амерыканская ўладавыя колы апынуліся ў вельмі складанай сітуацыі. З аднаго боку, Саудаўская Аравія — найважнейшы саюзнік у рэгіёне, дзе знаходзіцца трэціна ўсіх сусветных запасаў нафты, а таксама адзін з найбуйнейшых інвестараў у эканоміку ЗША. З другога, 15 з 19 тэрарыстаў, якія атакавалі ЗША пятнаццаць гадоў таму, мелі грамадзянства гэтай краіны, што грамадская думка ЗША разглядае як адназначнае дачыненне Саудаўскай Аравіі да тэракту. І ўсё гэта адбываецца на фоне прэзідэнцкіх выбараў у ЗША, якія выходзяць на фінішную прамую, калі грамадская думка мае асабліва вялікае значэнне. У выніку Барак Абама паспрабаваў прытрымацца дзяржаўных інтарэсаў, наклаўшы вета на законапраект. Кангрэс пайшоў на повадзе ў грамадскай думкі, пераадолеўшы вета Прэзідэнта. Першы іск быў пададзены амаль адразу, а ўрад Саудаўскай Аравіі асудзіў прыняты закон, паведаміўшы пра яго магчымыя цяжкія наступствы для саміх ЗША.

На Міжнародным энергетычным форуме, які праходзіў 26—28 верасня ў Алжыры, **краіны — члены АПЕК змаглі дамовіцца аб абмежаванні здабычы нафты на ўзроўні 32,5—33 млн барэляў у суткі**. Відавочна, гэта таксама стала адказам Саудаўскай Аравіі, якая звычайна блакіравала падобныя прапановы, на закон аб магчымасці падачы іскаў супраць краіны ў амерыканскіх судах.

**Сірыя з 22 верасня працягвае паспяховы наступ** на тэрыторыі стратэгічна важнага горада Алепа пры падтрымцы Расіі. Гэты наступ рашуча асудзілі ЗША, Францыя і Вялікабрытанія, якія лічаць, што ён парушае ўмовы перамір'я, якое пачалося 12 верасня. ЗША нават прыгразілі разрывам супрацоўніцтва па Сірыі, а таксама намякнулі на тое, што перастануць утрымліваць нейкія трэція сілы ад узбраення сучаснай зброяй паўстанцаў у Сірыі. У адказ намеснік кіраўніка МЗС Расіі Міхаіл Багданаў заклікаў падумаць аб тым, што новая зброя можа быць выкарыстана паўстанцамі і супраць саміх ЗША, улічваючы іх разнамасную палітычную арыентацыю.

**Афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі ў Кітай у канцы верасня стаў самым выніковым.** Перш за ўсё Беларусь атрымала статус максімальна блізкага партнёра КНР, які дазволіць у будучыні ажыццяўляць максімальна эфектыўнае ўзаемадзеянне. Падпісаны дамоўленасці і пагадненні на суму ў 11 мільярдаў долараў, прытым гаворка ідзе не пра крэдыты, а пра патэнцыйныя інвестыцыі. Кітайскі бок пацвердзіў прынцыповую нацэленасць на поўнамаштабнае развіццё Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка, вылучыўшы грандыёзную суму больш за 230 мільёнаў долараў на стварэнне яго сацыяльнай інфраструктуры. Рэалізацыя гэтых і іншых пагадненняў можа зрабіць Кітай важным лакаматывам у садзейнічанні развіццю беларускай эканомікі ва ўмовах рэгіянальнага эканамічнага спаду.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■

# СТВАРЭННЕ СУЧАСНАЙ ЗАКАНАДАЎЧАЙ БАЗЫ ДЛЯ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ПАСПЯХОВАГА САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ КРАІНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

7 кастрычніка 2016 года планууецца сустрэча Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі з членамі Савета Рэспублікі і дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў пятага і зноў абранага шостага скліканняў Парламента. Несумненна, гэта будзе знакавае мерапрыемства для ўдакладнення прыярытэтаў работы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь на наступныя чатыры гады.

**Аб некаторых выніках работы Савета Рэспублікі пятага склікання**

Мы адобрылі **414 законаў, у тым ліку ратыфікавалі 207 міжнародных дагавораў, прынялі да ведама 23 дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Большая частка разгледжаных нарматыўных прававых актаў накіравана на забеспячэнне росту эканамічнага патэнцыялу краіны. Сярод іх — законы «Аб інвестыцыях», «Аб канцэсіях», «Аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасці», «Аб аўдытарскай дзейнасці», «Аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі», «Аб рынку каштоўных папер», «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве» і інш.

40 прынятых законаў ствараюць адпаведную прававую базу для сацыяльнай сферы.

Прыняты законы аб Ваеннай дактрыне Рэспублікі Беларусь, аб ваенным становішчы, аб Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь.

Работа Савета Рэспублікі ў мінулым перыядзе была шматграннай і не зводзілася толькі да заканатворчасці. **Пытанні павышэння эфектыўнасці дзейнасці органаў мясцовага самакіравання былі прадметам пастаяннай увагі Савета Рэспублікі.**

На працягу склікання **Саветам па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання праведзена 11 пасяджэнняў, 9 семінараў, 22 практычныя заняткі** са старшынямі Саветаў дэпутатаў пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню, дзе разгледжана шырокае кола пытанняў і прыняты актуальныя рашэнні па павышэнні эканамічнага патэнцыялу рэгіёнаў, паляпшэнні прадпрымальніцкага асяроддзя, прыцягненні інвестыцый і дадатковых даходаў у бюджэт, забеспячэнні занятасці грамадзян і стварэнні новых працоўных месцаў, уключэнні ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца або выкарыстоўваецца неэфектыўна, добраўпарадкаванні населеных пунктаў і навядзенні парадку на зямлі і інш.

У якасці **найбольш важных вынікаў работы Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання** можна назваць унясенне прапаноў па ўдасканаленні заканадаўчых актаў. Так, у прыватнасці, унесены змяненні і дапаўненні:

ва ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 студзеня 2014 г. № 26 «Аб мерах па ўдасканаленні будаўнічай дзейнасці» і ад 27 снежня 2007 г. № 667 «Аб адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў» — па пытаннях эфектыўнага выкарыстання сродкаў, атрыманых на аўкцыёнах арэнды або продажу зямельных участкаў;

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 сакавіка 2014 г. № 128 — па пытаннях адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўпарадкавання;

Закон «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання».

Акрамя таго, прапановы СУОМС па ўдасканаленні практыкі прыёму ў сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы ўлічаны ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 ліпеня 2013 года № 334.

Выпрацаваныя прапановы і рэкамендацыі выкарыстоўваюцца органамі мясцовага кіравання і самакіравання ў практычнай дзейнасці.

Мы запусцілі ў работу новы праект — маніторынгавыя групы пры Саветах дэпутатаў абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў. Пакуль рана казаць пра вынікі — работы яшчэ вельмі шмат. Некалькі павысілася эфектыўнасць рэгіянальных сходаў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў. У маі—жніўні 2016 года яны прайшлі паўсюдна з удзелам членаў Савета Рэспублікі. Адбыўся адкрыты дыялог заканадаўчай і выканаўчай галін улады, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання і насельніцтва. Удзельнікі сходаў вынікі ацэньваюць станоўча. Людзі выказвалі прапановы, ацэнкі, часам не вельмі прыемныя. Добра, што адразу на сходах, як правіла, прымаліся неабходныя рашэнні. Вядома, не ўсюды. Прынцып прамога дзеяння мясцовай улады і народа, безумоўна, патрабуе далейшага развіцця, сістэмнай работы. Але зачын створаны, гэта абнадзейвае і нацэльвае на эфектыўны вынік. Праблем больш чым дастаткова: стварэнне новых працоўных месцаў, пераадоленне бюракратызму, абыякавасці. Саветы дэпутатаў, я лічу, павінны актыўна садзейнічаць спрашчэнню дазвольных працэдур у сферы занятасці. Мы гэтую тэму абмяркоўвалі са старшынямі Брэсцкага і Магілёўскага абласных Саветаў дэпутатаў Ашмянцавым Сяргеем Дзмітрыевічам і Ісачэнкам Анатолем Міхайлавічам, у Сакратарыяце Савета Рэспублікі, з навукоўцамі, МПЗ. Праблемы простага чалавека, яго работа, умовы працы і побыту — галоўны клопат Саветаў дэпутатаў і членаў Савета Рэспублікі. Давайце больш актыўна вырашаць гэтыя задачы.

Кіраўніцтва, члены Савета Рэспублікі, старшыні пастаянных камісій, работнікі Сакратарыята выконвалі шэраг важных канкрэтных даручэнняў па эканамічных, сацыяльных праектах і міжнародных мерапрыемствах, удзельнічалі ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Усё гэта дазваляе Савету Рэспублікі як палаце тэрытарыяльнага прадстаўніцтва паўней валодаць становішчам спраў на месцах і ўлічваць гэта ў сваёй дзейнасці.

Паважаныя калегі!

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **на сістэмнай аснове ўключыўся ў работу па рэалізацыі Асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады,** адобраных пятым Усебеларускім народным сходам.

24 жніўня 2016 г. адбылося пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі, прысвечанае задачам Савета Рэспублікі па рэалізацыі прыярытэтных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны (інвестыцыі, занятасць, экспарт, інфарматызацыя, моладзь) на сучасным этапе. Прыняты адпаведныя рашэнні.

У Савеце Рэспублікі **распрацаваны прыкладны пералік з 129 праектаў заканадаўчых актаў,** прыняцце якіх дазволіць рэалізаваць задачы, пастаўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і пятым Усебеларускім народным сходам, **сістэматызаваць заканадаўчую базу** і стварыць неабходныя прававыя ўмовы для эфектыўнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Завяршаецца ў нас работа над падрыхтоўкай прапаноў па стварэнні дадатковых умоў для развіцця малога і сярэдняга бізнесу. Нас турбуе тое, што колькасць занятых у эканоміцы скарачаецца. За апошнія паўгода сярэднеспісачная колькасць работнікаў па відах эканамічнай дзейнасці паменшылася на 80 тыс. чалавек (на 2,8 працэнта).

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У ходзе гэтай сесіі нам **трэба будзе разгледзець рэспубліканскі бюджэт на 2017 год,** папраўкі ў Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь, а таксама бюджэты двух пазабюджэтных дзяржаўных фондаў. Дакументы старанна вывучаліся ў Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, разглядаліся на пасяджэннях Прэзідыума Савета Рэспублікі і нарадах. Хачу падзякаваць усім членам Савета Рэспублікі за ўдзел у гэтай рабоце, асабліва адзначу старшыню Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Панцюхова Уладзіміра Іванавіча, намеснікаў старшыні Пастаяннай камісіі Мароза Аляксандра Іванавіча і Паследнюю Тамару Іванаўну, намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Русецкага Анатоля Максімавіча.

Усяго на дванаццатай сесіі планууецца разгледзець больш за 20 законапраектаў.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У мэтах выканання даручэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі і Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Уладзіміравіча Пуціна, дадзенага імі на трэцім Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, **пачалася канкрэтная работа з Саветам Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі па ўкараненні на ўзроўні Саветаў дэпутатаў новых формаў супрацоўніцтва рэгіёнаў нашых краін.**

У жніўні ў Магілёве Саветамі дэпутатаў Магілёўскай і Бранскай абласцей праведзены такія мерапрыемствы. Брэсцкі абласны Савет дэпутатаў сумесна з калегамі з Ленінградскай вобласці таксама адпрацаваў шэраг праектаў.

Што пры гэтым галоўнае? Саветы дэпутатаў пачалі займацца не толькі сацыякультурнымі сумеснымі мерапрыемствамі. Увага сканцэнтравана на заключэнні гаспадарчых дагавораў, кантрактаў, стварэнні сумесных прадпрыемстваў. Абмяркоўваюцца прадметныя праекты ў адукацыі, мясцовым самакіраванні.

Абласным і Мінскаму гарадскому Саветам дэпутатаў просьба актывізаваць дадзеную работу, пры гэтым неабходна разумець, што ў яе цэнтры — пытанні эканамічнага супрацоўніцтва, уключэння ў гэтыя працэсы моладзі.

У міжсесійны перыяд мы актыўна працавалі па нарошчванні супрацоўніцтва з парламентамі Францыі, Польшчы, Індыі. Неабходна больш інтэнсіўна ўзаемадзейнічаць з Усекітайскім сходам народных прадстаўнікоў, Бундэстагам Германіі. Рэзервы для гэтага ёсць.

Рэспубліка Беларусь у наступным годзе пачынае старшынстваваць у Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятыве, у нас пройдзе шэраг мерапрыемстваў высокага ўзроўню, у тым ліку і парламенцкіх. Таксама ў ліпені 2017 г. у Мінску адбудзецца маштабнае мерапрыемства — 26-я штогадовая сесія ПА АБСЕ. Падрыхтоўка да гэтых важных падзей у Парламенце ўжо пачалася. Мы павінны не толькі годна правесці іх, але і выступіць з ініцыятывамі, накіраванымі на ўмацаванне міжпарламенцкага дыялогу ў рамках гэтых міжнародных арганізацый.

Дзякуй за ўвагу.

# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ — БЮДЖЭТНАЯ ПАЛІТЫКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У цэлым праект галоўнага фінансавага дакумента носіць рэалістычны і збалансаваны характар, стварае неабходныя ўмовы для вырашэння задач па развіцці нацыянальнай эканомікі і выкананні сацыяльных абавязацельстваў дзяржавы. Нягледзячы на жорсткія патрабаванні да расходавання дзяржаўных сродкаў, бюджэт прадугледжвае меры, накіраваныя на павелічэнне выдаткаў на ахову здароўя, адукацыю і навуку. Прадугледжаны сродкі на выплату мацярынскага капіталу. Усё гэта, у канчатковым выніку, інвестыцыі ў чалавечы патэнцыял — галоўны набытак нашай краіны.

Сур'ёзная ўвага ў ходзе сесіі будзе ўдзелена маладому пакаленню. Карэкціроўка Закона «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі» дасць магчымасць удасканаліць сістэму грамадзянскага і патрыятычнага выхавання, паслужыць развіццю інавацыйнай актыўнасці моладзі, актывізацыі будатрадаўскага і валанцёрскага руху. Асаблівая ўвага ў праекце надаецца рэалізацыі асноўных палажэнняў маладзёжнай кадравай палітыкі.

Гаворачы аб іншых пытаннях парадку дня, трэба вылучыць праект новага Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў. З улікам нашых абавязацельстваў у рамках ЕАЭС трэба будзе разгледзець шэраг законапраектаў у эканамічнай сферы. З міжнародных дагавораў, якія мы плануем ратыфікаваць, найбольшую цікавасць у грамадстве, несумненна, выкліча Канвенцыя аб правах інвалідаў. Яе ратыфікацыя створыць дадатковыя гарантыі паўнавартаснага ўключэння гэтай катэгорыі нашых грамадзян ва ўсе сферы грамадскага жыцця.

Такім чынам, з закрыццём сесіі ўсе планы па прыняцці найбольш значных праектаў будуць выкананы. Новае скліканне зможа аператыўна разабрацца ў спецыфіцы заканатворчасці і прыступіць да вырашэння пастаўленых перад ім задач.

Добрую аснову для далейшай работы мы пакідаем нашым наступнікам і ў плане рэалізацыі даручэнняў Прэзідэнта аб павышэнні міжнароднай ролі Парламента. Акрамя напрацовак на пляцоўках, дзе мы ўзаемадзейнічаем з нашымі стратэгічнымі партнёрамі па Саюзнай дзяржаве, СНД, АДКБ, у нас ёсць і канкрэтныя вынікі прасоўвання нацыянальных інтарэсаў на далёкай дузе міжнароднага супрацоўніцтва. Літаральна нядаўна мы атрымалі афіцыйнае пацвярджэнне прадастаўлення Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь статусу пастаяннага назіральніка ў Лацінаамерыканскім парламенце.

Істотна палепшыліся нашы адносіны з заходнімі калегамі. У ліпені прынята рашэнне аб правядзенні летам 2017 года ў Мінску 26-й сесіі ПА АБСЕ. Актывізаваўся двухбаковы дыялог па лініі груп дружбы з парламентарыямі В'етнама, Францыі, Японіі. У жніўні ў Палаце прадстаўнікоў адбылася грунтоўная размова з віцэ-маршалам Сейма Рэспублікі Польшча, які дазваляе нам вывесці наша міжпарламенцкае супрацоўніцтва на якасна новы ўзровень.

Мы прынялі ўдзел у сустрэчы спікераў парламентаў краін Цэнтральна-Усходняй Еўропы, 25-й Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора. У пачатку кастрычніка чакаецца візіт германска-беларускай парламенцкай групы Бундэстага. Словам, работа зроблена вялікая, і шчыльнасць міжнароднай праграмы Палаты прадстаўнікоў будзе толькі ўзрастаць.

Тое ж самае можна сказаць і аб рабоце ў выбарчых акругах. У міжсесійны перыяд дэпутаты актыўна мелі зносіны з насельніцтвам, працоўнымі калектывамі, тлумачылі курс, адобраны пятым Усебеларускім народным сходам, важнасць для краіны правядзення парламенцкай выбарчай кампаніі.

Выбары прайшлі спакойна, арганізавана, у поўнай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам. Гэта яшчэ раз пераканаўча прадэманстравала высокі ўзровень палітычнай культуры беларускага грамадства, адзінства народа і тую ступень падтрымкі, якую людзі аказваюць палітыцы, якую праводзіць дзяржава.

Карыстаючыся выпадкам, хачу павіншаваць нашых калег-дэпутатаў, якія працягнуць сваю работу ў абноўленай Палаце прадстаўнікоў. Упэўнены, што яны змогуць забяспечыць пераемнасць, апраўдаюць давер сваіх выбаршчыкаў і будуць актыўна працаваць на карысць нашай Радзімы.

## Парламенцкі дзённік

# Выдаткі — на ўзроўні бягучага года

### Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні прынялі бюджэт на 2017 год

**На першым пасяджэнні дзясятай сесіі ніжняй палаты парламента пятага склікання дэпутаты прынялі ажно 19 законапраектаў, якія закранаюць самыя розныя сферы жыцця грамадства. Але, як бы там ні было, галоўным падчас заключнай сесіі з'яўляецца пакет бюджэтных законапраектаў.**

### ПРАПАНОВЫ ЎЛІЧАНЫ

Гаворачы пра гэта, **Людміла ДАБРЫНІНА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах,** падкрэсліла:

— Ужо склалася практыка, калі скліканне завяршае сваю работу прыняццем праекта закона аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год. Важна, што пытанні, якія хвалявалі дэпутатаў, знайшлі вырашэнне. Асобныя з іх ужо ўлічаны ў праекце закона аб рэспубліканскім бюджэце на 2017 год, а некаторыя прапановы яшчэ будуць дапрацоўвацца.

На думку Людмілы Дабрынінай, істотна тое, што падыход для фарміравання бюджэту на наступны год быў вельмі ўзважаны, грунтоўны.

— Калі казаць пра фарміраванне даходнай часткі бюджэту, то трэба адзначыць устойлівасць, стабільнасць, захавана структура і колькасць падаткаў, — сказала парламентарый. — Калі казаць пра выдаткі бюджэту, то гэта частка захавана практычна на тым жа ўзроўні, што і ў 2016 годзе. Тое, што тычыцца першачарговых плацяжоў — заработнай платы, пенсій, дапамог, харчавання, медыкаментаў, камунальных плацяжоў, то, натуральна, гэта асноўная задача, і гэтыя выдаткі будуць забяспечаны ў поўным аб'ёме. Бюджэт будзе змяняцца. Будзе рост паступленняў, адпаведна, будзе рост і выдаткаў.

### НОВАЕ СУДЗЕЙСКАЕ ПРЫЗНАЧЭННЕ

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу далі згоду на прызначэнне Прэзідэнтам Беларусі новага суддзі Вярхоўнага Суда — Андрэя Кавальчука. Адпаведнае рашэнне сенатары прынялі падчас адкрыцця дванаццатай сесіі пятага склікання верхняй палаты беларускага парламента.

Пасля пасяджэння адбылася сустрэча парламентарыяў з членамі Урада і праўлення Нацыянальнага банка. На ёй паведамлялася аб праектах прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на наступны год і на перыяд да 2020-га, а таксама аб асноўных палажэннях грашова-крэдытнай палітыкі краіны на 2017 год.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by,*
**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# Новы ўзровень сувязяў

**У Маскве падчас Дзён Гомельскай вобласці падпісаны пратаколы па намеры, якія тычацца стварэння вытворчасці экалагічна чыстых вадкіх канцэнтратаў і сухіх торфа-сапрапелевых сумесяў для земляробства, а таксама кармавых дабавак для жывёлагадоўлі. Таксама гамяльчане прапанавалі інвестыцыйныя праекты па будаўніцтве шчэбневага завода і рэканструкцыі шклатарнай вытворчасці, перапрацоўцы дзікарослых грыбоў і ягад і арганізацыі вытворчасці сухіх бульбяных шматкоў.**

Прэзентацыя эканамічнага, інвестыцыйнага і турыстычнага патэнцыялу Гомельскай вобласці прайшла 28 верасня ў дзелавым і культурным комплексе Пасольства Беларусі ў Расіі, паведаміла **прэс-сакратар Гомельскага аблвыканкама Вольга РАБІКАВА**. Цікавасць да мерапрыемства выказалі больш за 200 гасцей не толькі з розных рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, але і з далёкага замежжа.

— Гэта знакавая падзея ў двухбаковых гандлёва-эканамічных стасунках, гісторыя якіх налічвае не адну сотню гадоў, — адзначыў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК**. — Гістарычныя знаходкі, якія захоўваюцца ў фондах абласнога краязнаўчага музея, сведчаць пра тое, што кожны трэці груз апошніх тры стагоддзі прыходзіў у горад над Сожам менавіта з Масквы. Сёння 60% аб'ёму знешнегандлёвых аперацый ажыццяўляецца з Расіяй. Першыя пазіцыі традыцыйна займаюць Масква і Маскоўская вобласць. Толькі за апошнія паўтара года знешнегандлёвы абарот Гомельшчыны з расійскімі рэгіёнамі склаў $6 млрд.

На думку Уладзіміра Дворніка, задача Дзён Гомельскай вобласці — вывесці гандлёва-эканамічныя, навукова-тэхнічныя, культурныя і сацыяльныя сувязі на якасна новы ўзровень. У мерапрыемстве ўдзельнічалі прадстаўнікі органаў улады, дыпламатычных устаноў і дзелавыя кругі Маскоўскага рэгіёна. Патэнцыял Гомельскай вобласці дэманстравалі вядомыя прадпрыемствы, сярод якіх СЭЗ «Гомель-Ратон», Гомельскі тэхнапарк, прадпрыемствы гомельскага мяса-малочнага холдынга, лёгкай прамысловасці і іншыя. Культурную праграму прадставілі выставы «Народны абраз Гомельшчыны», «Неглюбскія ручнікі» і творчыя калектывы рэгіёна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## Расклад на заўтра

# Вэбінары і анлайн-кансультацыі для сацыяльных педагогаў

**Рэсурсны цэнтр сацыяльна-педагагічных тэхналогій адкрыўся на базе БДПУ.**

Як паведаміў падчас цырымоніі ўрачыстага адкрыцця **рэктар універсітэта Аляксандр ЖУК**, упершыню падрыхтоўка сацыяльных педагогаў і сацыяльных работнікаў распачалася ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя Максіма Горкага (сёння гэта БДПУ. — **Аўт.**) 25 гадоў таму. А сёння факультэт сацыяльна-педагагічных тэхналогій актыўна развіваецца.

Тут адкрыта новая спецыяльнасць «Сацыяльная і псіхолага-педагагічная дапамога». Факультэт забяспечыў стварэнне інфармацыйнай і навукова-метадычнай базы Рэсурснага цэнтра, аналагаў якому ў краіне няма.

Цэнтр будзе забяспечваць суправаджэнне вучэбнай дзейнасці студэнтаў і, што асабліва важна, дыстанцыйнае навучанне студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі. Выкладчыкі факультэта і ўніверсітэта змогуць аказваць навукова-метадычную дапамогу маладым навукоўцам, выкладчыкам і педагогам-практыкам.

Тэхнічная аснашчанасць Рэсурснага цэнтра дасць магчымасць рэалізоўваць сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі для інтэграцыі ўсіх удзельнікаў кластара праз правядзенне вэбінараў, анлайн-канферэнцый, майстар-класаў і анлайн-кансультацый. Для рэалізацыі сумеснага з Беларускім саюзам жанчын сацыяльна-адукацыйнага праекта «Здаровая сям'я — здаровая нацыя» ў цэнтры сканцэнтраваны ўсе неабходныя рэсурсы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Падрабязнасці

# МАЛЫ ПРАГЛЫНУЎ... БАТАРЭЙКІ

### Дзякуючы своечасовай медыцынскай дапамозе абышлося без цяжкіх наступстваў

**Двухгадовы малы знайшоў батарэйкі ў шафе, дзе іх складвалі ў каробку для далейшай здачы ва ўтылізацыю. І добра, што бацькі своечасова заўважылі прапажу і выклікалі хуткую дапамогу.**

Урачы Гродзенскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы з дапамогай відэагастрадуадэнаскопа і спецыяльнай кашолкі дасталі са страўніка хлопчыка 6 пляскатых батарэек, а яшчэ адна, якая паспела «збегчы» ў кішэчнік, потым выйшла з арганізма самастойна. **Загадчык эндаскапічнага кабінета Дзмітрый КРЫВЕЦКІ** паведаміў, што малы паводзіў сябе спакойна і таму ўрачэбную маніпуляцыю ўдалося выканаць без прымянення наркозу.

Дарэчы, у той дзень у бальніцу даставілі яшчэ траіх маленькіх пацыентаў з падазрэннем на знаходжанне ў арганізме пабочных прадметаў — каштана ў страўніку, таблеткі аскарбіну, якая засела ў харчаводзе, і разжаванай шкляной ампулы. На шчасце, усё таксама скончылася паспяхова.

Апошнім часам са страўніка-кішачнага тракта дзяцей даставалі, напрыклад, манеты, фрагменты цацак, бусіны. На двух стэндах «няпрошаныя» рэчаў (іх ужо каля 50) у бальніцы можна таксама ўбачыць шрубы, балты, шарыкі, шпількі, рыбалоўныя снасці, палачкі ад ледзянцоў, завушніцы, скурку ад сала, свісток. ... А, пэўна, самымі небяспечнымі з'яўляюцца батарэйкі, бо яны пагражаюць арганізму хімічнымі апёкамі.


Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Загадчык эндаскапічнага кабінета Дзмітрый КРЫВЕЦКІ каля відэагастрадуадэнаскопа, з дапамогай якога з дзіцячага арганізма выдаляюцца батарэйкі і іншыя «няпрошаныя» рэчы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

### БУДЗЬ У КУРСЕ

**Вось якія парады даюць спецыялісты Гродзенскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы.**

Часцей за ўсё ў страўнікава-кішачны тракт пабочны прадмет трапляе падчас дзіцячых гульняў і забаў. Магчыма, малы знайшоў нешта, што яго вельмі зацікавіла, і вырашыў пакаштаваць гэтую навінку на смак. Аднак гэты «эксперымент» можа аказацца вельмі небяспечным, што павінны разумець дарослыя. І таму трэба пільна сачыць за сваёй крохай.

Здараецца, іншароднае цела буйнога памеру можа захраснуць на якім-небудзь узроўні страўнікава-кішачнага тракта. Гэта пагражае многімі ўскладненнямі, аж да лятальнага зыходу. Калі іншародны прадмет, трапіўшы ў страўнікава-кішачны тракт, адразу ж пачаў свой шлях «на выхад», то хвалявацца, на шчасце, не даводзіцца. Так адбываецца даволі часта, але не заўсёды. Як адрозніць спрыяльную сітуацыю ад той, калі іншароднае цела засела ў страваводзе? Аб гэтым можна даведацца па наступных сімптомах:

— беспрычынна паднялася тэмпература цела;

— боль пры глытанні;

— боль за грудной клеткай;

— парушэнне глытання, павышанае слінацячэнне;

— пастаянная млоснасць, ірвота;

— калі нешта засела ў страваводзе — дзіця будзе мучыць кашаль.

Звычайна, калі дзіця праглынула нейкі прадмет і гэта не выклікае ў яго ніякіх небяспечных рэакцый і сімптомаў, то бацькі чакаюць, пакуль іншароднае цела не пакіне дзіцячы арганізм натуральным шляхам, г.зн. падчас дэфекацыі. Аднак у шэрагу выпадкаў па медыцынскую дапамогу трэба звяртацца адразу ж, калі стала вядома, што дзіця праглынула іншародны прадмет. Патэнцыяльна небяспечнымі для дзіцячага здароўя з'яўляюцца:

— вострыя прадметы, такія, як іголка, шпілька, канцылярская кнопка, скрэпка, рыбалоўны кручок, зубачыстка і г. д.;

— прадметы даўжынёй ад трох сантыметраў і болей;

— батарэйкі незалежна ад віду і тыпу, магніты;

Калі вы заўважылі, што ў дзіцяці з'явіліся вышэйпамянёныя сімптомы, асабліва падчас гульні з дробнымі цацкамі ці бытавымі прадметамі, то ні ў якім разе не спрабуйце дастаць пабочны прадмет самастойна, а тэрмінова звяртайцеся да медыкаў. Своечасова пастаўлены дыягназ і аказаная дапамога выратуе жыццё і здароўе вашага дзіцяці. І, вядома, не пакідайце малога без нагляду.


Стэнд іншародных прадметаў, якія праглытваюць дзеці.

## Крок за крокам

# Ад вывучэння мовы — да атрымання прафесіі

**Цэнтр беларускай мовы і культуры адкрыўся ў Нацыянальным універсітэце сучасных моў Пакістана. Пра гэта паведаміла прэс-служба Міністэрства адукацыі.**

Па словах **міністра адукацыі Беларусі Міхаіла ЖУРАЎКОВА**, адным з кірункаў дзейнасці цэнтра стануць падрыхтоўчыя курсы па вывучэнні беларускай і рускай моў. «Цікавасць да беларускай сістэмы адукацыі ў Пакістане досыць вялікая. Сюды будуць прыязджаць выкладчыкі з нашых універсітэтаў. Яны таксама будуць расказваць пра спецыяльнасці, якія можна атрымаць у Беларусі, і ўвогуле пра нашу краіну», — падкрэсліў Міхаіл Жураўкоў.

Кіраўнік ведамства адзначыў, што Пакістан гатовы супрацоўнічаць з Беларуссю ў адукацыйнай сферы. «У час візіту Прэзідэнта Беларусі ў Пакістан мы падпішам мемарандум аб адкрыцці тут цэнтраў прафесійнага навучання. Па першым часе сюды будуць прыязджаць нашы выкладчыкі. Потым мы падрыхтуем глебу, каб маладыя людзі, якія хочуць атрымаць цікавыя прафесіі, прыязджалі ў Беларусь на падрыхтоўку», — растлумачыў Міхаіл Жураўкоў.

У першую чаргу ў Пакістане зацікаўлены ў атрыманні сярэдняй спецыяльнай адукацыі па прамысловых і медыцынскіх спецыяльнасцях, а таксама вышэйшай адукацыі ў медыцыне і IT-сферы. Таксама пакістанская моладзь цікавіцца фундаментальнымі даследаваннямі па матэматыцы, хіміі і фізіцы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Надвор'е

# Паўночны вецер і дажджы

### Сіноптыкі прагназуюць, што ўжо на выхадныя ўдзень будзе толькі 5—12 цяпла

**На гэтым тыдні рэзка пахаладае, калі надвор'е сапсуе моцны парывісты вецер з поўначы і суцэльныя дажджы, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Ужо ў аўторак на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць дажджы, а ў асобных раёнах сіноптыкі абяцаюць нават моцныя ліўні. Больш за тое, удзень у многіх раёнах прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с, у сувязі з чым сіноптыкі аб'явілі аранжавы ўзровень небяспекі. Максімальная тэмпература паветра складзе 7—13 цяпла, а па паўднёвым усходзе — да плюс 17 градусаў. Зусім некамфортнае надвор'е прагназуецца спецыялістамі і ў сераду, калі паўсюдна будуць ісці дажджы, а месцамі чакаюцца моцныя ападкі. На большай частцы тэрыторыі краіны прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—10 цяпла, удзень — плюс 6—13 градусаў, а па паўднёвым усходзе месцамі — да 16 цяпла. Будзе гаспадарыць непагадзь у нас і 6 кастрычніка, калі ападкі чакаюцца на працягу сутак, а ўначы прагназуюцца нават моцныя дажджы. Уначы і раніцай па паўночным захадзе чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—11 цяпла, удзень будзе 7—14 градусаў цяпла, а па ўсходзе краіны — да плюс 16 градусаў. У пятніцу надвор'е крыху супакоіцца, але часам будуць ісці невялікія дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—10 цяпла, а ўдзень будзе плюс 6—13 градусаў.

Паводле папярэдняй прагнозаў айчынных спецыялістаў, на выхадных ападкаў стане менш, але будзе яшчэ халадней. На большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе толькі 2—8 цяпла, а ўдзень будзе плюс 5—12 градусаў. А гэта ўжо сур'ёзна. Так, сур'ёзная такая заяўка, каб батарэі ў кватэрах пачалі цяплець...

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Сезон

# Пачалося паляванне на зайцоў

**Сёлета ў краіне пачатак сезона палявання на капытных супаў з пачаткам сезона здабычы зайца-русака і зайца-беляка.**

Ён будзе доўжыцца з першай суботы кастрычніка да першай суботы лістапада. Паляванне дазволена ў светлы час сутак на жывёл любога полу і ўзросту з падыходу з ганчакамі, якія маюць палявыя дыпломы па зайцу і (ці) лісіцы. З адным ганчаком могуць паляваць да трох паляўнічых. Спосаб здабычы — зброевы, калі выкарыстоўваецца гладкаствольная стрэльба з патронамі са шротам. Ахвотны могуць паляваць бяззброевым спосабам — з хартамі і ловчымі птушкамі.

Нагадваем, што незаконнае паляванне цягне адміністрацыйную адказнасць (штраф ад 20 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй ці без прылад палявання і з пазбаўленнем спецыяльнага права на паляванне) і крымінальную (ад штрафу да пазбаўлення волі тэрмінам да шасці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю).

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Прававая гасцёўня

## За што і чаму ўласнікі жылля плацяць па «камерцыйным» тарыфе?



*«Валодаю двюма кватэрамі ў горадзе. У адной прапісаны я з жонкай, у другой — мой дарослы сын. Кажуць, што пасля спынення прыватызацыі жылля (1 ліпеня 2016 года) тыя, у каго ва ўласнасці больш за адну кватэру, будуць акрамя звычайнай кватрплаты плаціць за другую і іншыя прыватныя хаты яшчэ дадаткова і сумы як за арэнднае жыллё. Няўжо гэта праўда?»*

*Міхаіл Вацлавіч, г. Брэст.*

На пытанне адказвае **Надзея МАЎЧУН, намеснік начальніка ўпраўлення дзяржаўнага рэгулявання сацыяльнай дзейнасці дзяржавы галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі:**

— Сёння ў заканадаўстве адсутнічае паняцце «кватрплата». Існуе плата за карыстанне жылымі памяшканнямі — яе выплачваюць грамадзяне, якія пражываюць у жылых памяшканнях дзяржаўнага жыллёвага фонду камерцыйнага выкарыстання і ў інтэрнатах, а таксама плата за жыллёва-камунальныя паслугі (далей — ЖКП) — яе ўносяць усе карыстальнікі гэтых паслуг незалежна ад таго, жывуць яны ў памяшканнях дзяржаўнага або прыватнага жыллёвага фонду. Паколькі вы з'яўляецеся ўладальнікам жылых памяшканняў на правах уласнасці, то не можа быць ніякай гаворкі пра плату за карыстанне жылым памяшканнем.

Пытанні ўнясення платы за ЖКП рэгулююцца Палажэннем аб парадку разлікаў і ўнясення платы за жыллёва-камунальныя паслугі і платы за карыстанне жылымі памяшканнямі дзяржаўнага жыллёвага фонду, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12 чэрвеня 2014 г. №571 (далей — Палажэнне).

Існуе два віды тарыфаў (цэн) на жыллёва-камунальныя паслугі. Тыя, што субсідзіруюцца дзяржавай, і тыя, што забяспечваюць поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат на аказанне ЖКП.

Згодна з пунктам 12 Палажэння, плата за асобныя віды ЖКП (тэхнічнае абслугоўванне, газа-, электра- і цеплазабеспячэнне, забеспячэнне звадкаваным вуглевадародным газам ад індывідуальных або рэзервуарных установак, гарачае водазабеспячэнне) грамадзянамі, ва ўласнасці і (або) валоданні і карыстанні якіх знаходзіцца адно ці некалькі памяшканняў (доляй у праве агульнай уласнасці на жылых памяшканнях), і ў іх (або ў адным з іх) адсутнічаюць зарэгістраваныя па месцы жыхарства грамадзянін і (або) член яго сям'і, уносіцца плацельшчыкамі ЖКП па ўстаноўленых заканадаўствам тарыфах (цэнах), што поўнасцю пакрываюць эканамічна абгрунтаваныя затраты на аказанне такіх паслуг. Іншымі словамі, аплачваць некаторыя ЖКП па поўных тарыфах прыйдзецца тым уласнікам, у жыллі якіх ніхто не зарэгістраваны.

Пры гэтым заканадаўствам устаноўлены некаторыя выпадкі, калі гэтае правіла не дзейнічае. Напрыклад, не тычыцца яно апекуноў або папячыцеляў, якія пакінулі пастаяннае месца жыхарства ў сувязі з выкананнем адпаведных абавязкаў. На ўвесь час, пакуль яны занятыя гэтай справай, плата за тэхнічнае абслугоўванне будзе налічвацца па тарыфах, што субсідзіруюцца дзяржавай, незалежна ад агульнай плошчы займаемых імі жылых памяшканняў.

Шэраг іншых выключэнняў прыведзены ў Палажэнні.

***Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Праўвой гасцёўні» разам са спецыялістамі Міністэрства юстыцыі мы будзем шукаць на іх адказы.***

■ Прафесійны стандарт

# РАБОТА НАД ІМІДЖАМ

## На педагагічныя спецыяльнасці — з партфоліа

**Пра новыя кампетэнцыі, якія знойдуць адлюстраванне ў прафесійным стандарце педагога, і падрыхтоўку будучых настаўнікаў расказаў падчас анлайн-відэабрыфінгу на партале Саюзнай дзяржавы рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта, прафесар Аляксандр ЖУК.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Мы ўсе цудоўна ведаем, што сёння не толькі студэнты, але і школьнікі дасканала валодаюць сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі. Таму кожны выкладчык павінен быць падрыхтаваны ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Яшчэ адна новая кампетэнцыя, якую дыктуе час, — гэта гатоўнасць працаваць ва ўмовах інклюзіі. Сумеснае навучанне дзяцей з рознымі адукацыйнымі магчымасцямі, у тым ліку з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, — гэта міжнародная тэндэнцыя. Але педагог, які працуе ў такім класе, павінен ведаць, як працаваць з асаблівымі дзецьмі. Не менш важная кампетэнцыя — гэта ўменне працаваць з сям'ёй. У пытаннях выхавання і сацыялізацыі дзяцей сям'я ў апошні час, на жаль, адышла на другі план, таму асноўны клопат лёг на школу. Сёння любы педагог, не толькі класны кіраўнік, але і настаўнікі-прадметнікі, павінны ўмець працаваць з бацькамі, ведаць асаблівасці сучасных сем'яў (няпоўных, неўладкаваных). Да гэтага мы таксама спецыяльна рыхтуем нашых студэнтаў...

**«На кожнага школьніка ствараецца партфоліа, у якім назапашваюцца яго карысныя справы, звязаныя з будучай прафесійнай дзейнасцю».**

На аснове прафесійнага стандарту педагога будуць распрацоўвацца новыя адукацыйныя стандарты і навучальныя праграмы, ствараецца новае пакаленне вучэбна-метадычнага забеспячэння, навучальных дапаможнікаў, у тым ліку і электронныя вучэбна-метадычныя комплексы.

Аляксандр Жук канстатаваў праблему існавання разрыву паміж тэорыяй і практыкай.

— Гэта значыць, што ёсць студэнты, якія шмат ведаюць, але не могуць прымяніць свае тэарэтычныя веды ў педагагічнай практыцы, — патлумачыў ён. — Вось чаму зараз не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце рэалізуецца так званы кампетэнтнасны падыход да падрыхтоўкі сучасных спецыялістаў. Ён прадугледжвае інтэграцыю ведаў і ўменняў. Ад педагога патрабуецца ўменне прымяніць свае веды ў любой сітуацыі, а не толькі ў стандартнай. Ён павінен быць гатовы да таго, што ў аўдыторыі прысутнічаюць студэнты ці навучэнцы з рознымі інтарэсамі, адукацыйнымі магчымасцямі і патрэбамі.

Рэктар расказаў, што на сённяшні дзень БДПУ супрацоўнічае з больш чым 90 універсітэтамі з 22 краін свету. За апошнія пяць гадоў колькасць замежных студэнтаў ва ўніверсітэце павялічылася ўдвая. Геаграфія экспарту адукацыйных паслуг ахоплівае 20 краін свету. «Колькасць магістрантаў у нас павялічваецца нават хутчэй, чым студэнтаў на першай ступені вышэйшай школы. Я лічу, гэта сведчыць пра якасць нашай адукацыі. Апошнім часам мы прапануем замежным студэнтам курсы на англійскай мове, што таксама вельмі запатрабавана. Ёсць інтарэс і да адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі па сучасных інтэрактыўных методыках», — дадаў Аляксандр Жук.

За апошнія два гады ў БДПУ якасна змяніўся склад абітурыентаў. Рэктар прывёў некалькі лічбаў: калі ў 2013 годзе ва ўніверсітэт паступілі ўсяго 32 медалісты, у 2014 годзе — 100, летась — 132, то ў гэтым годзе — ужо 170 медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў з адзнакай.

Павялічваецца сярод студэнтаў і колькасць выпускнікоў гімназій і ліцэяў. У 2014 годзе на першы курс педагагічнага ўніверсітэта было залічана 190 выпускнікоў устаноў адукацыі новага тыпу, у мінулым годзе — 270, а сёлета — 315. Гэта значыць, што 60% першакурснікаў — добра падрыхтаваныя хлопцы і дзяўчаты...

Па словах Аляксандра Жука, у мінулым навучальным годзе было створана больш як сто педагагічных класаў па ўсёй краіне. Там займаюцца амаль паўтары тысячы адзінаццацікласнікаў.

— Чым гэтыя класы адрозніваюцца ад звычайных? Па-першае, гэта профільныя класы, дзе ўсе вучні паглыблена вывучаюць два ці тры прадметы па іх выбары. Акрамя таго, абавязковым для іх з'яўляецца вывучэнне факультатыву «Уводзіны ў педагагічную прафесію» — цягам двух гадоў па дзве гадзіны на тыдзень (усяго 140 гадзін). Праграму факультатыву распрацаваў наш універсітэт, — расказаў Аляксандр Жук. — Немалаважна, што выпускнікі педагагічных класаў будуць мець сур'ёзныя льготы пры паступленні на педагагічныя спецыяльнасці — залічвацца без уступных экзаменаў. Але пры гэтым у атэстацыі яны павінны мець адзнакі па ўсіх прадметах вучэбнага плана не ніжэй як 7 балаў, а па прадметах профільных іспытаў у ВНУ — не ніжэй як 8 балаў.

**«Ад педагога патрабуецца ўменне прымяніць свае веды ў любой сітуацыі, а не толькі ў стандартнай».**

Яшчэ адна абавязковая ўмова — разгорнутая характарыстыка-рэкамендацыя на кожнага абітурыента. Гэта ўжо зона адказнасці школы. На працягу двух гадоў на кожнага школьніка ствараецца партфоліа, у якім назапашваюцца яго карысныя справы, звязаныя з будучай прафесійнай дзейнасцю: дапамога класнаму кіраўніку, правядзенне мерапрыемстваў адукацыйнага характару. На падставе педагагічных спроб вучня будзе стварацца і падпісвацца яго характарыстыка.

Аляксандр Жук падкрэсліў: «Мы добра разумеем, што далёка не кожны выдатнік па прадмеце можа стаць педагогам, таму без экзаменаў выпускнікі будуць залічвацца толькі на такіх умовах. Мы мяркуем, што гэта дапаможа нам вырашыць задачу якаснага набору на педагагічныя спецыяльнасці».

Нядаўна ў БДПУ правялі рэспубліканскую канферэнцыю з навучэнцамі педагагічных класаў, настаўнікамі, якія там працуюць, і меркаванне было адназначным — гэта правільны шлях. Добра распрацаваны факультатыў дапамагае дзецям усвядоміць патрабаванні да педагагічнай прафесіі і праверыць сябе, свае здольнасці, схільнасці да прафесіі, жаданне ёю займацца. «Таму на выхадзе мы будзем мець яўна тых абітурыентаў, якія патрэбны педагагічнай прафесіі — матываваных і добра падрыхтаваных па прадметах. І тады пытанне аб нездавальняючай якасці абітурыентаў будзе цалкам вырашана», — падсумаваў Аляксандр Жук.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ ІТ-пісьменнасць

## З АЗОЎ І ДА СТВАРЭННЯ КЛІЕНЦКІХ САЙТАЎ

**Акадэмія вэб-адукацыі БДУ адкрывае ў кастрычніку новы адукацыйны сезон. Для навучання запрашаюцца вучні 7—11-х класаў, а таксама студэнты вышэйшых навучальных устаноў.**

Гэта сучасная адукацыйная структура функцыянуе на механіка-матэматычным факультэце БДУ з 2014 года. За два гады дзейнасці тут значна пашырылі спіс дысцыплін, якія выкладаюцца. У прыватнасці, на першым узроўні «Работа карыстальніка ў інтэрнэце» прапануецца навучанне рабоце ў глабальнай сетцы з нуля. Слухачоў знаёмяць з гісторыяй інтэрнэту, вэб-серверамі, браўзерамі, прынцыпамі стварэння сайтаў, блогаў і мікраблогаў, сацыяльнымі сеткамі, гульнявымі сайтамі, мабільнымі вэб-праграмамі.

Другі ўзровень «Дызайн і праектаванне сайтаў» заснаваны на навучанні слухачоў стварэнню кліенцкіх сайтаў. У вучэбную праграму ўваходзяць вывучэнне камп'ютарнай графікі, праектаванне і распрацоўка вэб-сайтаў, асновы вэб-дызайну, анімацыя вэб-сайтаў. Таксама ўключаны пытанні прасоўвання вэб-старонак і запуск іх у інтэрнэце.

На трэцім узроўні «Вэб-тэхналогіі» можна атрымаць прафесійныя веды па асновах стварэння вэб-дадаткаў. Задача гэтага ўзроўню заключаецца ў развіцці навыкаў праектавання і праграмавання вэб-праграм на мове PHP.

Заняткі будуць праходзіць па суботах. Распрацаваны таксама сайт дыстанцыйнага навучання акадэміі, дзе слухачы змогуць самастойна вывучыць прапушчаны матэрыял і выканаць практычныя і дамашнія работы.

Вучэбныя групы фарміруюцца па ўзроўні ведаў, а не па ўзроставым прынцыпе. Пры паспяховай здачы экзамену за семестр слухачы атрымліваюць пасведчанне і пераводзяцца на наступны ўзровень. Магчымы таксама і датэрміновы пераход. Пасля заканчэння курса навучання выдаецца сертыфікат БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Педагог года

## ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫЯ ГУЛЬНІ «РУЛЯЦЬ»

**Пераможцам рэспубліканскага конкурсу прафмайстэрства сярод педагогаў устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі стаў педагог Лідскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Сяргей Вераціла.**

Ён кіруе клубам інтэлектуальных гульняў «Стальны пацук». Штогод у яго клубе займаецца каля 120—130 чалавек. «Нашы інтэлектуальныя гульні называюць спартыўным «Што? Дзе? Калі?» Існуе цэлая сістэма спаборніцтваў — чэмпіянаты раёна, вобласці, краіны, Еўропы. Мы ва ўсіх удзельнічаем і стараемся займаць там прызавыя месцы», — расказаў Сяргей Вераціла. Ен адзначыў, што, у адрозненне ад школьнага настаўніка, да педагога дадатковай адукацыі дзеці прыходзяць па ўласным жаданні, таму вельмі важна зацікавіць іх сваёй справай.

У фінале ўдзельнічалі больш як 20 педагогаў па мастацкім, фізкультурна-спартыўным, грамадска-гуманітарным, культурна-забаўляльным, тэхнічным, турысцка-краязнаўчым і экалагічным профілях з усёй краіны. Канкурсантаў чакалі самапрэзентацыя «Маё педагагічнае крэда», абарона адукацыйнага праекта, правядзенне адкрытых заняткаў у незнаёмай аўдыторыі, а таксама псіхолага-педагагічнае тэсціраванне.

**«Да педагога дадатковай адукацыі дзеці прыходзяць па ўласным жаданні, таму вельмі важна зацікавіць іх сваёй справай».**

«Адзін чалавек сказаў, што артыстычны талент — гэта не такая ўжо рэдкасць, значна больш рэдкім з'яўляецца талент заўважыць гэты артыстызм і развіць яго. Менавіта такімі людзьмі і з'яўляюцца фіналісты конкурсу, — лічыць **пераможца папярэдняга конкурсу, кіраўнік клуба інтэлектуальных гульняў «Белая Рысь» Гомельскага дзяржаўнага абласнога палаца дзяцей і моладзі Леанід КЛІМОВІЧ.**

Лаўрэатам І ступені па выніках конкурсу стаў педагог мінскага Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Маяк» Максім Калтыгін. Лаўрэатамі ІІ ступені — педагог Полацкага раённага цэнтра дзяцей і моладзі Наталля Сляпцова і педагог Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі «Ювента» Светлагорскага раёна Алена Рашацько. А педагог з Нараўлянскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Гомельскай вобласці Васіль Чайка стаў лаўрэатам ІІІ ступені.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

## ООО «Управляющая компания «СОВЕТНИК» – управляющий по делу о банкротстве СООО «РЭКУН ПЛАСТИК» извещает о проведении повторных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего должнику

**Торги состоятся 20 октября 2016 года в 15.00 по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, д. 101, оф. 1, каб. 2.**

*Для участия в торгах необходимо подать до 17 октября 2016 года заявку и перечислить на расчетный счет СООО «РЭКУН ПЛАСТИК» р/с 3012162872017 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 702, г. Минск, код 369, УНП 800000106, сумму задатка в размере 5% от начальной цены имущества. Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5% от начальной цены предмета аукциона.*

С имуществом, выставляемым на торги, можно ознакомиться по его месту нахождения, предварительно согласовав время с управляющим по тел. +375293421842.

Прием заявок и документов на участие в торгах осуществляет организатор торгов – ООО «Управляющая компания «СОВЕТНИК» – ежедневно по рабочим дням с 9.00 до 18.00 по адресу: 220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 101, оф. 1, каб. 2.

**Сведения об имуществе, выставляемом на торги.**

| Номер лота | Сведения об имуществе | Начальная цена, за ед. рублей без НДС | Сумма задатка |
|---|---|---|---|
| 1 | Инструмент «Откос 200 мм» | 4 078,53 | 203,93 |
| 2 | Инструмент «Откос» | 4 078,53 | 203,93 |
| 3 | Инструмент «Панель 250 мм» | 2 039,22 | 101,96 |
| 4 | Инструмент панель отд. 200 мм | 2 447,10 | 122,36 |
| 5 | Инструмент Уголок 50х50 | 1 916,91 | 95,85 |
| 6 | Инструмент (стартовый профиль) для пр-ва ПВХ профиля | 2 120,85 | 106,04 |
| 7 | Лента декоративная | 1 916,91 | 95,85 |
| 8 | Экст. фор. ин-т панель отд.(G20-1) 200 мм в 1 поток | 2 487,87 | 124,39 |
| 9 | Блок гусеничного тянущего устройства и пилы Vobau 432-R-240 | 12 736,98 | 636,85 |
| 10 | Вибрационное устройство охлаждения гранул Vibra б.у., 1980 | 3 031,74 | 151,59 |
| 11 | Двушнековый экструдер АМУТ ВА 86 с блоком управления | 18 111,51 | 905,58 |
| 12 | Измельчитель Rapid 45-35-KUP, б.у., 1990 г.в. | 5 384,88 | 269,24 |
| 13 | Измельчитель изделий из пластмасс Dyun DYPS X600.сер.№1102-3 | 14 490,00 | 724,50 |
| 14 | Калибрационный узел IDE ME 14 | 5 698,89 | 284,94 |
| 15 | Калибрующий стол Vobau KK-P-335-4-720-1 | 5 698,89 | 284,94 |
| 16 | Опрокидывающий стол Vobau AS 170 | 3 074,22 | 153,71 |
| 17 | Погрузчик DESTA DV-16 90306zetor5201.16 | 2 605,59 | 130,28 |
| 18 | Погрузчик вилочный JungheinriDFG | 2 605,59 | 130,28 |
| 19 | Пром. уст-ка для охл. воды МК 100 FTEHT с нар. нак. б-м и сист | 12 360,24 | 618,01 |
| 20 | Силос 3 куб.м нерж. Сталь | 2 658,51 | 132,93 |
| 21 | Узел пластификации (б.у.) | 16 670,43 | 833,52 |
| 22 | Узел пластификации СМТ 45 | 16 670,43 | 833,52 |
| 23 | Устройство печати на профилях | 3 058,92 | 152,95 |
| 24 | Формующий инструмент для экструдирования профиля отд. ПВХ пан. | 3 262,86 | 163,14 |
| 25 | Экст. фор. ин-т «Короб 220х55 мм» | 2 854,98 | 142,75 |
| 26 | Экструдер JYH-25 б/у 2007г. | 3 548,34 | 177,42 |
| 27 | Экструз.-формующ. инструмент для пр-ва ПВХ профиль «Шпунт» | 6 117,75 | 305,89 |
| 28 | Экструзионный инструмент «250 мм» | 2 447,10 | 122,36 |
| 29 | Экструзионный инструмент «250 мм» | 2 447,10 | 122,36 |
| 30 | Экструзионный инструмент «Труба 100» | 2 447,10 | 122,36 |
| 31 | Экструзионный инструмент «Труба 110х55» | 2 610,27 | 130,51 |
| 32 | ЭФИ для производства ПВХ проф.» SP200» | 3 262,86 | 163,14 |
| 33 | Станок электроэрозионный вырезной типа ВР-97д № 061102 | 8 714,34 | 435,72 |
| 34 | Калибрационное устройство Bandera (б/у,1987) | 5 698,89 | 284,94 |
| 35 | Отрезное устройство Bandera б.у., 1986 г.в. | 3 074,22 | 153,71 |
| 36 | Тянущее устр-во Bandera (б/у,1987) | 7 038,09 | 351,90 |
| 37 | Калибрационное устройство Bandera б.у., 1986 г.в. | 5 698,89 | 284,94 |
| 38 | Отрезной узел с сист. обеспыливания | 3 861,18 | 193,06 |
| 39 | Тянущее устройство Bandera б.у., 1986 г.в. | 5 698,89 | 284,94 |
| 40 | Экструдер Krauss Maffei 50 KK б.у., 1986 г.в. | 19 657,17 | 982,86 |
| 41 | Комп. гусен. тянущ. устр. Амут. Пила, опрокид. стол.150PS90D450 | 15 811,29 | 790,56 |
| 42 | Комплектный калибрационный стол АМУТ (код NEREG/4) | 5 698,89 | 284,94 |
| 43 | Отрезное устройство с опрокидывающим модулем Bandera /(б/у) | 3 861,18 | 193,06 |
| 44 | Экструдер Cincinnati CMT45 (б/у, 1989) | 19 657,17 | 982,86 |
| 45 | Отрезное устройство Baruffaldi, 1986 г.в | 3 861,18 | 193,06 |
| 46 | Приемное устройство Baruffaldi, 1997 г.в. | 2 191,68 | 109,58 |

Победителем торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам.

Цены указаны без учета налога на добавленную стоимость.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

По результатам аукциона организатор торгов составляет протокол в трех экземплярах.

Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней с даты проведения торгов.

Организатор вправе отказаться от проведения торгов не менее чем за 3 дня до даты проведения торгов.

С более подробной информацией о порядке, условиях проведения торгов, предметах торгов можно ознакомиться по тел. +37529 342 18 42.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ АУКЦИОНОВ

**Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62**

**Продавец:** кооперативно-торговое унитарное предприятие «Витебская универсальная база», юр. адр.: 211319, Витебский р-н, аг. Октябрьский, ул. Оршанская, 2, почт. адр.: 210001, г. Витебск, ул. Комсомольская, 31, факс/тел. (0212) 35-69-45

Лот №1. Капитальное строение с инв. №200/С-50564 площадью 35,2 кв.м, наименование: шашлычная по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, северо-западнее д. Лужесно на зем. участке №221285908101000033 площадью 0,5755 га; капитальное строение с инв. №200/С-86509 протяженностью 419,7 м, наименование: линия электропередачи и наружного освещения по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, северо-западнее д. Лужесно на зем. участках №№ 221285900001000276, 221285900001000278, 221285900001000282, 221285900001000280, 221285900001000277, 221285900001000281, 221285908101000033, 221285900001000279, 221285900001000285, 221285900001000275, 221285900001000274, 221285900001000283, 221285900001000284. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 78 109/781 090 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 7810,90/78 109 000 бел. руб.

Лот №2. Капитальное строение с инв. №200/С-52863 площадью 159,2 кв.м, наименование: здание магазина промышленных товаров по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 178 на зем. участке №240100000002000063 площадью 0,1196 га. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 76032/760 320 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 7603,20/76 032 000 бел. руб.

Лот №3. Капитальное строение с инв. №200/С-52995 площадью 414,6 кв.м, наименование: здание неустановленного назначения; капитальное строение с инв. №200/С-52996 площадью 146,2 кв.м наименование: здание складского помещения; капитальное строение с инв. №200/С-52861 площадью 294,8 кв.м, наименование: магазин, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 168 на зем. участке №240100000002001222 площадью 0,2588 га. Капитальное строение с инв. №200/С-40977, площадью 598,8 кв.м, наименование: магазин, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 168 на зем. участке №240100000002000487 площадью 0,0911 га. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 510060/5 100 600 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 51006/510 060 000 бел. руб. Отчуждение имущества производится с условием размещения общественных центров, предприятий по обслуживанию населения, учреждений и предприятий социально-гарантированного обслуживания

Лот №4. Капитальное строение с инв. №200/С-50480 площадью 1062 кв.м, наименование: фруктохранилище по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Базовая, д. 49/9 на зем. участке с кадастровым №221200000001001922 площадью 3,6714 га. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 158844/1 588 440 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 15884,40/158 844 000 бел. руб.

Лот №5. Капитальное строение с инв. №200/С-51955 площадью 193 кв.м наименование: магазин стройматериалов, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Базовая, 49/11 на зем. участке с кадастровым №221200000001001922 площадью 3,6714 га. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 34200/342 000 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 3420/34 200 000 бел. руб.

Лот №6. Капитальное строение с инв. №200/С-87007 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Базовая, д. 49, площадью 562,9 кв.м, наименование: административное здание. Капитальное строение с инв. №200/С-87115 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Базовая, д. 49/1, площадью 21,5 кв.м, наименование – котельная. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым №221200000001001922 площадью 3,6714 га. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 58 022,40/580 224 000 бел. руб. с НДС. Задаток: 5 802,24/58 022 400 бел. руб.

Аукцион состоится **09.11.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и подачи документов: **с 04.10.2016 с 8.30 по 08.11.2016 до 17.30.** Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: оплатить предмет аукциона в сроки, указанные в договоре купли-продажи. Ранее опубликованные извещения: газеты «Звязда», «Витебские Вести», «Жыццё Прыдзвіння» 16.07.2016.

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением правления Витебского облпотребсоюза от 20.09.2011 №301. Для участия в аукционе представляются документы: заявление на участие в аукционе, заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка, копия документа подтверждающего гос. регистрацию (для юр. лица, индивидуального предпринимателя); копии учредительных документов (для юр. лица); легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (не ранее чем за 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык (для юр. лиц – нерезидентов РБ), заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. При подаче документов физ. лицо, представитель физ. лица и юр. лица предъявляет документ, удостоверяющий личность, документ подтверждающий полномочия лица на представление интересов. Осмотр предметов торгов осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по месту нахождения имущества. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона на р/счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Организатор аукциона вправе не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Доп. информация по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by**

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже недвижимого имущества, принадлежащего РУП «Жилкоммунтехника» (Продавец) на праве хозяйственного ведения

**Лот № 1** – нежилое помещение с инв. № 330/D-182, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Интернациональная, д. 109. Начальная цена с НДС – 33 120,00 бел. руб. Задаток – 1 656,00 бел. руб.

**Лот № 2** – здание нежилое с инв. №710/С-10624, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Чонгарская, д. 54. Начальная цена с НДС – 137 664,00 бел. руб. Задаток – 6883,20 бел. руб.

Земельный участок площадью 0,0997 га с кадастровым номером 741000000006000013.

**Лот № 3** – доля 67/500 РУП «Жилкоммунтехника» в административном здании с инв. №700/С-4639, расположенном по адресу: г. Могилев, ул. Лазаренко, д. 29. Ограничения (обременения), устанавливаемые в отношении недвижимого имущества, в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Начальная цена с НДС – 70 848,00 бел. руб. Задаток – 3 542,40 бел. руб.

Земельный участок площадью 0,0447 га с кадастровым номером 740100000003000458. Право аренды земельного участка. Срок действия по 04.09.2021. Доля РУП «Жилкоммунтехника» – 67/500.

**Лот № 4** – гостиница с инв. №714/D-11556, расположенная по адресу: Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. 60 лет Октября, д. 15. Начальная цена с НДС – 84 456,00 бел. руб. Задаток – 4222,80 бел. руб.

Земельный участок площадью 0,1076 га с кадастровым номером 724850100001000516 Доля РУП «Жилкоммунтехника» составляет 11/200.

**Лот № 5** – комплекс из здания и строений, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Чапаева, 4: 1. Здание склада (литер А 2/к) с инв. № 500/С-8445. 2. Здание проходной (литер Б 1/к) с инв. № 500/С-8494. 3. Здание специализированное автомобильного транспорта (литер Ж 1/к) с инв. № 500/С-36553. 4. Гараж (литер В 1/м) с инв. № 500/С-23647. 5. Гараж (литер Д 1/м) с инв. № 500/С-23648. 6. Гараж (литер Г 1/м) с инвентарным номером 500/С-23649. На капитальные строения с инв. № 500/С-8494; 500/С-36553; 500/С-23647; 500/С-23648; 500/С-23649 имеются свидетельства о регистрации. Начальная цена с НДС – 1 577 088,00 бел. руб. Задаток – 78 854,40 бел. руб.

Аренда. Часть здания склада (литер А 2/к) с инв. № 500/С-8445 сдается по договору аренды: - 152,5 кв.м до 22.07.2019; - 16,8 кв.м до 03.05.2020; - 34,3 кв.м до 14.10.2016. Гараж (литер В 1/м) с инв. № 500/С-23647 сдается по договору аренды: 74,2 кв.м до 03.05.2020.

Земельный участок площадью 0,4575 га с кадастровым номером 500000000001000440. Право временного пользования. Срок действия по 31.05.2021.

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника» (Лот №__),* **проводимом 24 октября 2016 г.** Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов согласно действующему законодательству.

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу расходы на публикацию объявления на сайте bankrot.gov.by в сумме не более 120,00 (Сто двадцать белорусских рублей 00 копеек) в денежных знаках образца 2009 г.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» и Положения об организации и проведении аукционов.

Аукцион состоится **24.10.2016 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 20.10.2016 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 6. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.05.2016. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by**.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов аукциона: Ковальская Наталья Николаевна, 8 (029) 395-36-35.

**☎ Организатор аукциона: 8(017) 306-00-57, 8(029) 356-90-03, 8(029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»

| № лота | Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, BYN | Сумма задатка, BYN | Общая площадь, м² | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ЛОТ №1 | Капитальное строение (инв. № 100/С-33699), производственное здание, помещение на третьем этаже. Объект расположен по адресу: г. Брест, ул. Красногвардейская, 104 | 59,16 | 5,92 | 17,40 | 2,5 | Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств) |
| ЛОТ №2 | Капитальное строение (инв. № 100/С-45930), городское отделение связи, помещение на втором этаже. Объект расположен по адресу: г. Брест, ул. Орловская, 24 | 23,12 | 2,31 | 6,80 | 3,0 | |

| | |
|---|---|
| **Срок договора аренды** | Не менее 3 лет |
| **Условия** | 1. С победителем аукционных торгов в течение 10 рабочих дней будет заключен договор аренды помещения.<br>2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка.<br>3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал р/с 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк» РД №100 по Брестской области, код 369, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 04 ноября 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325.**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81.

Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. №624, от 23.09.2011 г. №431, от 10.01.2013 г. №14) составляет 10 базовых величин.

**Последний день приема заявлений – 3 ноября 2016 г. до 16.00.**

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего унитарному предприятию «Забудова-Автотранс»

| Лот | Описание | Местоположение | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Склад нефтепродуктов с инв. № 630/С-62355. Площадь застройки – 2 851 кв.м. Дата ввода в эксп. – 1994. | Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть, ул. Заводская, 1 | 362 124,00 | 3 621,24 | 18 106,20 |

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

Аренда. Сдается по договору аренды емкость (резервуар) РГС-100, входящий в состав склада нефтепродуктов с инв. № 630/С-62355

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,2623 га с кадастровым номером 623886007601000532. Целевое назначение – для содержания и обслуживания склада нефтепродуктов. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

| Лот | Описание | Местоположение | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 2 | 1. Здание автозаправочной станции на 120 заправок с инв. № 630/С-54920. Площадь – 56,2 кв.м. Г.п. – 1994. Этажей – 1; 2. Емкости 100 м³ с инв. № 357, 358, 359, 360 – 4 ед.; 3. Емкости 10 м³ с инв. № 364, 363, 362, 361 – 4 ед.; 4. Колонка топливораздаточная с инв. № 420; 5. Колонки топливораздаточные ТРК ADAST 8991.623 с инв. № 352, 353, 351 – 3 ед.; 6. Витрина с инв. № 423; 7. Световая информационная стела с инв. № 415 | Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, 8 вблизи д. Плебань | 369 746,75 | 3 697,47 | 18 487,34 |

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

Ипотека. Здание автозаправочной станции на 120 заправок с инв. № 630/С-54920 находится в ипотеке. Вопрос разрешения на продажу с публичных торгов согласован с залогодержателем

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 1,1565 га с кадастровым номером 623881700098000009. Целевое назначение – для содержания и обслуживания автозаправочной станции. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота (Лотов) в течение 14 (четырнадцати) дней с назначенной даты проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Лота (Лотов) производится в течение 30 (тридцати) дней с назначенной даты проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору вознаграждение в размере 2% (Двух процентов) от цены продажи Лота №1 и (или) Лота №2 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу расходы на публикацию объявления на сайте bankrot.gov.by.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 18.11.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества унитарного предприятия «Забудова-Автотранс» (Лот № ____), проводимом 18 ноября 2016 г. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – **16.11.2016 в 12.00.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов: Ланько Илья Сергеевич, 8 (033) 340-18-16, 8 (0176) 72-46-45.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

■ Абмен вопытам

# АДЗІН З НАЙЛЕПШЫХ ГАРАДОЎ — МІНСК

**Пасол Эквадора лічыць наша горадабудаўніцтва ўзорным**

**Вельмі важна, каб горад або вёска, дзе ты жывеш, былі ўтульнымі, зручнымі для штодзённага жыцця. Як правіла, пытанні горадабудаўніцтва вельмі актуальныя для жыхароў мегаполісаў — нездарма ж план развіцця сталіцы вынесуцца на грамадскае абмеркаванне. Але і ў невялікіх населеных пунктах гэтаму ўдзяляецца ўвага. Так ці інакш, крытыкі заўсёды шмат. Але ёсць, чым і пахваліцца.**

## З'едзецца ўвесь свет

У гэтым месяцы ў Кіта, сталіцы Эквадора, пройдзе Канферэнцыя Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па жыллі і ўстойлівым гарадскім развіцці «Хабітад III». З гэтай нагоды **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Эквадора ў Беларусі Карлас Ларэа ДАВІЛА** сустрэўся з беларускімі журналістамі.

Ён паведаміў, што 10 верасня быў прадстаўлены тэкст новай павесткі дня гарадскога развіцця, які павінен быць прыняты падчас канферэнцыі.

— Павестка мае асаблівыя характарыстыкі, адрозныя ад тых, якія былі прыняты на канферэнцыях «Хабітад I» і «Хабітад II», — адзначыў пасол.

Калі коратка расказаць пра асноўныя прынцыпы, якія знайшлі адлюстраванне ў гэтым дакуменце, то адзін з першых прысвечаны выкараненню беднасці ва ўсіх яе праявах, у тым ліку крайняй галечы. Другі прынцып новай павесткі дня — гэта ўстойлівая гарадская эканоміка, заснаваная на высокай прадукцыйнасці, канкурэнтаздольнасці і інавацыях. Трэці прынцып — забеспячэнне экалагічнай бяспекі.

## 2,8 кіламетра над узроўнем мора

Карлас Ларэа Давіла, расказваючы пра сталіцу Эквадора, адзначыў, што горад мае шмат спецыфічных рысаў.

— Кіта размешчаны на вышыні дзве тысячы восемсот метраў над узроўнем мора, — звярнуў увагу ён. — Адпаведна, горад мае свае адмысловыя характарыстыкі. Кіта доўгі час развіваўся, разрастаўся перш за ўсё ў даўжыню, займаючы падножжа гары. Адсюль узніклі праблемы з незаконным захопам і выкарыстаннем зямлі, з гарадскім тэрытарыяльным дзяленнем, з упарадкаваннем, з арганізацыяй руху гарадскога транспарту. Так, адна з галоўных задач, якая стаіць перад горадам сёння, — заканчэнне будаўніцтва метро ў горадзе Кіта. У свой час у нас таксама праводзілася вялікая работа па гарадскім устойлівым развіцці. Быў прыняты шэраг нарматыўных актаў, над якімі працаваў і цэнтральны ўрад, і мясцовыя органы ўлады. Гэтыя законы робяць вельмі вялікі ўнёсак у развіццё горада, адкрываюць новыя магчымасці для яго жыхароў.

## Экспарт тэхналогій

Плануецца, што ўдзел у канферэнцыі ў Кіта прымуць прадстаўнікі больш чым 190 краін. Нашу дэлегацыю ўзначаліць Дзмітрый Семянкевіч, намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва.

Кажучы пра ўражанні ад наведвання беларускіх гарадоў і вёсак, пасол Эквадора не хавае свайго захаплення.

— Беларускі падыход да планавання гарадоў, да іх арганізацыі можа стаць вялікім унёскам у работу канферэнцыі ААН, — упэўнены ён. — Мяне ўражвае, як размеркаваны вёскі па тэрыторыі краіны, як будуюцца аграгарадкі. Думаю, што гэта цудоўны прыклад, які павінен быць прааналізаваны падчас пасяджэння канферэнцыі «Хабітад III». Мінск — адзін з найлепшых гарадоў, якія я бачыў, з пункту гледжання ўрбаністычнай арганізацыі. Тут вельмі важны таксама экалагічны аспект, напрыклад, якасць паветра — яна ў вас вельмі высокая. Вельмі добра, згодна з нормамі, выкарыстоўваецца зямля. Лічу, што Беларусь, яе дэлегацыя падчас працы канферэнцыі можа зрабіць значны ўнёсак у работу канферэнцыі.

Карлас Ларэа Давіла таксама нагадаў, што ў красавіку бягучага года ў Эквадоры адбылася землетрасенне.

— Беларусь у маі накіравала нам вялікую, шчодрую гуманітарную дапамогу, — паведаміў ён. — Цяпер гаворка ідзе аб магчымым удзеле Беларусі ў аднаўленні разбураных падчас землетрасення раёнаў. Нам бы хацелася, каб у нас таксама ўлічваліся крытэрыі і прынцыпы, па якіх будуюцца беларускія дамы. Магчымасці, варыянты, праекты аднаўлення зон, што пацярпелі ад землетрасення, абмяркоўваліся з некалькімі беларускімі прадпрыемствамі, і мы ўскладаем на выніку перамоў вялікія спадзяванні.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Дыялог бізнесаў

# ВЕНГЕРСКІЯ КАРОВЫ, БЕЛАРУСКІЯ ТРАКТАРЫ

**У Мінску адбыліся беларуска-венгерскі бізнес-форум і перамовы паміж дзелавымі коламі дзвюх краін**

**Паводле слоў першага намесніка старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Аляксандра НАХАЕНКІ, Беларусь мае намер пашырыць супрацоўніцтва з Венгрыяй у сферы сельскай гаспадаркі.**

«Мы плануем па выніках бізнес-форуму падпісаць адпаведныя кантракты. Тым больш што ўзаемадзейнічаем не першы год, закупляем у Венгрыі насенне, чыстапародную буйную рагатую жывёлу», — расказаў ён.

**Намеснік міністра замежных спраў і знешняга гандлю Венгрыі Ласла САБА**, які прыняў удзел у форуме, адзначыў, што для венгерскіх прадстаўнікоў супрацоўніцтва з Беларуссю з'яўляецца вельмі важным. На яго думку, наша краіна сёння выступае мостам, які звязвае Усход і Захад. Акрамя таго, ён лічыць, што Беларусь і Венгрыя як ніколі раней актыўна ўзаемадзейнічаюць на палітычным і эканамічным узроўнях. Гэта спрыяе з'яўленню многіх перспектыўных абласцей, у якіх венгерскія прадпрыемствы зацікаўлены супрацоўнічаць з беларускімі. Да іх адносяцца турызм, энергетыка, ахова здароўя, фармацэўтыка. Падчас бізнес-форуму таксама прайшлі перамовы паміж прадстаўнікамі кампаній аб магчымасцях супрацоўніцтва і рэалізацыі сумесных праектаў у сферах будаўніцтва, прамысловасці, фінансавання, распрацоўкі праграмнага забеспячэння, сельскай гаспадаркі і жывёлагадоўлі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

# Заробак камбайнераў палічылі кантралёры

**І выявілі, што ён павінен быць куды большым**

**Работнік ААТ «УваравічыЭліт», што ў Буда-Кашалёўскім раёне, у верасні звярнуўся ў Камітэт дзяржкантролю Гомельскай вобласці. Ён расказаў, што камбайнерам была заніжана заработная плата пры ўборцы азімага жыта.**

Падчас разгляду яго звароту было выяўлена, што аграном і начальнік вытворчага ўчастка аддзялення «Буда-Люшава» названага прадпрыемства ў дарожных лістах механізатараў прыніжалі фактычна ўбраныя плошчы азімага жыта. Гэта і прывяло да прыніжэння расцэнак пры налічэнні заработнай платы. Пасля ўмяшання кантралёраў двум камбайнерам і іх памочнікам заработная плата была пераразлічана. Увогуле людзям дадаткова далічылі больш за 230 рублёў. Ну, а службовыя асобы, якія афармлялі дакументы, прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці.

Між тым маніторынг выплаты заробку супрацоўнікам сельскай гаспадаркі ідзе пастаянна. Сёлета на адрас абласнога дзяржкантролю паступіла 93 звароты па фактах такіх парушэнняў. Па выніках праверак штрафы прызначаны 15 службовым і 12 юрыдычным асобам.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

# РАЗАМ БУДУЕМ, ВУЧЫМ І ЛЕЧЫМ...

**А кітайскую мову ведаюць усё больш беларускіх дзяцей**

**На Віцебшчыне ажыццяўляецца плённае супрацоўніцтва з кітайскімі партнёрамі. І многае не мае аналагаў у краіне.**



Фота БЕЛТА.

Ідзе будаўніцтва Віцебскай ГЭС.

## І будуюць, і фінансуюць

У прыватнасці, менавіта на радзіме Шагала кітайская фірма стала генпадрадчыкам на будаўніцтве першага жылога дома сацыяльнага прызначэння, які ўзводзіцца сумесна з беларусамі. Кітайскі бок бязвыплатна ажыццяўляе фінансаванне. Беларусы выступаюць у ролі субпадрадчыкаў. Плюс выкарыстоўваюцца будаўнічыя матэрыялы айчыннай вытворчасці. І праект — ад віцебскіх распрацоўшчыкаў.

Як растлумачыў **Уладзімір БЕЛАВУС, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама**, адпаведны праект з аказаннем кітайскай тэхніка-эканамічнай дапамогі будзе рэалізаваны не толькі ў Прыдзвінскім краі. Усяго па краіне міждзяржаўным пагадненнем на будаўніцтва жылля запланавана выдаткаваць каля 110 мільёнаў долараў. А на Віцебшчыне першымі прыступяць да рэалізацыі, безумоўна, вельмі выгаднага праекта. Менавіта новабудоўля ў так званым спальным мікараёне Віцебска («Білева—3») стане «першай ластаўкай».

У ганаровай цырымоніі закладкі першай будаўнічай канструкцыі 120-кватэрнага дома ўзяў удзел Цуй Цымін, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР. Ён і віцэ-губернатар распісаліся на фундаментным блоку. Журналістам паведамілі, што навасёлле жыльцы могуць справіць ужо зімой наступнага года.

Аналагічным чынам у Оршы пабудуюць 108-кватэрны дом. Здача «пад ключ» запланавана на вясну. Сумесна з кітайцамі жыллё будзе пабудавана ў Полацку, Наваполацку і Лепелі.

## «Зялёнай» энергіі хопіць на раён!

У 2013 годзе на Заходняй Дзвіне Кітайская інжынерная кампанія па электраэнергіі пачала будаўніцтва самай вялікай гідраэлектрастанцыі ў Беларусі. У 2017 годзе плануецца запуск усіх чатырох турбін. Штогод на ГЭС будуць выпрацоўваць каля 138 мільёнаў кілават электраэнергіі. Гэтага, як кажуць спецыялісты, з лішкам хопіць, каб забяспечыць патрэбы спажыўцоў Віцебскага раёна, дзе і «скараюць» раку.

Дарэчы, адна з галоўных водных артэрый краіны на гэтым участку застанецца суднаходнай. У Віцебскім райвыканкаме адзначаюць, што гэта дазволіць прыцягнуць аматараў воднага турызму. Магчымасць прайсці знакамітым водным шляхам «з варагаў у грэкі» вабіць усё больш беларусаў і іншаземцаў. Такім чынам, можна будзе выкарыстаць гідраэлектрастанцыю і для арганізацыі адпачынку. На берагах ракі і штучных вадаёмаў будуць адкрытыя гатэлі і кемпінгі. У выніку на ГЭС і вакол з'явяцца дзясяткі новых працоўных месцаў.

Фінансаванне будаўніцтва ажыццяўляецца Дзяржаўным банкам развіцця Кітая на вельмі выгадных крэдытных умовах. Беларускія будаўнікі дапамагаюць кітайскім калегам.

Цікава, што яшчэ 60 гадоў таму быў распрацаваны праект узвядзення ГЭС і стварэння штучнага «Віцебскага мора». Але для гэтага прыйшлося б затапіць аж цэлы гарадскі пасёлак Сураж (былы райцэнтр) і часткова расійскі Веліж. Магчыма, гэты фактар і тармазіў прыняцце канчатковага рашэння. Пры цяперашнім будаўніцтве аказаліся затопленыя мінімум забудоў — дачы.

## Мы — ім, яны — нам

Адказныя асобы аблвыканкама канстатуюць: знешнегандлёвы абарот прадпрыемстваў вобласці з Кітайскай Народнай Рэспублікай павялічваецца. Напрыклад, у параўнанні з 2005 годам гэты паказчык вырас больш, чым у 3 разы! Што прыемна падкрэсліць, пры росце экспарту тавараў у 1,7 раза.

У Кітай у розныя гады пастаўляліся змазачныя матэрыялы, растваральнікі, жгут і валокны акрылавыя, хімічныя злучэнні, шклотканіны, льновалакно. Там высока цэняць якасць аптычных прыбораў і вымяральнай апаратуры з Віцебшчыны, схем інтэгральных, рэгулятараў напружання. Недзяржаўныя прадпрыемствы наладзілі збыт скуры, драўляных вырабаў.

Імпарт з Кітая таксама разнапланавы. У асартыменце: дэталі абутку, гербіцыды, лямпы і трубкі электронныя, аўчыны, лекі.

Цеснае супрацоўніцтва вядзецца і паміж навукоўцамі, ВНУ. Напрыклад, кітайцаў вельмі цікавяць нашы карысныя расліны, якія ў іх не растуць. Разам з Віцебскім дзяржаўным ордэна Дружбы народаў універсітэтам яны ствараюць унікальныя прэпараты.

Падтрымліваюцца цесныя кантакты паміж Віцебскім дзяржуніверсітэтам імя П.М. Машэрава і ўстановамі адукацыі правінцыі Цэнтральная Манголія. Неаднаразова прыязджалі спецыялісты з правінцыі КНР у Віцебскую акадэмію ветэрынарнай медыцыны. Полацкім дзяржуніверсітэтам падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве з універсітэтам у горадзе Чанчунь.

У сярэдняй школе № 44 Віцебска больш за 5 гадоў праводзіцца навучанне кітайскай мове як нясобітамі. У перспектыве гэта паспрыяе наладжванню яшчэ больш плённых адносін. Галоўнае, што ўжо не першы год ёсць шчырае ўзаемаразуменне. Практыка паказвае, што супрацоўніцтва ўзаемавыгаднае, як паміж рэгіёнамі, так і краінамі ў цэлым.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

Рыштаванні Бацькаўшчыны

# СТАРАЖЫТНЫ МУР РАСЦЕ...

## НА ЛЮБЧАНСКІМ ЗАМКУ БУДУЦЬ УЗВЕДЗЕНЫ ПАЎДНЁВАЯ І УСХОДНЯЯ ВЕЖЫ

**Восень — час падвядзення вынікаў. І шчаслівы той, хто прыходзіць да гэтай пары з рахункам зробленых карысных спраў. Гэта акурат можна сказаць пра Дабрачынны фонд «Любчанскі замак» — летам там пашчыравалі ад душы. Дзякуючы праведзеным работам у бліжэйшы час на замку, згодна з прынятай канцэпцыяй яго адраджэння, будуць адноўлены... яшчэ дзве страчаныя вежы.**

У мінулым годзе падчас археалагічных даследаванняў удалося адшукаць рэшткі Паўночнай вежы (Дазорцы). Падмуркі знаходзіліся вельмі глыбока — на 3,5 метра ніжэй за ўзровень замчышча. Вывучалі таксама падмуркі паўднёва-заходняй сцяны — як высветлілася, яны разбіраліся, а будаўнічы матэрыял з іх выкарыстоўваўся для ўзвядзення палаца ў 1860-х гадах. Усё гэта дало падставы для прыняцця рашэння аб аднаўленні страчаных аб'ектаў.

### СЛЯДЫ КУНСТКАМЕРЫ

Сёлета археалагічныя работы былі скіраваны на даследаванне муроў флігеля і палаца (якія захаваліся да нашага часу). Таксама шукалі, дзе знаходзілася скарбніца князёў Радзівілаў: згодна з інвентарамі, яна была ўзведзена на падмуроўцы — на глыбіні каля паўметра. Частка экспанатаў скарбніцы ў свой час стала асновай унікальнага музея — Любчанскай кунсткамеры. У ёй захоўваўся збор карцін і скульптуры вядомых майстроў, археалагічныя калекцыі, зброя. Аднак і па сёння, на жаль, ні слядоў калекцый, ні самой скарбніцы адшукаць не ўдалося...

Затое знайшлі рэшткі плацін: калісьці замак з трох бакоў атачаўся равамі з вадой, а каля Нёмана яе ўтрымлівалі драўляныя перагародкі, якія і былі знойдзены.

Археолагі спрабавалі таксама адшукаць падмуркі драўлянай Усходняй вежы, аднак так і не натрапілі на іх. Падмуркаў або не мелася зусім, або яны былі невялікімі і іх разабралі, калі будавалі палац. Аднак Усходнюю вежу ўсё адно плануецца ўзвесці — згодна з тым, як яна адлюстравана на гравюры Нарновіча-Наронскага, што захоўваецца ў Варшаве.

**Дырэктар дабрачыннага фонду «Любчанскі замак» Іван ПЯЧЫНСКІ** кажа, што, каб правесці археалагічныя раскопкі, давялося сутыкнуцца з пэўнымі цяжкасцямі:

— Першапачаткова кошт раскопак, згодна з атрыманымі каштарысамі, вагаўся ад 30 800 да 106 600 рублёў. Аднак такая сума для дабрачыннага фонду, натуральна, была недасяжнай. Таму мне давялося звярнуцца па дапамогу і напісаць ліст у Адміністрацыю Прэзідэнта. Там да сітуацыі паставіліся з разуменнем і дзякуючы кіраўніцтву Акадэміі навук і Інстытута гісторыі было знойдзена рашэнне, якое задаволіла ўсіх. Раскопкі прайшлі паспяхова і, самае галоўнае, своечасова, калі на замку было шмат валанцёраў.


Рэстаўраваныя калоны на ўездзе ў Любчанскі замак.


Дырэктар фонду Іван Пячынскі (справа) і археолаг Андрэй Мяцельскі з валанцёрамі падчас раскопак.

### ПРАКЛАДВАЮЧЫ МАСТЫ І ПЛАЦІНЫ

Сёлета спецыялісты Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта дапамогуць у правядзенні інжынерных даследаванняў — будуць вывучаны фундаменты збудаванняў і зроблены заключэнні па іх стане. Атрыманыя матэрыялы плануецца выкарыстаць для аднаўлення вежаў, палаца і флігеля. Стане зразумела, ці патрэбны дадатковыя ўмацаванні падмуркаў.

— Мы спадзяёмся што архітэктурны праект на ўвесь комплекс будзе гатовы і вынесены на разгляд савета пры Міністэрстве культуры ў кастрычніку гэтага года, — адзначае Іван Пячынскі. — Калі архітэктурны праект прыме (зацвердзіць) савет, будзе распрацаваны яшчэ і будаўнічы праект, які разгледзіць пазаведамасная экспертыза.

Пасля атрымання дакументацыі рабочага праекта першапачаткова плануецца аднаўляць тыя збудаванні, якія існавалі ў XVII стагоддзі: Паўночную вежу, затым Усходнюю — гэта архітэктурныя дамінанты канца XVI — XVII стагоддзя. Будуць аднаўляцца масты, якія ішлі да замка, плаціны. Плануецца паглыбіць равы, якія і сёння атачаюць старажытны мур.

### ДЗЕЛЯ ДАЎГАВЕЧНАСЦІ

Для аднаўлення збудаванняў будуць выкарыстаныя доўгатэрміновыя матэрыялы — камяні, цэгла. Сёлета падчас некалькіх валанцёрскіх летнікаў была зроблена вельмі важная работа — са старых, непатрэбных будынкаў нарыхтавана 31,5 тысячы цаглін. Калі ўлічыць, што адна цагліна каштуе 4,1 рубля, а важыць 3,9 кг, то робіцца відавочным, што фонду ўдалося істотна сэканоміць. Калі б набываць такую ж колькасць цэглы, давялося б замовіць 6 фур па 20 тон, на кошт амаль 130 000 рублёў. А дастаўка каштавала б не менш за 3400 рублёў. Таму тую работу, што зрабілі валанцёры толькі нарыхтоўваючы цэглу, можна ацаніць у 133 400 рублёў.

Для вонкавых работ будзе выкарыстана цэгла, што і па форме, і па колеры адпавядае гістарычнай. Магчыма, яе змогуць вырабіць на Мінскім заводзе будаўнічых матэрыялаў (ужо вядуцца адпаведныя перамовы).

Шмат іншага матэрыялу — драўніны — патрэбна на заканчэнне Брамнай вежы. Яна неабходна, каб правесці ўнутраныя работы, у тым ліку наслаць падлогі. Таму Іван Пячынскі звярнуўся да міністра лясной гаспадаркі Міхаіла Амельяновіча (ён нарадзіўся недалёка ад Любчы, у Клюкавічах). Як высветлілася, міністр пра замак ведаў і раней, нават бываў у ім. Таму праектам аднаўлення вельмі зацікавіўся і пагадзіўся падтрымаць яго будаўнічымі матэрыяламі. Такая шчодрая дапамога аказалася вельмі своечасовай.

Варта дадаць, што не толькі Міхаіл Амельяновіч стаў добрым сябрам Любчанскага замка — ужо шмат гадоў аднаўленне вельмі істотна фінансава падтрымлівае Прыорбанк.

### УЛАСНЫМІ РУКАМІ...

Натуральна, Любчанскі замак складана ўявіць без валанцёрскіх летнікаў. Многае робіцца тут менавіта рукамі студэнтаў-добраахвотнікаў. Не стаў выключэннем і гэты год. Сёлета правялі чатыры летнікі — студэнтаў БНТУ, БДТУ, БДУ. Таксама прыязджалі папрацаваць тыя, хто ўжо раней бываў на замку. На некаторыя выхадныя адначасова збіралася да 70—100 чалавек!

Важнай справай, аднаўленнем уязных калон, займаўся студэнт 5-га курса БДТУ Сяргей Сахончык. У яго камандзе працавалі іншыя навучэнцы гэтай установы, у тым ліку Ягор Дабравольскі. Хлопцы расказалі, што ім прыемна ўсведамляць сваю карысць — рабіць справу, якая застанецца для нашчадкаў... Атрыманы досвед аднаўленчых работ дазволіў ім па-новаму зірнуць на сябе і на тое, што можна зрабіць уласнымі рукамі...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*
*Навагрудскі раён*

Пантэон Айчыны

*Падавайце же потомкам, что маете з предков.*
**Андрэй РЫМША.**

# УСЯСЛАЎ БРАЧЫСЛАВІЧ

## (? — 1101)

Сучаснікі ў жаданні хоць неяк растлумачыць незвычайны лёс гэтага чалавека, таямнічасць і легендарнасць яго асобы, ягоную бурлівую дзейнасць, бліскучыя перамогі далучылі Усяслава да чарадзеяў і ваўчуноў. Нават лічылася, што нарадзіўся ён ад чараў — «волхвования». Верылі, што князь можа абярнуцца ў ваўка, тура, сокала, як герой быліннага эпасу волат Вольга. Ды і пра яго самога складалі быліны. Невядомы аўтар геніяльнага «Слова пра паход Ігаравы» натхнёна апеў полацкага князя:

*Усяслаў-князь людзям чыніў суды.*
*Радзіў князям гарады,*
*А сам уночы ваўком рыскаў,*
*З Кіева паспяваў да пеўняў*
*Да Тмутараканя,*
*Хорсу ў Полацку пазвоняць*
*Ютрань рана*
*У званы святое Сафіі.*
*А ён той звон чуе ў Кіеве.*
*Хоць і вешчую меў душу*
*ў дзёрзкім целе,*
*Ды часта ад бедаў цярпеў ён.*

(Пераклад Рыгора Барадуліна.)



Ад перамогі да паражэння, ад міру да вайны — вось так усё жыццё. Каб захавалася летапіснае жыццё Усяслава, можна ўявіць, якое захапляльнае гэта было б чытанне. Але якія выпрабаванні ні выпадалі б, ён усё роўна быў верным сваёй Бацькаўшчыне. За яе веліч і свабоду жыў і змагаўся Усяслаў. Стаўшы маладым на чале Полацкай зямлі, цаглінка за цаглінкай будаваў ён сваю дзяржаву. І як сімвал яе паставіў у Полацку Сафійскі сабор — заявіў пра роўнасць з Ноўгарадам і Кіевам.

А калі Усяслаў пасталеў, дык адчуў сваю сілу, падняў меч вайны. Вырашыў ажыццявіць бацькоўскую мару — далучыць Наўгародскую зямлю да Полацка. У 1067 годзе полацкая дружына на чале з Усяславам узяла Ноўгарад. У знак падначалення Ноўгарада зняў ён з Сафійскага сабора званы і перавёз іх у Полацк. У адказ усе паўднёварускія князі рушылі на Полацкую зямлю і расправіліся з Менскам: мужчын забілі, жанчын і дзяцей захапілі ў палон, а горад спалілі. Усяслаў спазніўся на дапамогу і сустрэў ворага на рацэ Нямізе, непадалёку ад Менска. 3 сакавіка 1067 года адбылася адна з найбуйнейшых бітваў тых гадоў. Аўтар «Слова» напіша:

*На Нямізе галовы сцелюць снапамі,*
*Малоцяць цапамі,*
*жыццё кладуць на таку злюцела,*
*веюць душу ад цела.*
*Нямігі, крывавыя берагі*
*не збожжам былі засеяны зноў —*
*засеяны косцьмі рускіх сыноў.*

Кіеўскі летапіс прыпісаў перамогу сынам Яраслава — паўднёварускім князям. Але, дзіўная рэч, «пераможцы» пасля бітвы паспешліва адступілі з Полацкай зямлі. Поле бою засталося за Усяславам, а па традыцыі лічылася: хто застаўся «стаяць на касцях» — той і пераможца. Усяслаў засланіў сваю Бацькаўшчыну ад варожай навалы, выратаваў гарады і сёлы ад агню і мяча. Зразумеўшы, што Усяслава зброяй не пераможаш, Яраславічы скарысталі аблудлівасць і хлусню. Яны паклікалі Усяслава на перамовы і, парушыўшы крыжовае цалаванне, паланілі яго разам з двума сынамі. Усяслава прывезлі ў Кіеў і кінулі яго ў няволю. Амаль год прасядзеў Усяслаў у порубе. У гэты час на Русь напалі полаўцы. Яраславічы былі разбіты. Супраць кіеўскага князя Ізяслава ўспыхнула паўстанне. Напалоханы Ізяслаў уцёк з Кіева. Усяслава пад вітальныя крыкі кіяне вызвалілі з няволі і абвясцілі вялікім князем кіеўскім. Вось такі лёс.

Сем месяцаў кіраваў Усяслаў Руссю. І ў звоне кіеўскай Сафіі чуў звон сваёй — полацкай. Не прамяняў ён Бацькаўшчыну на высокі пасад рускага ўладара. І пры першай жа магчымасці вярнуўся ў Полацк. І пачаліся гады барацьбы. Ізяслаў з польскім войскам выгнаў Усяслава з Полацка. Чаго толькі не здарылася за гэтыя гады з Усяславам. І быў разбіты наўгародцамі, і трапіў да іх у палон, і вызваліўся, і зноў узняў меч, каб вызваліць Бацькаўшчыну ад варожага панавання, і, нарэшце, у 1071 годзе пераможцам уехаў у сталіцу сваёй дзяржавы. Але не магла змірыцца Русь са свабодай Полацкай зямлі. Новыя рацi ішлі на Крывію. Кіеўскі князь Усевалад у 1077 годзе паспрабаваў захапіць Полацк. Усяслаў адбіў наступ ворага. Наступным годам усе вайсковыя сілы Русі, наўгародская, кіеўская, чарнігаўская, смаленская дружыны і палавецкая арда падышлі да Полацка. Усяслаў і гэтым разам абараніў сваю сталіцу. У гневе заваёўнікі разрабавалі полацкія прадмесці і знішчылі горад Одрск. Помсцячы за спусташэнне сваёй зямлі, Усяслаў захапіў Смаленск. Чарнігаўскі князь Уладзімір Манамах за гэта «пожег землю, довоевав до Лукомля і до Логожска, та на Друтск воюя». У 1084 годзе ён нападзе на адноўлены Менск і спаліць яго. Але скарыць Усяслава, заваяваць Полацкую зямлю Русь не змагла. І калі на Любецкім з'ездзе ў 1097 годзе сабраліся рускія князі, каб падзяліць паміж сабой Русь, Усяслаў, як уладар незалежнай дзяржавы, праігнараваў гэтую дзяльбу.

Апошнія гады жыцця Усяслаў пражыў у міры. Суседзі асцерагаліся нападаць на полацкія землі, каб не выклікаць яго помсты. На гэтыя гады прыпадае росквіт магутнасці Полацкага княства, яго ўлада распаўсюджваецца на Ніжняе Падзвінне аж да Балтыйскага мора — на Земгалію, Лівонію, Летонію, Літву.

Цікавыя звесткі пра Усяслава былі ў архіве Менскай епархіі, якія пададзены ў кнізе «Воспоминания о древнем православии Западной Руси» (1867 г.). Паводле іх, Усяслаў пабудаваў цвержу пры ўпадзенні ракі Нямігі ў Свіслач, на тым месцы, дзе калісьці адбылася славутая бітва. Адсюль і пачаў расці новы горад, які назвалі па імені спаленага на рацэ Менцы Менска. Такім чынам, Усяслава можна лічыць заснавальнікам Менска — сталіцы сённяшняй Рэспублікі Беларусь. Ён жа заснаваў у горадзе Узнясенскі манастыр.

У 1101 годзе Усяслаў памёр. Летапісец дакладна адзначыў і дзень (14 красавіка), і час (9 гадзін), калі вялікі сын Полачыны адышоў у бессмяроцце.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

■ Сувязі

# БОЙЦЕСЯ ЗГУБІЦЬ СЯБРОЎ!..

## У пісьменнікаў Беларусі і Дагестана склаліся добрыя таварыскія стасункі

**Нядаўна пабачыла свет кніга вершаў старшыні пісьменніцкага аб'яднання М. Ахмадава ў перакладзе Міхася Пазнякова на беларускую мову. Трывалы мост літаратурнага пабрацімства выбудоўвае з Дагестанам Выдавецкі дом «Звязда». Не аднойчы пісьменнікі гэтага рэгіёна Расіі друкаваліся ў беларускіх літаратурна-мастацкіх выданнях: часопісах «Нёман», «Полымя», газеце «Літаратура і мастацтва». Вядомы арганізатар выдавецкага, літаратурнага працэсу ў Дагестане Марат Гаджыеў аказаў вялікае садзейнічанне ў падрыхтоўцы кнігі «Францыск Скарына на мовах народаў свету»: менавіта ён пазнаёміў з тэкстам беларускага першадрукара сваіх калег, якія і пераклалі верш на аварскую, даргінскую, кумыкскую і іншыя мовы. Не выпадковым падаецца ўдзел беларускага боку і ў традыцыйным кніжным кірмашы ў Махачкале «Таркі-Тау». У гэтым годзе Беларусь на галоўным кніжным свяце ў Дагестане прадстаўляў намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» — галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Аляксей ЧАРОТА. Яму мы і задалі некалькі пытанняў.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Аляксей Іванавіч, кніжная выстаўка ў Махачкале праводзіцца не першы раз. Наколькі прадстаўнічай яна была ў гэтым годзе?***

— Мне складана параўноўваць маштаб «Таркі-Тау — 2016» з папярэднімі выстаўкамі, паколькі я прымаў удзел у ёй упершыню. Але, трэба заўважыць, мерапрыемства, якое задумвалася і пачыналася раней як рэспубліканскае, якое павінна прадстаўляць рэгіянальную кніжную прадукцыю, сёлета далёка сягнула за межы Дагестана. У кірмашы прымалі ўдзел больш за восемдзесят выдавецтваў з розных рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі і нават замежжа. Поруч з дагестанскімі выдавецтвамі «Дагкнигоиздат», «Дагестан», «МавраевЪ», «Эпоха», «Лотос», «Абусупьян», «Наука — Дагестан» свае кнігі прадставілі і іншыя рэгіёны. Асацыяцыя кнігавыдаўцоў Расіі (АСКВ) арганізавала калектыўны стэнд, які прадставіў прадукцыю маскоўскіх выдавецтваў «Вече», «Наука», «Молодая гвардия», «Белый город», «Дарь», «Пешком в историю», а таксама выдавецтва «Медиарост» з Рыбінска, Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Інгушэція. На асобных стэндах была прадстаўлена прадукцыя выдавецтваў «Умная бумага» (Санкт-Пецярбург), Кніжнага выдавецтва Чачэнскай Рэспублікі (Грозны), «Издательства М. и В. Котляровых» (Нальчык), выдавецтва «Ир» (Уладзікаўказ), а таксама кнігі Азербайджана, Беларусі і Казахстана.

***— Дагестан літаратурны — гэта проза, паэзія, публіцыстыка на аварскай, лакскай, кумыкскай, даргінскай, цхатабульскай, карацінскай і іншых мовах. Ці адчувалася гэта шматмоўе на выстаўцы?***

— Сапраўды, Дагестан з'яўляецца самай шматнацыянальнай рэспублікай Расіі. Толькі пісьмовых моў там ажно чатырнаццаць. Але адчування, што знаходзішся ў чужым моўным асяродку, зусім не было. Як сказаў у гутарцы часопісу «Нёман» адзін з арганізатараў кірмашу, пісьменнік і выдавец Марат Гаджыеў: «Адзіны лідар сярод літаратур Дагестана — руская мова». У рэспубліцы выдаецца вельмі шмат кніг на рускай мове. Аднак сказаць, што нацыянальныя мовы прыніжаны таксама будзе няправільна. Яны, нягледзячы на такі мультылінгвізм, як высвятляецца, могуць мірна суіснаваць. Людзі розных нацыянальнасцяў умеюць паважаць адзін аднаго, чужую мову. У мяне склалася менавіта такое ўражанне. І ў гэтым плане многія маглі б павучыцца ў дагестанцаў.

***— Чым адрознівалася махачкалінская выстаўка ад падобнага прадстаўлення кніг у Маскве, Мінску, Бялградзе?***

— Відаць, цікавасцю да кнігі, літаратуры. Там людзі не так забяспечаны кніжным шматабліччам і разнастайнасцю прадукцыі, як у згаданых вамі сталіцах. На адным з мерапрыемстваў у межах кірмашу віцэ-прэзідэнт Асацыяцыі кнігавыдаўцоў Расіі Алег Філімонаў агучыў статыстыку: на ўвесь Дагестан з яго трохмільённым насельніцтвам працуе ўсяго дзевяць кнігарняў. Таму зразумела, што выстаўка — рэдкая магчымасць дакрануцца да кніжнай культуры, пазнаёміцца з усім спектрам кніжных навінак у розных рэгіёнах Расіі. Дарэчы, пазнаёміцца не толькі з навінкамі ў галіне мастацкай літаратуры. Што цікава, людзі, якія падыходзілі да нашага стэнда, цікавіліся і нават хацелі набыць кнігі на незнаёмай ім беларускай мове.

***— Ужо даўно пайшоў з жыцця вялікі Расул Гамзатаў. Няма Фазу Аліевай. Ці адчувалася на кніжнай выстаўцы прысутнасць дагестанскіх класікаў?***

— Яна не проста адчувалася, складвалася ўражанне, што гэтыя людзі на самай справе там — на стэндах, прэзентацыях, абмеркаваннях, «круглых сталах».

Імя Расула Гамзатава не сыходзіла з вуснаў удзельнікаў кірмашу. Відаць, не выпадкова месцам правядзення «Таркі-Тау» выбралі Нацыянальную бібліятэку Рэспублікі Дагестан, якая носіць імя класіка. Акрамя гэтага, арганізатары выстаўкі вазілі гасцей у Гуніб, месца, якое Расул Гамзатаў лічыў сваёй духоўнай радзімай і якому прысвяціў не адзін твор. Уражанне незабыўнае! Сама атмасфера гэтых гор прасякнута паэзіяй.

***— Што, якія ідэі і ініцыятывы вы прывезлі з Махачкалы ў Мінск, Беларусь?***

— Мне ўдалося пакантактаваць з дагестанскімі, і не толькі дагестанскімі, выдаўцамі, пісьменнікамі, бібліятэкарамі. Як ні банальна гэта гучыць, але вельмі адчуваецца недахоп стасункаў паміж нашымі народамі. Відавочная цікавасць да беларускай культуры, літаратуры. І цікавасць гэтая ў Дагестане вельмі і вельмі вялікая. Ды і нам было карысна даведацца, што ўсё ж там зараз адбываецца. Супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі хацелі б мець у сваіх фондах хоць бы тую беларускую літаратурна-мастацкую перыёдыку, якая выдаецца на рускай мове. Пра што мы і вялі перамовы. Думаю, што мы да гэтага не павінны быць абыякавымі. Размова ідзе пра папулярызацыю нашай нацыянальнай культуры. Ёсць шмат задумак пра супрацоўніцтва ў выдавецкай, інфармацыйнай сферах. Спадзяюся, што хоць бы частку з іх удасца рэалізаваць. Мо наспеў ужо час зрабіць адмысловы выпуск часопіса «Нёман», прысвечаны літаратурам народаў Дагестана ці ўвогуле народаў Паўночнага Каўказа. Мы ж ужо друкавалі ў «Нёмане» вершы Міясат Муслімавай, Лулы Куні... У «ЛіМе», «Маладосці» былі змешчаны пераклады вершаў Саліха Гуртуева, Адама Ахматукаева, Мусы Ахмедава, ды шмат яшчэ каго з цікавых каўказскіх паэтаў. У «Звяздзе» распачаты выпуск серыі «Сябрына: паэзія народаў Расіі». Выйшаў першы зборнік — «Раніші вецер у акне». Аўтар — народны пісьменнік Удмурцыі Вячаслаў Ар-Сяргі. Такі кнігавыдавецкі праект трэба прадоўжыць выпускам кніг вядомых літаратараў Дагестана, Кабардзіна-Балкарыі, Чачні, ды іншых рэгіёнаў.

***— Вы лічыце, што трывалы мост літаратурных сувязяў паміж Махачкалой і Мінскам усё ж можна выбудаваць?***

— Несумненна. І можна, і гэта ўжо фактычна робіцца. Для гэтага ёсць усе перадумовы. Я пазнаёміўся на кніжнай выстаўцы з многімі зацікаўленымі асобамі, якія гатовы працаваць у гэтым кірунку. У нашых літаратур багаты мастацкі вопыт. Нам ёсць што перадаваць адзін аднаму. Такі мост некалі існаваў. Яго патрэбна толькі аднавіць, умацаваць. Мяркую, што не толькі да дагестанцаў звяртаўся ў свой час Расул Гамзатаў у вершы «Беражыце сяброў»:

*На земле друзей не так уж много:*
*Опасайтесь потерять друзей.*

**Гутарыў Кірыл ЛАДУЦЬКА**

■ Восеньскі фэст

# Выйсці на сцежку спазнання свету,

## або Як аб'яднаць экалогію і духоўнасць?



**Сярод жыхароў мікрараёна Каменная Горка распаўсюджаны жарт, што такая назва была абрана нездарма: тут жа сапраўдныя каменныя джунглі! Жарты жартамі, але дрэвы і нават кусты тут сапраўдная рэдкасць. Своеасаблівым «анклавам» жывой прыроды ў густанаселеным раёне стала пакуль адзіная ў горадзе экалагічная сцежка. Каб прыцягнуць увагу гараджан да праекта, было праведзена свята, прысвечанае гармоніі ўзаемаадносін чалавека і прыроды, — «Восеньскі фэст».**

Ініцыятары — «Цэнтр экалагічных рашэнняў» і прыход святога Мікалая Японскага пры падтрымцы грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Некамерцыйная ўстанова супрацоўнічае з мясцовымі вернікамі ўжо даўно, наогул менавіта настаяцель храма айцец Павел Сярдзюк прапанаваў зрабіць сумесны праект. Як аказалася, тэрыторыя каля храма ўяўляе сабой прыродную каштоўнасць, бо на невялікім участку зямлі сканцэнтраваны адразу некалькі экасістэм: лес, луг, поле і вадаём. На аснове гэтага на працягу года распрацоўваўся маршрут сцежкі, якая была адкрыта ў красавіку. Цяпер тут для ўсіх ахвотных праводзяцца бясплатныя экскурсіі.

Падчас свята ўся тэрыторыя каля храма занятая людзьмі, павышанай цікавасці спрыяе добрае надвор'е. Аднак, як прызнаюцца самі арганізатары, задачы зрабіць маштабнае мерапрыемства ў іх не было, хутчэй — суседскія дружалюбныя вячоркі, якія, на жаль, не ўласцівыя ладу жыцця жыхара сучаснага мегаполіса. На паляне перад уваходам у царкву размясціліся палаткі, у якіх праходзяць розныя майстар-класы. Для дзяцей, якія проста немагчыма злічыць, і пажылых людзей стаяць лаўкі, астатнія могуць уладкавацца на бярвёнах і стульчыках, зробленых з пнёў. Атмасфера чымсьці нялоўна нагадвае юнацкія пасядзелкі каля вогнішча. Усё гэта суправаджаецца канцэртам, праграма якога дзівіць разнастайнасцю: ад сучасных хітоў да званоў і беларускай дуды.


**Дапамагаць прыродзе выгадна: нясправныя батарэйкі мяняюць на яблыкі.**

Большасць дзяцей з упрыгожанымі аквагрымам шчочкамі. Нават тут прасочваецца прыродная тэматыка: на малюнках галінкі рабіны і казачныя птушкі. Для тых жа, хто хоча тварыць самастойна, у праграме свята ёсць майстар-класы па складанні восеньскіх букетаў і роспісе палатняных (экалагічных!) сумак. Хто прыйшоў, каб на практыцы паўдзельнічаць у захаванні прыроды ў гарадскім асяроддзі, таксама не застаюцца без справы: майстры навучаюць правілам выбраць кармушак. Дарэчы, усё не так проста, як здаецца: калі не выконваць прапорцыі, напрыклад, пры стварэнні шпакоўні, птушка ўнутр трапіць зможа, а вось выбрацца назад — не. Тут жа непадалёк арганізавана і пляцоўка назірання за пярнатымі.

Кульмінацыя свята — экскурсія па экалагічнай сцежцы. Калі б не план, яе было б цяжка запрыкмеціць: сцежка па-сапраўднаму дзікая. Узроўню яе размешчаныя стэнды, так што пры жаданні можна абысціся і без экскурсавода. Аднак прадстаўнікі «Цэнтра экалагічных рашэнняў», а таксама спецыяльна падрыхтаваныя найбольш актыўныя прыхаджане храма гатовыя выступіць у якасці праваднікоў. Усе стэнды інтэрактыўныя, калі ёсць доступ у інтэрнэт, можна паглядзець фота і відэа, а таксама пачуць галасы птушак. Унікальнасць сцежкі ў тым, што тут можна сустрэць віды, занесеныя ў Чырвоную кнігу: птушку драча, матылька махаона і расліну чыну чорную.

Па словах дырэктара «Цэнтра экалагічных рашэнняў» Яўгена Лабанава, суседства з храмам — гэта велізарная перавага: «Нават такі, здавалася б, нескладаны ў рэалізацыі праект павінен знаходзіцца пад пастаянным наглядам. На жаль, ужо не раз нам даводзілася сутыкацца з актамі вандалізму: і стэнды спальвалі, і дрэвы высякалі, і горы смецця за сабой пакідалі. Прыхаджане робяць вялікую работу па доглядзе за гэтай тэрыторыяй, акрамя таго, самі выступаюць з цікавымі ініцыятывамі. У найбліжэйшых планах у нас правядзенне аўдыяэкскурсій, а таксама адаптацыя сцежкі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі па перасоўванні, крыху пазней — і з асаблівасцямі зроку. Дарэчы, на адкрыцці экасцежкі ў Каменнай Горцы было прынята рашэнне аб стварэнні тэрыторый такога ж тыпу ў кожным раёне горада.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

■

■ Экспрэс-агляд

# Чэмпіёнка стала мамай

**У штотыднёвым аглядзе «Звязды» расказваем пра папаўненне ў сям'і самай тытулаванай біятланісткі краіны, вынік другога паядынку БГК імя Мяшкова ў Лізе чэмпіёнаў і пераможнай серыі мінскіх хакеістаў у Кантынентальнай хакейнай лізе.**

***1. Трохразовая алімпійская чэмпіёнка Дар'я Домрачава стала мамай.*** Біятланістка нарадзіла дачку, вага дзяўчынкі — 3650 г.

*— Мы сталі бацькамі маленькай дзяўчынкі. Яна нарадзілася ў 10.20 раніцы па мясцовым часе (у суботу). Усё прайшло добра. Мы абодва гордыя бацькі,* — заявіў **бацька дзіцяці, біятланіст Уле-Эйнар Б'ёрндален** нарвежскаму выданню VG sporten.

Нараджала Дар'я Домрачава ў радзільным доме 6-й клінічнай бальніцы Мінска. Са з'яўленнем на свет дачкі яе павіншаваў Аляксандр Лукашэнка.

Нагадаем пра тое, што Дар'я Домрачава і Уле-Эйнар Б'ёрндален чакаюць дзіця, стала вядома ў красавіку. Да апошняга часу было сакрэтам, якога полу будзе дзіця. Ці вызначыліся бацькі з імем для дачкі, пакуль таксама не паведамляецца.

**2. Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова ўступіў македонскаму «Вардару» ў выязным паядынку другога тура Лігі чэмпіёнаў.**



Як і ў першым матчы з польскім «Віве», у стартавай палове сустрэчы брастаўчане мелі перавагу, але на перапынак каманды пайшлі ўжо з роўным лікам на табло — 13:13, а другі тайм наогул склаўся цалкам па процілеглым сцэнары. «Вардар» літаральна за пяць хвілін забяспечыў сабе ўпэўненую перавагу ў некалькі ачкоў і ўтрымаў яе да фінальнага свістка — 31:27.

Пасля двух тураў лідарства ў групе В у Лізе чэмпіёнаў захапілі «Вардар» і польскі «Віве». Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова пакуль ачкоў не набраў. Наступны матч у турніры БГК правядзе на дамашняй арэне з чэмпіёнам Германіі «Райн Левен».

***3. Хакеісты мінскага «Дынама» атрымалі пятую перамогу запар у чэмпіянаце Кантынентальнай хакейнай лігі.*** «Зубры» адолелі сапернікаў з ніжнякамскага «Нафтахіміка» з лікам 4:2 і ўстанавілі клубны рэкорд па колькасці матчаў без паражэнняў на выездзе.

Нагадаем, раней падапечныя Крэйга Вудкрафта атрымалі перамогі дома над «Сібір'ю» (5:4), у гасцях над маскоўскім «Дынама» (3:0), казанскім «Ак Барсам» (5:3), тальяцінскай «Ладай» (3:2).

Сёння мінскія хакеісты згуляюць на сваёй пляцоўцы з «Лакаматывам».

***4. Завяршыліся ўсе матчы 24-га тура элітнага дывізіёна чэмпіянату краіны па футболе.*** «Крумкачы» з буйным лікам уступілі «Слуцку» — 0:3, гродзенскі «Нёман» атрымаў перамогу над «Славіяй» з Мазыра — 3:1. «Белшына» саступіла «Тарпеда-БелАЗ» — 1:3, такі ж лік быў зафіксаваны і ў матчы «Граніта» і «Нафтана», футбалісты з Наваполацка былі мацнейшыя. «Мінск» на сваім полі атрымаў перамогу над «Гарадзеяй» — 3:1, «Віцебск» саступіў мінскаму «Дынама» — 0:2. БАТЭ дома з буйным лікам перайграў «Іслач» — 4:1. «Дынама-Брэст» мінімальна саступіў салігорскаму «Шахцёру» — 1:2.

Такім чынам, БАТЭ працягвае ўпэўнена лідзіраваць у чэмпіянаце, салігорскі «Шахцёр» утрымлівае другі радок, трэцім ідзе мінскае «Дынама». У зоне вылету застаюцца «Нафтан» і «Белшына». ■

■ Легенды спорту

**Вадзім САШУРЫН:**

# «У БІЯТЛОНЕ Я НАВУЧЫЎСЯ ВЫЖЫВАЦЬ»

**Чаму ён так і не змог заваяваць алімпійскі медаль і ці стала Беларусь сапраўднай радзімай для спартсмена**

**Біяграфічная даведка**

**Вадзім Сашурын нарадзіўся 19 лютага 1970 года ў Петразаводску. Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь. Трохразовы чэмпіён свету па біятлоне, чэмпіён Еўропы. Уладальнік 9 медалёў чэмпіянату свету.**

**Пачаў займацца біятлонам у 1979 годзе ў Петразаводскай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе алімпійскага рэзерву па лыжных гонках. У 1985 годзе запрошаны ў Віцебскае вучылішча алімпійскага рэзерву. У 1987—1991 гадах — член юнацкай, юніёрскай і маладзёжнай зборнай СССР.**

**Завяршыў сваю кар'еру ў вялікім спорце ў 2006 годзе, перайшоўшы на пасаду галоўнага трэнера лыжнай зборнай Беларусі. Працаваў старшым трэнерам нацыянальнай каманды па біятлоне. Цяпер з'яўляецца трэнерам па агульнафізічнай падрыхтоўцы атлетаў з розных відаў спорту.**

**У сярэдзіне восені, а значыць, ужо зусім хутка, стартуе біятлонны сезон. Наша каманда сёлета, як і летась, будзе выступаць без лідара, самай тытулаванай біятланісткі краіны Дар'і Домрачавай. Прычына вельмі важкая — алімпійская чэмпіёнка стала маці.**



Ну а пакуль усе гадаюць, як складзецца наступны год для беларускіх страляючых лыжнікаў, мы вырашылі сустрэцца з трохразовым чэмпіёнам свету па біятлоне, сапраўдным снайперам і без перабольшання беларускай легендай Вадзімам Сашурыным. У інтэрв'ю ён успамінае самыя яскравыя моманты сваёй кар'еры, якую скончыў 10 гадоў таму, і расказвае, як рыхтуе будучых чэмпіёнаў.

***— Вадзім Леанідавіч, адразу б хацелася нагадаць, як атрымалася, што вы, ураджэнец расійскага Петразаводска, трапілі ў Беларусь?***

— У 85-м годзе мяне запрасілі ў Віцебскае вучылішча алімпійскага рэзерву, прыязджаў сюды на два гады, а атрымалася, што жыву ў Беларусі ўжо больш за 30. У Віцебску я вырашыў цалкам сканцэнтравацца на спорце, таму што першапачаткова ў дзяцінстве ў мяне быў выбар — спорт або музыка. Я іграў на баяне (у тым ліку і ў ансамблі). Тады выдатна разумеў, што ў музыцы можна затрымацца даўжэй, а спорт абмежаваны па ўзросце.

***— Адразу знайшлі сябе ў біятлоне?***

— Перш чым стаць на лыжы, перабраў шмат секцый, сярод іх — гімнастыка, плаванне, настольны тэніс, стэндавая стральба. Спрабаваў нават фігурнае катанне, але яно скончылася, калі мне прапанавалі дзяўчыну ў пару. У лыжных гонках, думаю, я б таксама не затрымаўся надоўга, калі б у адзін цудоўны момант не з'явілася стральба. Яна вельмі захапіла мяне. Напэўна, нездарма і была заўсёды маім козырам у біятлоне. Але сказаць, што ў спорце ў мяне ўсё атрымлівалася адразу, не магу, музыка давалася нашмат лягчэй.

Пазней ужо пачало нешта вымалёўвацца, я стаў выйграваць практычна ўсе спаборніцтвы, у якіх браў удзел, абыходзіў хлопцаў, якія часам былі гады на 4 старэйшыя за мяне, і ўсё роўна планаваў вярнуцца ў музыку. Калі запрасілі ў Віцебск, у спорт акунуўся з галавой, у Беларусі не прайграў ніводнага старту, на першым для сябе міжнародным турніры сацкраін «Дружба». У камандзе СССР быў ужо першым нумарам па сваім узросце, таму пытанне з музыкай адпала само сабой.

***— Цяпер на баяне сыграць маглі б?***

— Вядома, назвы песень ужо памятаю дрэнна, але сыграць магу.

***— Ці стала Беларусь для вас роднай краінай?***

— Радзіму не выбіраюць, нарадзіўся я ўсё ж такі ў Расіі і выразна разумею сваю прыналежнасць да яе. Калі пераязджаў у Віцебск, гэта была адна краіна — СССР, таму не было адчування, што еду за мяжу. Сёння, вядома, ёсць розніца паміж людзьмі і краінамі. 31 год я пражыў у Беларусі, вывучыў гэты народ, тут у мяне з'явілася сям'я, сябры, блізкія людзі, таму, вядома, я яе палюбіў.

***— Як увогуле ацэніце сваю кар'еру?***

— Зараз дакладна магу сказаць, што каб цяперашнія мае веды прымяніць у тыя гады, калі я бегаў, то шмат якіх памылак можна было пазбегнуць і паказаць вынік нашмат вышэйшы. Але, на жаль, час не вярнуць. Маё пакаленне вучылася выключна на сваіх памылках, на ўласным вопыце, усяго даводзілася дабівацца сваёй галавой. Затое цяпер гэта дапамагае мне ў рабоце са спартсменамі, я магу вырашаць многія праблемы і пытанні, проста таму што ў біятлоне навучыўся выжываць. Сёння гэта дае мне магчымасць прымаць правільнае рашэнне, бачыць памылкі, можа быць, раней за іншых.

***— Ёсць вяршыні, якія так і не атрымалася скарыць?***

— Шмат каму можа здацца, што гэта Алімпійскія гульні, але як ні дзіўна, стаць алімпійскім чэмпіёнам мне было не так цікава, як заваяваць Вялікі хрустальны глобус. Там у мяне былі 6, 7 месца (заўсёды быў у топ-15), адзін раз паспрачаўся ў барацьбе за малы глобус у масстарце. У вырашальнай гонцы мне дастаткова было быць 12-м. Мас-старт, як правіла, праходзіць пасля спрынту і праследавання. Спрынт я выйграў, у пасьюце на апошніх двух кругах спрабаваў сэканоміць сілы. Але за тры дні арганізм быў выціснуты да такой ступені, што пытанне аб барацьбе адпала. Так я развітаўся з кубкам.



Фота: Прэс-служба СКА.

**Вадзім Леанідавіч з гульцамі гандбольнага СКА.**

***— А што за гісторыя з Алімпіядамі?***

— Алімпіяда — гэта мара кожнага спартсмена, але я не люблю гэты старт, таму што Гульні — гэта латарэя. Плюс яшчэ той ажыятаж, які заўсёды нагнятаюць перад імі... Доўгі перыяд часу ты рыхтуешся да аднаго канкрэтнага старту, нават да пэўнага дня, але быць на піку формы ў пэўны момант вельмі складана. За тыдзень да старту ў алімпійскім Солт-Лэйк-Сіці, нават яшчэ дзён за 5, я быў у выдатным стане, а на самой Алімпіядзе трапіў у акліматызацыйную яму, якая, як на зло, атрымалася самай глыбокай у сезоне.

У Нагана я прыехаў з траўмай пазваночніка. Увесь час нешта ўмешвалася, я займаў 5, 8, 10 месцы, як мы кажам у біятлоне — кучна, але не па месцы.

***— Які момант у кар'еры назвалі б самым яскравым?***

— Першыя медалі, вядома, добра запомніліся, але ўсе ўзнагароды па-свойму дарагія. Я іх часам перабіраю і блытаю колькасць, дома налічваю 16 штук, а мне кажуць, што іх павінна быць 12. Але, калі шчыра, бегаць было значна прыемней, чым цяпер глядзець на гэтыя медалі. Там была барацьба, экшэн. Мне назіраць за тым, як хтосьці спаборнічае, заўсёды значна цяжэй, чым выступаць самому, там эмоцыі зусім іншыя — рабочыя.

***— За гады кар'еры з вамі здараліся кур'ёзы?***

— Вядома, іх было шмат: і мішэні блыталі, і без патронаў на рубеж прыязджалі. Усе праз гэта праходзяць, у гэтым няма нічога страшнага. Без вінтоўкі ні разу не стартаваў, але адзін раз забыўся яе ў сваім гасцінічным нумары, прыйшлося вяртацца, а гэта дрэнная прыкмета. Чым даўжэйшая кар'ера, тым больш, напэўна, такіх кур'ёзаў назапашваецца.

***— Цяпер маеце зносіны з кімнебудзь з эліты сусветнага біятлону?***

— Так, пасля «Гонкі легендаў» сядзелі з Фрудэ Андэрсанам да паловы пятай раніцы, ніяк разысціся не маглі. У Раўбічах была добрая кампанія, Вольга Зайцава, Ганна Багалі, Мікалай Круглоў і яшчэ некалькі блізкіх людзей, з якімі мы выступалі разам і цяпер падтрымліваем сувязь. Але ў асноўным мае сябры — гэта людзі з дзяцінства, на шчасце нам удалося захаваць вельмі цёплыя адносіны.

***— Былі думкі наогул «завязаць» са спортам і з трэнерскай дзейнасцю ў тым ліку?***

— Я спрабаваў сябе ў розных сферах дзейнасці і, трэба сказаць, небеспаспяхова. Што тычыцца, напрыклад, бізнесу, то для мяне ён сумны. Там ідзе чысты заробак грошай і няма ніякай творчасці. У бізнесе галоўнае паставіць і наладзіць механізм, а далей назірай, як ён працуе. У спорце ж іншае — пастаянна працуюць мазгі, таму што ты ў бесперапынным працэсе, пастаянна думаеш, таму што працуеш з людзьмі. Тут прысутнічае чалавечы фактар: спартсмены розныя і кожны цікавы па-свойму. Сучасны спорт вельмі змяніўся, ён становіцца разумнейшым, больш дасканалым, з'яўляюцца розныя сродкі трэніровак, шляхоў для дасягнення мэты.

Напэўна, сваю нерэалізаванасць спартсмена цяпер мне хацелася б увасобіць у маладых, расказваць ім, як захаваць сябе даўжэй у спорце, падказаць, як дасягнуць найвышэйшага выніку.

***— Чаму вырашылі працаваць менавіта трэнерам па фізпадрыхтоўцы?***

— У Беларусі гэтая ніша аказалася свабоднай. Агульная фізічная падрыхтоўка — гэта адбудаванне метабалізму ў арганізме атлета, закладанне падмурка. Гэта вельмі важны кампанент, таму што памылкі, дапушчаныя ў фарміраванні спартсмена функцыянальна, потым не выпраўляюцца, альбо выпраўляюцца, але вельмі цяжка. Промахі на раннім этапе падрыхтоўкі выяўляюцца, калі спартсмен упіраецца ў столь і вынікі перастаюць расці. Я выраўніваю гэтыя прабелы і спрабую правільна сфарміраваць базу, тады ў спартсмена будзе не столь, а неба над галавой.

Цяпер, калі я трэнер, выразна разумею, што адна справа сябе прымушаць трэніравацца, а зусім іншая ставіць спартсменаў у такія рамкі, каб яны выконвалі хоць бы мінімум работы, гэта нашмат цяжэй.

***— Вядома, што па жыцці вы максімаліст. Ад сваіх вучняў патрабуеце такой жа самааддачы?***

— Вядома. Мая задача ўкласці ў іх той мінімум працы, які стаў бы платформай для фінішнага выбуху, на якім выйграюцца медалі. Я хачу, каб мае вучні самі адчулі смак перамогі, цяпер большасць з іх яшчэ не ведаюць, што гэта такое. Яны мяркуюць, нібы сабе гэта ўяўляюць, але дакладна не ведаюць.

***— Вашы дзеці пайшлі па вашых слядах?***

— Вось, напярэдадні, старэйшая дачка стала сярэбранай прызёркай маладзёжнага чэмпіянату Еўропы па дзюдо, займала прызавыя месцы і на іншых буйных турнірах. Даю ёй нейкія парады са сваіх ведаў, але яны не заўсёды падыходзяць, у іх крыху іншая спецыфіка. Малодшая займаецца плаваннем, у басейне яна, як русалка, вельмі прыгожа плавае. А вось сярэдняя наадрэз адмаўляецца займацца спортам, кажа, што будзе актрысай.

***— Чым адцягваецеся ад спорту?***

— Апошнія гадоў 15 пайшло на будаўніцтва дома, я асвоіў абсалютна ўвесь спектр будаўнічых работ. Прыйшлося навучыцца ўсяму, пачынаючы ад электрыкі, заканчваючы дахам, вокнамі. Цяпер вялікае задавальненне мне дастаўляе сад, агарод, спрабую вырошчваць вінаград. Ну, пра выраб гарэлкі я не буду расказваць *(смяецца)*. Ужо паўгода вывучаю пытанне, як самастойна выгнаць смачны якасны напой з уласнай сыраваны ■

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# Дачку ад маці, сына ад бацькі — даводзіцца абараняць судам

## Чаму ж бацькі пакрыўджаных дзяцей не думаюць аб сваёй старасці?

**Жыла-была сям'я ў Брэсце: маці, бацька і дачка. Пражывалі яны ў доме, які галава сям'і атрымаў, паводле дагавора дарэння, ад сваёй маці. Пазней ён перапіша жыллё на сваю непаўналетнюю дачку, назавём яе Таццянай. А вось маці гэтага сямейства Ірына, грамадзянка Украіны, яна нават не мела віду на жыхарства ў нашай краіне, так наязджала туды-сюды, зарэгістраваная да гэтай пары ў Валынскай вобласці. Жыццё апошнім часам, што называецца, не клеілася, і сужэнцы пасля 15 гадоў шлюбу развяліся.**



Але ж прадпрымальная дамачка выступіла законным прадстаўніком сваёй дачкі ў выпадку ажыццяўлення здзелкі па нерухомасці. І засталася пражываць у доме былога мужа. Праўда, клопатамі аб выхаванні дачкі Тані яна асабліва сябе не абцяжарвала. Прывяла ў дом сужыцеля, пастаяннымі сталі гулянкі з выпіўкай. А калі дачка-падлетак выказвала сваю незадаволенасць абстаноўкай у доме, то маці магла і пацягаць яе за валасы, не саромелася і ў слаўвесных практыкаваннях у адносінах да ўласнага дзіцяці (пазней у дакументах суда гэта назавуць абразай). Такім чынам, бацьку з дачкой там стала жыць немагчыма, і яны перабраліся ў дом бабулі.

Праз нейкі час Васіль ад імя 16-гадовай дачкі падаў у суд іск аб высяленні былой жонкі з дому. У ходзе судовага разбору высветліў шэраг цікавых абставін. Так, напрыклад, Ірына пазычала вялікія сумы грошай у валюце ў сваіх знаёмых як бы на пакупку абсталявання для бізнесу. А вось у якасці залогу аднаму з крэдытораў дала арыгінальны экземпляр дагавора дарэння дома, што атрымаў былы муж ад сваёй маці ў верасні 2013 года, якім завалодала незаконна. Таксама адказчыца мела запазычанасць па аплаце аліментаў былому мужу на ўтрыманне дачкі больш як на 2500 рублёў. Пражываючы ў доме, яна не плаціла за ваду, электраэнергію, і даўгі за адпаведныя паслугі набліжаліся да тысячы рублёў. Далей — болей, нахабству яе, здавалася, не будзе межаў. Былая жонка і маці памяняла ўсе замкі ў доме, заключыла ад свайго імя дагавор на ахову дома і падала іск у суд Ленінскага раёна Брэста аб прызнанні Васіля страціўшым права валодання і карыстання жылым домам на падставе таго, што ён там не пражывае і не ўтрымлівае памяшканне.

Вядома, суд не задаволіў такі іск, бо прэтэнзіі былі беспадстаўнымі. А вось іск дачкі аб высяленні маці выглядаў пераканаўча. На баку 16-гадовай дзяўчынкі выступалі бацька, бабуля і прадстаўнікі дзяржаўных органаў апекі і папячыцельства. Сведкі расказвалі, як Ірына перыядычна ўчыняе скандалы, а потым сама піша заявы ў міліцыю. У дом яго гаспадароў не пускае, пры гэтым не лічыць патрэбным аплачваць камунальныя паслугі.

Як і варта было чакаць, суд вынес рашэнне выселіць адказчыцу з жылога дома без прадстаўлення іншага жылога памяшкання, а таксама спагнаць з яе судовыя выдаткі.

Цяжка сказаць, ці зробіць для сябе якія высновы 40-гадовая жанчына. Асоба без грамадзянства краіны і рэгістрацыі разгарнула цэлую сетку махлярскіх прыёмаў, каб завалодаць домам былога мужа: выкрадала дакументы, рабіла немагчымым пражыванне экс-мужа і дачкі, каб потым казырыць гэтым у судзе. Уважліва азнаёміўшыся з нашымі законамі, яна ўмела правакавала выклікі міліцыі, пісала заявы ў РАУС, каб было што прад'явіць быццам бы мужу-скандалісту, хоць і былому. Пры гэтым інтарэсы дачкі не тое што не ўлічвала, паводзіла сябе з ёй як з яшчэ адной перашкодай, якую трэба проста нейкім чынам нейтралізаваць на шляху да дасягнення сваіх мэт па захопе чужога дома. Варта сказаць, што некаторым жа падобныя аферы ўдаюцца, тут проста своечасова спахапіліся ці нехта падказаў, але схільнай да махлярства кабеце далі адпор.

Але аб чым думала яна, калі спрабавала адсудзіць дом, які юрыдычна з'яўляецца ўласнасцю яе дачкі? Ці яна меркавала ў гэтым доме нарадзіць новых дзяцей, якія стануць апорай на старасці? Хутчэй за ўсё не думала ні аб чым, бачыла перад сабой мэту, якую сабе і паставіла: завалодаць тым, што ёй ніколі не належала, напазычаць грошай у даверлівых знаёмых і жыць у сваё задавальненне. Такімі катэгорыямі, як старасць у наступныя 20—30 гадоў, яе наступствы ў выглядзе хвароб, іншыя старэчыя праблемы, асобы, падобныя нашай гераіні, мысліць не здольныя. Яны жывуць сёння і тут, пакуль суд ці іншыя праваахоўныя структуры іх не спыняць.

Дарэчы, апісаным судом справа не скончылася. Як паведаміла **памочнік пракурора горада Брэста Наталля ШАСТАЧУК,** у суд паступіла яшчэ адна заява ад Тані аб пазбаўленні Ірыны бацькоўскіх правоў. І гэта будзе, відаць, лагічным завяршэннем адной сумнай сямейнай гісторыі.

Не назавеш вясёлай і тую, аб якой расказала **старшы памочнік пракурора Кобрынскага раёна Марына СВІСТУНОВІЧ.** Трохгадовы хлопчык трапіў у раённую бальніцу з траўмамі, якія мовай пратакола называюцца лёгкімі цялеснымі пашкоджаннямі. Сінякі і драпіны дзіцяці нанёс 43-гадовы бацька. Усялякае бывае ў сям'і, але ж калі любячы бацька шлёпне сына ці дачку па тым месцы, адкуль ногі пачынаюцца, то ў бальніцу дзіця не трапляе. Тут быў зусім іншы выпадак. Таму за справу ўзяліся праваахоўныя органы. Адразу сям'ю наведалі супрацоўнікі РАУС, але жонка дэбашыра, маці пацярпелага хлопчыка і яшчэ дваіх старэйшых дзяцей, вельмі прасіла міліцыянераў мужа да адказнасці не прыцягваць. З чым катэгарычна не пагадзілася пракуратура. Справу разгледзелі ў судзе.

На пасяджэнні суда шматдзетны бацька апраўдваўся, што ён толькі пацягнуў сына за вуха, ад чаго дзіця нахілілася, упала, а экспертыза зафіксавала цялесныя пашкоджанні.

Суд прызначыў пакаранне нядбайнаму бацьку ў выглядзе трох сутак арышту. Але галоўнае, што сям'я пасля гэтага трапіла пад пастаянны кантроль спецыялістаў зацікаўленых службаў. Іх дом цяпер рэгулярна наведваюць прадстаўнікі органаў адукацыі, міліцыянеры, нават супрацоўнікі МНС надаюць павышаную ўвагу захаванню правілаў бяспекі ў кватэры названай шматдзетнай сям'і. Усё робіцца для таго, каб бацькі ўсвядомілі, што іх дзеці цяпер пад асаблівай увагай дзяржавы, і паўтарэнне падобнага ўчынку тоіць у сабе рэальную пагрозу застацца гэтым бацькам наогул без дзяцей.

Памочнік пракурора спадзяецца, што дакумент, які ўмоўна можна назваць комплексам мер па захаванні сям'і, будзе мець належны эфект. І недарэмна два разы на месяц у дом да шматдзетных бацькоў заходзяць самыя розныя службовыя асобы. Можа, адумаюцца бацькі, перагледзяць свае адносіны да выхавання дзяцей, вызначаць раз і назаўсёды, што ж з'яўляецца галоўным: мір і спакой у доме ці скандалы, якія суправаджаюцца злосцю, нястрыманасцю ў паводзінах і спараджаюць буйныя непрыемнасці. Можа, усвядомяць, альбо хто падкажа, што дзеці, якія выраслі ў атмасферы добразычлівасці, хутчэй стануць апорай бацькоў у будучым, чым тыя дзеці, якіх ад бацькоў абараняў суд.

Запрасіць бы гэтых ды многіх іншых бацькоў на пасяджэнне суда ў адным з райцэнтраў, якое адбылося крыху больш за год таму. Суд разглядаў заяву грамадзяніна аб прызначэнні яму аліментаў ад уласных дзяцей. Гэты грамадзянін цяпер стары і нямоглы, так ён ва ўсякім разе пра сябе гаварыў. А некалі ён быў малады і здаровы, але пра дзяцей асабліва не дбаў. Пакінуў жонку з малымі ды падаўся ў пошуках не то лепшай долі, не то прыгод далёка за межы цяперашняй нашай краіны. Жонка падняла дзяцей, яны выраслі, сталі годнымі людзьмі. Прайшоў час, і, на жаль, дзеці пахавалі маці. Дом, у якім яна іх гадавала, дастаўся ёй у сваю чаргу ад яе бацькоў. Потым дом рамантавалі, паднаўлялі, нешта дабудоўвалі. Цяпер там, вядома, ёсць каму жыць. І вось праз шмат гадоў на парозе таго дома з'явіўся бацька... Ён заявіў, што будзе жыць у доме былой жонкі, а дзеці павінны плаціць аліменты на яго ўтрыманне, бо прыстойную пенсію за гады бадзяння па расійскіх гарадах ці сёлах ён чамусьці не зарабіў. Няцяжка здагадацца, што суд адхіліў падобны іск.

Вядома, можна і паспачуваць старому, не надта здароваму чалавеку, а таксама нагадаць іншым, што за ўсе твае ўчынкі жыццё некалі прад'явіць рахунак.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

■ Вечныя ісціны

# ЗВЯРТАЦЦА ДА БОГА ПА-БЕЛАРУСКУ

**Настаяцель прыхода сабора Усіх беларускіх святых вёскі Любань Вілейскага раёна протаіерэй Ігар Дражын хоць бы раз на месяц адпраўляе службу на беларускай мове.**

### «Усё ўва мне перавярнулася»

З дзяцінства любіў чытаць. Асабліва кнігі па сусветнай гісторыі, па гісторыі рускай праваслаўнай царквы, — расказвае айцец Ігар. — А потым я неяк задумаўся: шмат пра што ўжо маю ўяўленне, але зусім нічога не ведаю пра гісторыю Беларусі. Пайшоў у кнігарню, набраў там усё, што было. Для мяне гэта было ашаламляльна, усё перавярнулася, адкрылася ў іншым святле. Я нічога не ведаў пра сваю краіну, пра яе культуру, традыцыі, пра веру сваіх продкаў. Пасля гэтых кніг я зразумеў, што не ведаючы гісторыю свайго краю, мы губляем саміх сябе. Захацелася нешта памяняць. Зразумела, што я не магу зрабіць штосьці глабальнае, адно толькі занесці ідэю ў той асяродак, у якім знаходжуся. Пачаў спрабаваць размаўляць на нашай мове. Спачатку не атрымлівалася, бо вучыўся ў рускай школе, цураўся беларускай мовы ў дзяцінстве. Запісаў на флэшку беларускія песні, каб слухаць у машыне, чытаю беларускіх класікаў, куплю беларускамоўныя газеты...

### Пішыце прашэнне на імя настаяцеля

Ніякіх дакументаў, якія забараняюць служэнне на беларускай мове ў праваслаўных храмах не існуе. Больш за тое, яшчэ на саборы 1918 года, калі выбіраўся патрыярх Ціхан, было прынята такое рашэнне, што па жаданні прыхода служба можа здзяйсняцца на любой мове. Мітрапаліт Філарэт неаднаразова выказваўся, што пажадана, каб хоць бы Евангелле ці Апостал на літургіі прачытваліся на беларускай альбо рускай мове.

Зусім нядаўна Мітрапаліт Павел казаў, што калі прыход жадае, то няхай служаць на беларускай мове, але каб не было раздзялення сярод прыхаджан.

Ведаю, што многія прыхаджане хацелі б, каб літургія адбывалася па-беларуску. Ёсць такая магчымасць для вернікаў, што можна напісаць прашэнне на імя настаяцеля, на імя благачыннага і на імя епіскапа і адправіць іх з сабранымі подпісамі. 10—20 подпісаў — і ўсё будзе вырашана на карысць прыхаджан.

Хоць перакладаў Біблії на беларускую мову існуе шмат, праваслаўнага варыянта, які б адпавядаў усім канонам нашай царквы, няма да гэтага часу. Ёсць пераклады чатырох Евангеляў, вось зараз заканчваюць перакладаць Апостала, і толькі пасля гэтага з'явіцца цалкам перакладзены на беларускую мову Новы Запавет.

Я ведаў, што перакладамі літургіі займаецца брацтва Віленскіх мучанікаў пры Петрапаўлаўскім саборы пад кіраўніцтвам айца Сергія Гардуна. Звярнуўся да іх, кажу, што мне трэба перакладзенае Святое Пісанне, літургію, трэба ноты для хору. Мне адказалі, што будуць дасылаць электроннай поштай, і што зборніка не існуе ў фізічным выглядзе.

### Свой пераклад і спрэчныя словы

Тады я вырашыў сам перакласці тое, чаго мне не хапае, хоць бы тыя ж праскамідыйныя малітвы. Бо святар павінен быць засяроджаным і не рассейваць сваю ўвагу, каб малітва ўзнеслася да неба. А калі ты здзяйсняеш праскамідыю на царкоўнаславянскай мове, служыш для людзей на беларускай, а таемныя малітвы зноў чытаеш на царкоўнаславянскай, засяроджанасці гэта не спрыяе.

Даўно літургію ўжо пераклаў уладыка Мікалай з аўтакефальнай канадскай царквы, але ў яго шмат палескіх дыялектызмаў, якія не адпавядаюць нормам сучаснай беларускай мовы. У перакладах айца Сергія Гардуна шмат русізмаў, славянізмаў.

Перакласці праскамідыю мне дапамаглі два філолагі з маіх прыхаджан. Потым ужо пераклалі і таемныя малітвы, і ўказанні для святара. Атрымаўся цэлы служэбнік, якога так не хапае іншым бацюшкам, якія моляцца на нашай мове.

Шмат розных поглядаў на тое, як перакладаць. Наконт імёнаў, напрыклад, якая павінна быць іх транскрыпцыя. У кожнага ж народа існуе сваё прачытанне імёнаў. Чаму ў нас ужываецца Іаан Златавуст, а не Ян Златавуст, чаму Грыгорый Багаслоў, а не Рыгор Багаслоў і г.д. Але больш за ўсё мяне бянтэжыць ужыванне слоў *благаславі* і *благадаць*. Усе ж беларусы ведаюць, што слова *блага* азначае *дрэнна*. Я не першы, хто прапануе варыянты *дабраславі* і *дабрадаць*. Мне казалі, што іх няма ў слоўніках. Нават калі гэта і праўда, мова — гэта жывы арганізм, будзем ужываць словы, слоўнікі зафіксуюць праз колькі гадоў. Але асабіста я сустракаў у слоўніку і дабравешчанне, і дабравесце, гэта значыць, словаўтварэнне такое магчымае.



Протаіерэй Ігар ДРАЖЫН.

### Малебен на нашай мове

Цяпер раз на месяц ці часцей, калі выпадае памяць беларускіх святых, я служу цэлую літургію на беларускай мове. У іншыя дні па-беларуску чытаю Евангелле, прапаведзь хутчэй на трасянцы. Ёсць цяжкасці з багаслоўскай лексікай, якая ў мяне не напрацавана яшчэ. Усю ўвогуле яна распрацаваная, ёсць пропаведзі Арцемія Кішчанкі, гродзенскага епіскапа, але такой літаратуры, безумоўна, мала.

Пакуль мару, каб хоць бы раз на год, у Дзень беларускіх святых, па ўсіх храмах Беларусі прагучаў бы малебен на нашай мове гэтым самым беларускім святым, якія паклалі сваё жыццё дзеля нас з вамі.

**Алена ХУРС**

■

# ЮНЫ АБАРОНЦА ЦЫТАДЭЛІ

## Пётр Кацельнікаў — абаронца Брэсцкай крэпасці з Беларусі, які да нядаўняга часу жыў у горадзе над Бугам



**Мы, хлопчыкі пакалення шасцідзясятых, захапляліся мужнасцю абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Асабліва нас хвалявалі юныя героі. Іх імёны мы ведалі на памяць: Пеця Васільеў, Пеця Клыпа, Валодзя Казьмін, Пеця Кацельнікаў, Нюра Кіжаватава...**

Я шмат разоў бываў у цытадэлі над Бугам і заўсёды марыў пазнаёміцца хоць з адным з гэтых герояў. 9 мая 2005 года непадалёк ад Паўночных варот Брэсцкай крэпасці праходзіў мітынг у гонар 60-годдзя Перамогі. На сцэну падняўся высокі сівы мужчына ў вайсковай форме са шматлікімі ордэнамі і медалямі на грудзях. Я яго адразу пазнаў. Гэта быў Пётр Паўлавіч Кацельнікаў, выхаванец 44-га стралковага палка, адзіны жывы абаронца Брэсцкай крэпасці з Беларусі.

Тады мне не хапіла рашучасці падысці да яго. Праз месяц я адважыўся і патэлефанаваў дырэктару мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» і папрасіў у яго адрас і тэлефон Пятра Кацельнікава. Так я даведаўся, дзе жыве юны абаронца. Напісаў яму ліст. Той мне адразу адказаў... Потым я часта размаўляў з Пятром Паўлавічам па тэлефоне, рэгулярна перачытваў яго ўспаміны пра Брэсцкую крэпасць.

### Навальніца!?

«...Восенню 1940 года пяцёх хлопчыкаў з дзіцячага дома «Чырвоны Кастрычнік», што ў Растоўскай вобласці, прынялі выхаванцамі ў Чырвоную Армію. Нас прывезлі ў ваенны гарадок пад Брэстам, залічылі ў музычны ўзвод. Напярэдадні вайны наш 44-ты стралковы полк, якім кіраваў Пётр Гаўрылаў, перавялі ў Брэсцкую крэпасць. На той момант мне было 12 гадоў. Наш узвод размяшчаўся ў заходняй казарме цытадэлі непадалёк ад Брыгідскіх варот крэпасці.

22 чэрвеня 1941 года ў 4 гадзіны раніцы тысячы бомбаў і снарадаў паляцелі на крэпасць. Я прачнуўся ад грохату выбухаў і адразу не зразумеў, што адбываецца. Падумаў, навальніца. Шкло з акон павылятала, праз аконныя праёмы былі відаць палаючыя казармы. І раптам — выбух! Калі я прыйшоў у прытомнасць, галава была перабінтавана, а побач незнаёмыя байцы стралялі з акон па фашыстах, якія пад прыкрыццём свайго агню праніклі на цэнтральны востраў, захапілі частку казармы і чырвонаармейскі клуб. Я пачаў дапамагаць байцам: зараджаў абоймы, кулямётныя стужкі, падаваў патроны, гранаты».

### Смяротны занятак

«К зыходу першага дня вайны я з групай байцоў перайшоў у размяшчэнне 333-га стралковага палка. На гэтым участку абароны баявымі дзеяннямі кіравалі старшы лейтэнант Патапаў і лейтэнант Андрэй Кіжыватаў — начальнік 9-й пагранічнай заставы. Тут я сустрэўся са сваімі аднагодкамі: Пецем Клыпам, Колем Новікавым, Пецем Васільевым, Нюрай Кіжаватавай, Валяй Зенкінай. Нам загадалі дастаўць боепрыпасы са складоў. Мы папаўзлі туды пад кулямі. Аказалася, іх заваліла выбухам. Прыйшлося пад стрэламі адкопваць скрыні з боепрыпасамі. Нялёгка прыйшлося і дзяўчынкам. Яны набівалі патронамі кулямётныя дыскі, стужкі, перавязвалі параненых.

Нюра Кіжаватава з дзяцінства ўмела добра страляць з вінтоўкі і цяпер замяняла ў акне параненых і забітых байцоў, трапна страляючы па фашыстах. Ноччу мы, хлопчыкі, паўзлі на нейтральную паласу, забіралі ў забітых гітлераўцаў патроны, гранаты, зброю. Потым бралі кацялкі, пляшкі і паўзлі да рэчкі па ваду. Гэта быў смяротны занятак — усе берагі рэчкі прастрэльваліся шчыльным агнём ворага, асвятляліся ражэктарамі. Але іншага выйсця не было — параненыя і асабліва дзеці хацелі піць».

### Даплыць да берага

«...У апошнія дні чэрвеня фашысты без перапынку штурмавалі крэпасць. Абаронцы разумелі, што доўга не змогуць пратрымацца, і вырашылі прарывацца на Кобрынскае ўмацаванне, выйсці з крэпасці і злучыцца з Чырвонай Арміяй.

Сабраўшы апошнія гранаты, праверыўшы зброю, наша групоўка кінулася да моста цераз Трохарачныя вароты. Фашысты адразу адкрылі шчыльны агонь. Некалькі байцоў і я разам з імі засталіся каля моста прыкрываць прарыў сваіх сяброў. Невялічкай групе адважных удалося прабіцца на процілеглы бераг. Завязаўся страшэнны рукапашны бой. Мы кінуліся на дапамогу. Фашысцкія кулі адразу ўспенілі ваду. Не ўсім пашчасціла даплыць да берага...

Мяне аднесла да берага. Побач плыў мой сябар Валодзя Ізмайлаў. Мы выбраліся на бераг і папаўзлі ў бок казэмата. Там былі жанчыны, дзеці, параненыя байцы. На наступны дзень фашысты ізноў пачалі абстрэл і бамбёжку крэпасці. Ад магутных выбухаў дрыжэла зямля, рушыліся сцены казематаў. Азвярэлыя фашысты ўварваліся ў наш каземат. Усіх, хто застаўся жывым, вывелі, пастроілі і пагналі ў лагер для ваеннапалонных у Бяла-Падляску. Параненых і тых, хто не мог хадзіць, расстрэльвалі на нашых вачах.

Пры перавозе зняволеных у іншае месца нам з Валодзем Ізмайлавым удалося збегчы. Жылі ў вёсцы Сакі Брэсцкай вобласці. Спрабавалі звязацца з партызанамі, але безвынікова. Дапамог трагічны выпадак. Восенню 1942 года фашысты сталі зганяць жыхароў некалькіх вёсак у мястэчка Жабінка. Мы з Валодзем схаваліся ў лесе. Там і сустрэлі партызан. З таго часу выконвалі іх даручэнні».

### Не дажылі да Перамогі

«На жаль, не ўсе юныя абаронцы крэпасці здолелі дажыць да Перамогі. У няроўным баі ў крэпасці пры штурме чырвонаармейскага клуба загінуў Пеця Васільеў. Смяротна паранены, ён паспеў прамовіць: «Перадайце родным у Сталінград...» Што хацеў сказаць хлопчык сваім родным у далёкі Сталінград, ніхто ўжо не даведаецца...

Восенню 1942 года загінула дачка начальніка 9-й заставы, бясстрашная дзяўчынка Нюра Кіжаватава. Фашысты расстралялі яе разам з матуляй, бабуляй, братам і сястрой.

Пятра Гаўрылава, камандзіра 44-га стралковага палка, фашысты здолелі ўзяць у палон цяжкапараненага толькі на 32-гі дзень вайны. У сваім апошнім баі Пётр Міхайлавіч забіў некалькі фашыстаў...»

***

І сёння Брэсцкая крэпасць захоўвае мноства легендаў і хвалюючых загадак. Калі быў узяты ў палон ці забіты апошні абаронца крэпасці? Хто быў той невядомы герой, які кінуў у строй ворага з Цярэспальскай вежы звязку гранат, а сам, каб не трапіць у палон, паканчыў з сабой? Як звалі бясстрашную дзяўчыну, якая ноччу выходзіла з аўтаматам з падзямелля і палявала на фашыстаў, прычым ніколі не прамахвалася? Дзесьці ў засыпаных падвалах ляжаць закапаныя ў зямлю ці замураваныя ў сценах баявыя сцягі палкоў, якія і дагэтуль не знойдзены. Старыя сцены цытадэлі над Бугам маўчаць і, відаць, ніколі не раскажуць свае тайны...

**Міхаіл МАСКАЛЬЧУК,**
*Бераставіцкі раён.*

# ЗАХАВАЦЬ І ЎВЕКАВЕЧЫЦЬ

## Навучэнцы Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя Глебава стварылі серыю партрэтаў аб пагранічніках



Ветэран Вялікай Айчыннай вайны Васіль ДАЎЖОНАК ацаніў работу юных мастакоў на «выдатна».



Фота Надзеі БУЖАН.

**ЯРКІЯ фарбы, сур'ёзныя постаці, часам нечаканыя ракурсы — такімі бачацца партрэты, прадстаўленыя ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Быццам у люстэрка, на іх глядзяць людзі адной прафесіі. Прафесіі, якая з'яўляецца сімвалам мужнасці і стойкасці. Прафесіі, якая, напэўна, заўжды будзе атаясамлівацца ў нас з абаронай Брэсцкай крэпасці...**

На працягу года навучэнцы Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя Глебава натхняліся подзвігам абаронцаў цытадэлі, якія ў далёкім 1941-м прынялі на сябе першы ўдар фашыстаў. Шмат чаго цікавага даведаліся юныя мастакі і аб службе сучаснага пакалення пагранічнікаў. У выніку заслужаныя людзі і ветэраны органаў пагранічнай службы сталі героямі серыі мастацкіх палотнаў.

Акцыя «Партрэт пагранічніка» — толькі частка сумеснага маладзёжнага праекта Інстытута пагранічнай службы Беларусі і Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя Глебава «Мужнасцю сваёй у бессмяротнасць крочыўшым». Шэраг мерапрыемстваў, прымеркаваных да 75-годдзя з пачатку Вялікай Айчыннай вайны і 45-й гадавіны стварэння мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць — герой», на працягу года адбылася на пляцоўках Брэста, Мінска і Гродна. І ўсе з адной мэтай — захаваць памяць і ўвекавечыць подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці.

— Так здарылася, што ў 1941 годзе пачалася вайна, якой мы ўсяляк імкнуліся пазбегнуць, — адзначыў **дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Дзмітрый ШЛЯХЦІН**. — Так здарылася, што першы ўдар на сябе прынялі пагранічнікі Брэсцкай крэпасці. Так здарылася, што ў першыя дні гэтыя людзі сталі героямі. І такімі яны павінны застацца назаўжды. Уцешна, што моладзь актыўна прымае ўдзел у праектах, накіраваных на захаванне і мемарыялізацыю памяці аб Вялікай Айчыннай вайне. Гэта паказвае, што сувязь пакаленняў захавана, доказвае, што пра вайну ніколі не забудуць.

Амаль на працягу ўсяго лета карціны навучэнцаў каледжа экспанаваліся на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. Тут жа для юных мастакоў ладзіліся і пленэры. На думку **дырэктара мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць — герой» Рыгора БЫСЮКА**, моладзь прасякнулася духам подзвігу абаронцаў Брэсцкай крэпасці, сучасных воінаў-пагранічнікаў.

«Мы толькі былі б рады, каб гэты пленэр стаў традыцыйным, — падкрэсліў Рыгор Бысюк, дадаўшы: — Мы імкнёмся дапамагаць усім сілавікам, але так склалася, што першымі ў крэпасці сустрэлі ўдар пагранічнікі. З таго часу наша сяброўства толькі мацнее».

Ва ўрачыстай абстаноўцы музейнай Залы Перамогі будучыя пагранічнікі ўручылі персанальныя партрэты тым, з каго варта браць прыклад, — ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, воінам-інтэрнацыяналістам, заслужаным прадстаўнікам пагранічнай службы.

— Тое, што мы сталі ўдзельнікамі гэтага праекта, нас па-свойму ўскалыхнула, — падзяліўся **дацэнт кафедры кіравання органамі пагранічнай службы Інстытута пагранічнай службы Беларусі Генадзь РУКША**. — Гэты праект звязаў лёсы розных пакаленняў пагранічнікаў. Падобныя ініцыятывы выхоўваюць пэўныя адносіны да тых часоў, да подзвігу, які здзейснілі пагранічнікі ў Вялікую Айчынную вайну, у Афганістане, які яны выконваюць штодзённа. Людзей, якія не маюць гістарычнага мінулага, сваёй пазіцыі, погляду на тыя ці іншыя падзеі, лёгка ўвесці ў зман. Моладзь, што ўдзельнічала ў праекце, даведалася нешта новае і ў выніку сфарміравала пазіцыю, якая, магчыма, у чымсьці ўмацуе іх пункт гледжання або створыць новы. Але адназначна яны перададуць гэтую інфармацыю наступным пакаленням.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*



# Паўстагоддзя на лініі фронту

## Ці скончыцца ў Калумбіі грамадзянская вайна?

**На мінулым тыдні ў «топе» стужак сусветных інфармацыйных агенцтваў было мірнае пагадненне, якое адзначыла заканчэнне паўвекавой грамадзянскай вайны ў Калумбіі. Генеральнае пагадненне аб заканчэнні канфлікту і аб усталяванні стабільнага і працяглага міру падпісалі напярэдадні ў горадзе Картахена адмысловымі аўтаручкамі, зробленымі з гільзаў, прэзідэнт краіны Хуан Мануэль Сантас і камандантэ Рэвалюцыйных узброеных сіл Калумбіі (паўстанцкая левапрадыкальная групоўка FARC) Радрыга Ландоньа Эчэверы. Прысутныя на цырымоніі кіраўнікі 15 лацінаамерыканскіх краін і міністры замежных спраў 27 дзяржаў з усяго свету віталі заключэнне мірных пагадненняў. Дзяржсакратар ЗША Джон Кэры заявіў, што Калумбія здзейсніла «гіганцкі крок» на сваім гістарычным шляху, а генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун падзякаваў «усім, дзякуючы каму гэты памятны дзень стаў магчымы». Еўрасаюз, у сваю чаргу, выключыў FARC са спісу тэрарыстычных арганізацый. Але большасць жыхароў краіны падчас рэферэндуму, які адбыўся ў мінулую нядзелю, прагаласавалі супраць прымірэння з паўстанцамі. Так што Калумбіі па-ранейшаму яшчэ далёка да інтэграцыі ў мірнае жыццё. Ці ўдасца шматпакутнай краіне ў рэшце рэшт выкараскацца з багны грамадзянскай вайны?**

### ЧАС «НАРКАПАРТЫЗАНАЎ»

Узброенае супрацьстаянне левапрадыкальных сіл і афіцыйнага ўрада Калумбіі пачалося яшчэ напрыканцы 1950-х гадоў. Яно лічыцца працягам дзесяцігадовага перыяду барацьбы за ўладу Ліберальнай і Кансерватыўнай партый, які ўвайшоў у гісторыю пад назвай «ла віяленсія» — «час гвалту». У гэтыя гады калумбійскія камуністы ваявалі на баку лібералаў, але пасля заканчэння канфлікту адмовіліся ад перамір'я і вырашылі працягваць барацьбу, увасабляючы ідэю «зацяжной партызанскай вайны» Маа Цзэдуна.

Групоўка FARC (Fuerzas Armadas Revolucionarias de Colombia — Рэвалюцыйныя ўзброеныя сілы Калумбіі, у поўнай назве гучыць як FARC-EP, дзе EP — Ejercito del Pueblo — Войска народа) была арганізавана як ваенізаванае крыло мясцовай кампартыі ў 1964 годзе і з тых часоў вяла вайну з урадам за пабудову «новай Калумбіі». Яна абвясціла сябе ваенна-палітычнай апазіцыяй, якая верная ідэям Маркса, Леніна і Балівара, змагаецца за сацыялістычнае грамадства і справядлівасць на ўсёй планеце. Яе росквіт пачаўся ў 1980-я гады на хвалі «какаінавага буму» — рэзкага росту вытворчасці і экспарту какаіну. У гэтыя гады ў Калумбіі склаўся ўмоўны трохкутнік: FARC — «парамілітарэс» — урад. Гэтыя тры гульцы вялі адзін з адным барацьбу за тэрыторыі і даходы ад гандлю наркотыкамі. «Парамілітарэс» называліся байцы «Аб'яднаных сіл самаабароны Калумбіі» — праварадыкальнай групоўкі, якая падтрымлівала арганізаваную злачыннасць і наркабізнес.

Наступныя два дзесяцігоддзі аказаліся самымі кровапралітнымі ў гісторыі калумбійскай грамадзянскай вайны. У цэлым паміж 1958 і 2013 гадамі загінула больш за 220 тысяч чалавек, з якіх 177 тысяч — мірныя жыхары. Каля 45 тысяч чалавек прапалі без вестак і больш за 5 мільёнаў (паводле іншых крыніц, 7 млн) збеглі з краіны. «Ужо тады гэта былі тэрарысты, пад прыкрыццём светлых ідэй, — настойвае **намеснік дырэктара Інстытута Лацінскай Амерыкі РАН Уладзімір СУДАРАЎ**. — Яны выкрадалі людзей, каб атрымаць за іх выкуп. У нейкі момант сталі займацца наркабізнесам. У выніку ўтварылася самая магутная ў свеце неафіцыйная ўзброеная групоўка, сумарны бюджэт якой складаў каля $500 млн у год. Гэта дазваляла ім займацца рэкрутаваннем беднага насельніцтва. Калі беднаму хлопцу даюць $20 тыс. і вінтоўку, самі разумееце, што адбываецца».

FARC адказная за мноства тэрарыстычных актаў, забойстваў і выкраданняў людзей. Нягледзячы на барацьбу з наркакартэлямі, баевікі FARC займалі тэрыторыі вырошчвання кокі і абкладалі «рэвалюцыйным падаткам» яе продаж. У выніку гэтай тактыкі даходы арганізацыі значна ўзраслі, і да 1990-х гадоў яна кантралявала да паловы тэрыторыі Калумбіі і налічвала 17 тысяч добра ўзброеных байцоў. FARC таксама ішла на лакальные супрацоўніцтва з картэлямі, якія дзейнічаюць на падкантрольных тэрыторыях (такімі, як Медэльінскі картэль пад кіраўніцтвам вядомага наркабарона Пабла Эскабара), і часцяком папаўняла свае шэрагі за кошт іх прыватных армій. З таго часу ў амерыканскім палітычным лексіконе за баевікамі замацавалася назва «наркапартызаны». У 2001 годзе Дзяржэпартамэнт ЗША ўнёс FARC у спіс тэрарыстычных арганізацый. Пазней такое ж рашэнне прыняў Еўрасаюз.

З прыходам да ўлады прэзідэнта Альвара Урыбе ў 2002 годзе пачалася сістэматычная барацьба з паўстанцамі. Яго бацьку забілі баевікі FARC, і, яшчэ калі быў губернатарам Аньёкіі, Урыбе праславіўся як дзейны палітык і непрымірымы праціўнік левапрадыкальных паўстанцаў і наркамафіі. У 2002 годзе на яго было здзейснена 18 (!) замахаў, а FARC пагражалі расстрэльваць усіх, хто за яго прагаласуе. Палітыку дапамаглі ЗША, якія да таго часу ўсвядомілі неабходнасць узмацнення барацьбы з наркатрафікам. Атрымліваючы буйную фінансавую і тэхнічную амерыканскую дапамогу, Урыбе здолеў рэарганізаваць войска і ўключыць у яго атрады сялянскай самаабароны. У выніку за некалькі гадоў колькасць байцоў FARC скарацілася да 7 тысяч чалавек. Групоўка кантралявала значную тэрыторыю ў Цэнтральнай Калумбіі і ў венесуэльскім і эквадорскім памежжах. FARC заставалася вернай ідэалогіі радыкальнага марксізму, у апошнія дзесяцігоддзі лічылася галоўным «дахам» наркакартэляў, якія валодаюць плантацыямі кокі ў калумбійскіх джунглях.

Калумбійскі ўрад вёў з паўстанцамі жорсткую барацьбу, у якой ім актыўна дапамагалі ЗША, якія выдаткоўвалі да $450 млн штогод на фінансаванне антынаркатычнай дзейнасці ў гэтай лацінаамерыканскай краіне. Афіцыйная Багата ў адрозненне ад сваіх суседзяў па кантыненце ніколі не мяняла геапалітычнай арыентацыі, застаючыся адным з найважнейшых саюзнікаў Вашынгтона ў Лацінскай Амерыцы. Абранне ў жніўні 2010 года прэзідэнтам правацэнтрыста Хуана Мануэля Сантаса пацвердзіла гэты курс.



Пры падтрымцы ЗША па «Плане Калумбія» Багата спрабавала весці перамовы. «Урад быў гатовы даць партызанам пэўную тэрыторыю, дзе б яны самі былі ўладай, у іх была б свая паліцыя і судовая сістэма. Але з гэтага эксперыменту нічога не атрымалася, таму што FARC адмовіліся весці перамовы», — запэўнівае Уладзімір Судараў.

### КАМАНДАНТЭ ЦІМАШЭНКА

У 2008 годзе ва ўзросце 77 гадоў ад інфаркту памёр лідар і заснавальнік FARC Мануэль Маруланда. Яго змяніў Альфонса Кано — 50-гадовы камуніст, адзін з лідараў колішніх студэнцкіх хваляванняў у Калумбіі. У лістападзе 2011-га Кано быў забіты калумбійскім спецназам. Яго месца заняў Радрыга Ладанья, больш вядомы як Цімалеон Хіменес па мянушцы «Цімашэнка» (паводле адной з версій, запазычыў «рэвалюцыйнае прозвішча» ў савецкага маршала Сямёна Цімашэнкі). Ён вывучаў медыцыну (спецыялізацыя ў галіне кардыялогіі) у Расійскім універсітэце дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы, пасля — на Кубе. Цімашэнка прайшоў ваенную падрыхтоўку ў войску маршала Іосіпа Броз Ціта ў Югаславіі, пасля чаго далучыўся да FARC у сакавіку 1982 года.

Хутка падняўся ў арганізацыі, дасягнуў пасады «камандзіра Дзявятага фронту». У 1986 годзе быў ужо пятым у Цэнтральным штабе FARC. Сваю дзейнасць на пасадзе кіраўніка пачаў з прапановы ўраду прыступіць да мірных перамоваў. «Мы гатовы абмеркаваць прыватызацыю, пытанні зніжэння рэгулявання з боку дзяржавы, абсалютнай свабоды гандлю, дэмакратыю ва ўмовах рынкавай эканомікі», — гаварылася ў заяве камуністычных партызанаў.

На цырымоніі ў Картахене Цімашэнка, апрануты ў кубінскую кашулю гуаябера, выглядаў урачыста і папрасіў прабачэння ў ахвяраў канфлікту. Але першы паўстанцкі камандантэ славіўся сваёй жорсткасцю і бескампраміснасцю. У мае 2006-га ён быў завочна асуджаны ў Калумбіі да турэмнага зняволення тэрмінам на 40 гадоў за шматлікія забойствы і выкраданні людзей, сярод якіх быў адзін з губернатараў краіны. ЗША абвінавацілі яго ў арганізацыі вытворчасці і абароту какаіну ў Калумбіі і іншых краінах Лацінскай Амерыкі і прапанавалі ўзнагароду ў $5 млн за інфармацыю, якая прывядзе да яго затрымання.

### НА ЛЯЗЕ НАЖА

Згодна з праектам, які атрымаў амбіцыйную назву «Да новага калумбійскага поля», 7 млн гектараў планавалася перадаць ва ўласнасць беззямельных сялян. Таксама ўрад выказаў гатоўнасць прафінансаваць замену пасеваў какаінавых кустоў (па звестках ААН, яны ў Калумбіі займаюць плошчу да 96 тыс. га) на іншыя агракультуры. Улады абяцаюць вярнуць FARC з ваеннага камунізму ў мірны капіталізм. Дарэчы, у Калумбіі здаровая разнастайная эканоміка, сарыентаваная на экспарт, у першую чаргу кавы і вугалю. Аднак наркагандаль, карупцыя і палітычная нестабільнасць адпуджваюць інвестараў.

Меркавалася, што месцы ў парламенце адразу на два тэрміны атрымаюць 10 былых партызанаў — па пяць у палаце прадстаўнікоў і сенаце. Яшчэ 16 чалавек будуць прызначаны ў парламент з рэгіёнаў, найбольш пацярпелых ад вайны. Урад паабяцаў даць гарантыі для сацыяльных рухаў і забяспечыць бяспеку ўсіх, хто будзе займацца палітыкай. Па пагадненні ўрада з паўстанцамі, кожны партызан, які дэмабілізаваўся, павінен быў атрымаць $684 у якасці разавай выплаты, а пасля цягам двух гадоў — 90% ад мінімальнай заработнай платы (на сённяшні дзень гэта каля $211). Калі былы вайсковец захоча заняцца бізнесам, то меркавалася, што ён зможа атрымаць пад свой праект $2720.

Аналітыкі сцвярджалі, што рэалізацыя насамрэч гістарычнае пагадненне на практыцы можа быць больш складана, чым заключыць фармальнае перамір'е. Інтэграцыя былых партызанаў у грамадзянскае жыццё ўяўляе сабой складаную задачу. Не меншыя цяжкасці ўяўляла правядзенне ваеннага трыбунала над усімі ўдзельнікамі канфлікту, рашэнні якога павінны балансаваць на лязе нажа, каб не справакаваць ні адзін з бакоў на зрыў дагавора.

Ёсць таксама рызыка, што частка партызанскага руху не падпарадкуецца рашэнню вярхушкі скласці зброю і адмовіцца ад ранейшага жыцця, што пацягне за сабой раскол арганізацыі. Карэспандэнт брытанскага выдання The Guardian у Калумбіі апытала паўстанцаў пра тое, што яны думаюць наконт перамоваў лідараў іх руху з урадам. Многія з іх не могуць уявіць жыццё «без сваіх АК-47». Як мінімум адзін атрад FARC абвясціў, што не збіраецца падпарадкоўвацца плану дэмабілізацыі і «працягне барацьбу за ўладу народа і для народа».

У палітычнай эліце Калумбіі таксама ёсць незадаволеныя гэтым пагадненнем, у іх ліку колішні прэзідэнт Урыбе, які паклаў на барацьбу з «наркапартызанамі» ўсю сваю палітычную кар'еру. Крытыкі заклікаюць перагледзець пункты дамовы і вынесці жорсткае пакаранне баевікам. Недавер насельніцтва да свайго ўрада, як і да гатоўнасці FARC скласці зброю, а таксама праблема наркагандлю, якая не страчвае актуальнасці, становяцца перашкодамі на шляху ўсталявання міру. Што, дарэчы, яскрава прадэманстравалі вынікі нядзельнага рэферэндуму — па сутнасці, краіна аказалася расколатай на два непрымірымыя лагеры.

Па словах прэзідэнта Калумбіі Хуана Мануэля Сантаса, рэжым прыпынення агню паміж узброенымі сіламі краіны і паўстанцамі з FARC, які быў аб'яўлены напрыканцы жніўня, застаецца ў сіле. Камандантэ Цімашэнка таксама выказаў імкненне да міру, нягледзячы на вынікі рэферэндуму.

Французскі палітолаг, спецыяліст па Лацінскай Амерыцы Стэфан Ланэ, лічыць, што да ўсталявання поўнага міру ў Калумбіі яшчэ далёка: «Гэта краіна, дзе існуе мноства нелегальных узброеных груповак, папросту злачынных бандаў. Так што калі нават мірнае пагадненне з FARC будзе рэалізавана, то агульны мір усё роўна не наступіць. Краіна па-ранейшаму будзе часткова знаходзіцца ў стане вайны».

Застаецца спадзявацца, што шляхі да выхаду з грамадзянскай вайны ўсё ж будуць знойдзены. Важна, што калісьці варожыя бакі выказалі да гэтага імкненне. Як трапна заўважыў сусветна вядомы калумбійскі пісьменнік, «бацька» лацінаамерыканскага «містычнага рэалізму» Габрыэль Гарсія Маркес, «хвіліна прымірэння каштуе больш за неразлучнае сяброўства». Тут не паспрачаешся.



**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БПХО»

### с понижением начальной цены продажи на 40 процентов

| № п/п | Наименование лота | Местонахождение | Начальная цена продажи, с учетом НДС, руб. коп. | Задаток 20%, руб. коп. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **Лот № 17** – капитальные строения и прочее имущество: | | | |
| 1.1 | Здание столовой-заготовочной с инвентарным номером 110/С-93065, площадью 1959,6 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га | **516 521,16** | **103 304,23** |
| 1.2 | Хозяйственный сарай №1 с инвентарным номером 110/С-102285, площадью 16,8 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3/3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га | **3 453,62** | **690,72** |
| 1.3 | Хозяйственный сарай №2 с инвентарным номером 110/С-102300, площадью 80,2 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3/4, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га | **10 463,54** | **2 092,71** |
| 1.4 | Благоустройство с инвентарным номером 110/С-102283, площадью 4692,0 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га | **87 818,83** | **17 563,77** |
| 1.5 | Благоустройство (деревья) с инвентарным номером 110/С-102283 | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га | **2 995,49** | **599,10** |
| 1.6 | Водопроводная сеть с инвентарным номером 110/С-102288, протяженностью 23,3 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га | **254,42** | **50,88** |
| 1.7 | Канализационная сеть с инвентарным номером 110/С-102287, протяженностью 221,2 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га | **901,58** | **180,32** |
| 1.8 | Передаточное устройство: низковольтная кабельная линия, инвентарный номер 050012 по бухгалтерскому учету ОАО «БПХО» | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3 | **166,68** | **33,34** |
| 1.9 | Противопожарная сигнализация А16-512 № 29/07 АПС, инвентарный номер 100217 по бухгалтерскому учету ОАО «БПХО» | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3 | **1 288,37** | **257,67** |
| | **Итого:** | | **623 863,69** | **124 772,74** |

**Аукцион состоится 04 ноября 2016 в 14.00 по адресу: 225410, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 503, 5-й этаж.**

**Организатор аукциона:** открытое акционерное общество «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение» (ОАО «БПХО»), г. Барановичи, ул. Фабричная, 7.

Заявления и документы на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 602. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **31.10.2016**.

Задаток вносится до подачи заявления на участие в аукционе на р/с 3012605450052 в отделении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501245, получатель платежа – ОАО «БПХО», УНП 200166488.

Шаг торгов – 5 процентов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня подписания (утверждения) протокола о проведении аукциона. Сроки оплаты за предмет аукциона устанавливаются при заключении договора купли-продажи с продавцом.

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 3 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением.

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона по тел.: **(80163) 47-63-80, 47-63-50, 47-65-17.**

## ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»

УНП 100036332

**извещает своих акционеров (их представителей) и кредиторов о том, что на основании решения внеочередного Общего собрания акционеров от 18.08.2016 открытое акционерное общество «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ», место нахождения: 220007, г. Минск, ул. Володько, 20, РЕОРГАНИЗОВАНО ПУТЕМ ПРИСОЕДИНЕНИЯ К НЕМУ открытого акционерного общества «Таксомоторный парк» г. Брест, место нахождения: 224012, г. Брест, ул. Д. Донского, 6/1, каб. 33 (решение о реорганизации принято внеочередным общим собранием акционеров от 17.08.2016).**

Простые (обыкновенные) акции дополнительного выпуска ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» будут распределены между акционерами ОАО «Таксомоторный парк» г. Брест пропорционально количеству принадлежавших им акций ОАО «Таксомоторный парк» г. Брест.

Простые (обыкновенные) акции ОАО «Таксомоторный парк» г. Брест в количестве 104 583 штук подлежат аннулированию.

Государственная регистрация изменений в устав ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» и внесения в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей записи о прекращении деятельности присоединенного ОАО «Таксомоторный парк» г. Брест произведена 28.09.2016.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ТОРГАХ (В ВИДЕ АУКЦИОНА)

### Лепельский районный исполнительный комитет Витебской области объявляет открытые торги в форме аукциона о предоставлении права на заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака (Astacus leptodactylus) на территории следующих водных объектов:

| Наименование водоема | Местонахождение, площадь, га | Допустимый объем изъятия рака | Начальная цена продажи предмета аукциона*, млн рублей | Сумма задатка, млн рублей |
|---|---|---|---|---|
| Озеро Мухно | 12 км на северо-восток от г. Лепеля | 26 кг | 4200 *(420 р.)* | 2100 *(210 р.)* |
| Озеро Неколочь | 15 км на северо-восток от г. Лепеля | 24 кг | 4200 *(420 р.)* | 2100 *(210 р.)* |
| Озеро Бобрица | 10 км на северо-восток от г. Лепеля | 100 кг | 4200 *(420 р.)* | 2100 *(210 р.)* |
| Озеро Лядно | 8 км на северо-восток от г. Лепеля | 26 кг | 4200 *(420 р.)* | 2100 *(210 р.)* |
| Озеро Щибот | 10 км на северо-восток от г. Лепеля | 18 кг | 4200 *(420 р.)* | 2100 *(210 р.)* |
| Озеро Матырино | 17 км на северо-восток от г. Лепеля | 17 кг | 4200 *(420 р.)* | 2100 *(210 р.)* |

*Примечание: * оплата производится в белорусских рублях исходя из размера базовой величины, установленной на день оплаты.*

**ОРГАНИЗАТОР** – Лепельский районный исполнительный комитет, 211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, контактный телефон (802132) 41382, факс 48074, электронный адрес: tat.chues@yandex.by

**ПРОДАВЕЦ** – Лепельский районный исполнительный комитет, 211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, контактный телефон (802132) 41382, факс 48074.

**1. Аукцион состоится 3 ноября 2016 года в 15.00 по адресу: 211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, кабинет 220.**

2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица или индивидуальные предприниматели Республики Беларусь.

Участникам необходимо в адрес организатора предоставить:

- заявление на участие в аукционе;
- копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий счет организатора аукциона, заверенную банком;
- юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;
- индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
- представителям юридических лиц или индивидуальных предпринимателей предоставить доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

**3. Документы, необходимые для участия в аукционе, принимаются организатором аукциона по адресу: 211174, Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6, кабинет 226 с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням.**

**4. Последний день приема документов – 28 октября 2016 года до 17.00.**

**Заключительная регистрация участников 3 ноября 2016 года с 12.00 до 14.30.**

К участию не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

*5. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет 3641319001105 в ЦБУ № 211 филиала № 214 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 660, УНП 300039625, ОКПО 040626632000, получатель платежа – Лепельский районный исполнительный комитет.* Участнику, выигравшему торги, сумма внесенного задатка учитывается в счет возмещения затрат на организацию и проведение торгов, изготовление документации, необходимой для их проведения.

6. Организатор аукциона после опубликования извещения о проведении аукциона вправе снять предмет с аукциона до его проведения в случаях отсутствия участников аукциона либо наличия только одного участника аукциона. При этом комиссия составляет протокол о снятии с аукциона предмета аукциона и признания аукциона несостоявшимся.

7. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене.

8. Если ни один из участников аукциона не желает приобрести предмет аукциона по первой названной аукционистом цене, аукционист называет эту цену трижды и снимает данный предмет аукциона с аукциона, о чем комиссией составляется протокол.

9. Аукцион проводится в соответствии с Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. №699.

10. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Согласие либо отказ такого лица приобрести предмет аукциона отражается в протоколе аукциона. Лицу, выразившему согласие приобрести предмет аукциона, сумма внесенного задатка засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.

11. Победитель аукциона (лицо, предложившее наиболее высокую цену) в течение 5 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий счет сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка.

12. Решение комиссии по результатам торгов оформляется протоколом. Протокол подписывается председателем, членами комиссии и победителем торгов в день проведения торгов и в течение 14 дней представляется вместе с проектом решения о предоставлении права на заготовку и (или) закупку диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, в местный Совет депутатов.

## Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

### 4 ноября 2016 г. проводит открытый аукцион с условиями № 12-У-16 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).

**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на одном земельном участке в г. Минске, предоставляемом в аренду сроком на 5 лет:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, рублей образца 2009 года/ рублей образца 2000 года | Сумма задатка, рублей образца 2009 года/ рублей образца 2000 года | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рублей образца 2009 года/ рублей образца 2000 года | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, рублей образца 2009 года/ рублей образца 2000 года |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, в районе ул. Нововиленской | 35,8726 | для строительства объекта «Многофункциональный комплекс в районе ул. Нововиленской» | 16 203 764,42/ 162 037 644 200 | 2 400 000/ 24 000 000 000 | 10 661,19/ 106 611 900 | Снос здания канализационной насосной станции № 14 по ул. Нововиленской, 25А. Возмещение в бюджет г. Минска убытков, понесенных на освобождение (включая снос) площадки бывшей птицефабрики | 75 800 / 758 000 000 |

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

**Аукцион состоится 4 ноября 2016 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток не позднее 31 октября 2016 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

**представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

**дополнительно представляются:**

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона (его представитель), предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6, с 5 октября 2016 г. по 31 октября 2016 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).**

Торги в отношении земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона** в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись. Оплата производится по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;

** – единственному участнику несостоявшегося аукциона – выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка в аренду.

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения) Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельному участку (в том числе с характеристиками расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by**

## Рабі, як мы!

# «Скураны блюз» і «Тайны дрэва»

### На выставу — у Масты!

**Год культуры ў Мастах адзначаюць цікавымі выставамі з удзелам не толькі мясцовых майстроў, але і гасцей з іншых рэгіёнаў Беларусі і замежжа. Напрыклад, літоўская майстрыха Алдона ЛЕБУВЕНЕ са сваімі калегамі па раместву, гродзенцамі Таццянай і Ігарам ПЯРВУХІНЫМІ, пазнаёмілася летась на «Славянскім базары» ў Віцебску, а сёлета з сумеснай выставай «Творчасць без межаў» яны прыехалі ў Масты. На ёй былі прадстаўлены жаночыя ўпрыгажэнні з натуральнай скуры і камянёў, сукенкі і кардыганы, звязаныя пруткамі і шыдэлкам, і іншыя вырабы.**

Цікава: а чаму менавіта ў Масты завітала беларуска-літоўская выстава? Чым прывабіў невялікі горад?

— Выдатных рамеснікаў шмат, але раней у нас не было належных умоў, каб паказаць іх работы. Вось і ўзнікла ідэя выкарыстаць памяшканне, якое вызвалілася ў горадзе, пад выставачную залу. Мясцовая ўлада пайшла нам насустрач, — расказвае **дырэктар Мастоўскага раённага цэнтра рамёстваў Жанна НОВІК.**

Скурка, як кажуць, аказалася вартай вычынкі, і цяпер ужо многія майстры скарысталіся паслугамі выставачнай залы ў Мастах. Тыя ж Таццяна і Ігар Пярвухіны, якія ўжо больш за 30 гадоў займаюцца мастацкай апрацоўкай скуры і яе спалучэннем з іншымі матэрыяламі, у мінулым годзе паказалі мясцовым жыхарам выставу «Скураны блюз», а сёлета прапанавалі беларуска-літоўскую «Творчасць без межаў». Дарэчы, для мастачан, якія прыйшлі на адкрыццё гэтай выставы, аўтары падрыхтавалі сюрпрыз — розыгрыш падарункавых сертыфікатаў на набыццё сваіх работ. Шчаслівыя атрымалі арыгінальныя ўпрыгажэнні.

Тэматыка выстаў, якія ладзіць раённы цэнтр рамёстваў, таксама межаў не ведае. Тут, напрыклад, і «Плецены свет» (вырабы з лазы) гродзенцаў Наталлі і Андрэя Піваварчыкаў, і вышытыя карціны мясцовых майстрых Марыі САЎКО і Галіны Пракопчык, і «Тайны дрэва» (драўляныя шкатулкі) мінчаніна Дзяніса Галузы... У найбліжэйшых планах выставы ўпрыгажэнняў з медзі ручной работы са сталіцы, вязаных вырабаў з Гомельшчыны, валеных цацак з Гродна.

— Дзякуючы выставачнай дзейнасці мы зарабляем грошы і адначасова папулярызуем майстроў, якія потым атрымліваюць індывідуальныя заказы ад нашых жыхароў альбо гасцей горада, — кажа Жанна Новік.

Дарэчы, многія мастаўчане не толькі ахвотна наведваюць выставы, але і самі вучацца тым ці іншым відам рамёстваў. З 1 верасня працуюць курсы, дзе майстры цэнтра рамёстваў дапамогуць усім ахвотным авалодаць тэхналогіямі керамікі і ганчарнай справы, саломапляцення, лапапляцення, разьбы па дрэве, вязання, вышыўкі, ткацтва, вырабу інтэр'ерных лялек і лялек-абярэгаў, сувеніраў са скуры і многімі іншымі. У мінулым сезоне навучанне на гэтых курсах прайшло каля 60 чалавек.

— Мы рады бачыць і дзяцей, і дарослых. Кошт навучання на сённяшні дзень складае 100 рублёў. Падстройваемся пад кожнага ахвотнага, каб яму было зручна па часе, — зазначае Жанна Новік. — Хтосьці жадае навучыцца лазапляценню для афармлення сваёй агразядзібы, хтосьці хоча вырабляць нейкія кашолкі... Прычым, вельмі актыўнымі сталі людзі пенсійнага ўзросту. Пасля ўходу на заслужаны адпачынак у іх больш вольнага часу і чаму не навучыцца нейкаму рамяству, каб упрыгожыць свой дом?

— Які від рамёстваў больш за ўсё прываблівае мастаўчан?

— Апошнім часам — лапапляценне. У нас зараз працуе майстрыха, якая вырабляе выдатныя рэчы для дамашняга ўжытку. Навучыць кожнага зацікаўленага.

Што ж тычыцца рамеснікаў-прафесіяналаў, то іх прыцягваюць не толькі на выставы, але і на кірмашы, святы. Супрацоўнічаюць з этнакрамамі ў Мінску і Гродне, куды майстры на пастаяннай аснове пастаўляюць свае вырабы. Купіць іх можна і ў выставачнай зале цэнтра рамёстваў. Там жа прымуць і заказ, напрыклад, на нейкі эксклюзіўны сувенір. Майстар абмяркуе з заказчыкам, што ён хоча, і адразу ж возьмецца за работу.

Мастоўскі цэнтр рамёстваў папулярызуе і яго актыўная работа ў інтэрнэце.

— Зарэгістравалі свае групы ў сацыяльных сетках, дзе пастаянна паказваем нашы работы, паведамляем аб выставах, кірмашах, у якіх удзельнічаем, — кажа Жанна Новік. — Людзі цікавяцца, прапануюць нейкія творчыя ідэі, варыянты супрацоўніцтва. Здараецца, такім чынам і заказы для майстроў атрымліваем.

Вось так на практыцы пацвярджаецца народная мудрасць, што вада не цячэ пад ляжачы камень.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*



Мастоўскі цэнтр рамёстваў пастаянна ўдзельнічае ў раённых, абласных, рэспубліканскіх выставах, кірмашах і святах.

## Горад-гісторыя

# «ПРАГУЛКІ» НА ВЕРТАЛЁЦЕ, РЫЦАРСКІЯ БАІ І БЯСПЛАТНЫЯ ПІРОЖНЫЯ

### Слуцк адзначыў сваё 900-годдзе

**1 і 2 кастрычніка, са слоў случчан, былі для іх лепшымі выхаднымі. Свята пачалося з тэатралізаванага шэсця «Слаўны ў стагоддзях горад Слуцк», якое працягвалася гадзіну. Такога масавага відовішча тут не бачылі даўно.**

З юбілеем Слуцк павіншавалі вядомыя выканаўцы і гурты: Аляксей Хлястоў, Алёна Ланская, Аляксей Грос, Дарыя, «Дразды» і «Дзі-Бронкс і Наталі», аматарскія калектывы. Уразілі жыхароў Слуцка шоу спявачкі Улады «КультУРА» пры падтрымцы радыёстанцыі «Радыус FM», тэатралізаванае неонавае шоу.

Кожны сельсавет раёна зладзіў выставу падворкаў. Гасцінныя гаспадары частавалі ўдзельнікаў свята мёдам, прадуктамі дамашняга прыгатавання, дарамі саду і агароду. Тутэйшыя ўмельцы дэманстравалі свае работы з лазы, саломкі, гліны. У 22 гадзіны горад упрыгожыў святочны феерверк, які працягваўся 8 хвілін. Але свята на гэтым не закончылася: да 2 гадзін ночы доўжылася дыскатэка, што асабліва радавала моладзь.

Рыцарскі фестываль «Паядынак на Слуцкім замчышчы» правялі клуб «Сярэбраны Пегас» Цэнтра традыцыйнай культуры Слуцка і рыцарскія клубы Мінска, Маладзечна, Ваўкавыска.

Асабліва спадабаліся дарослым і дзецям «прагулкі» над горадам на верталёце. А каля нядаўна адкрытага помніка Анастасіі Слуцкай быў зладжаны спектакль «У гонар сваёй зямлі» «Майстэрняй уражанняў» з Мінска. Да княгіні Анастасіі прывялі сялянку. Яна паскардзілася, што татары знішчылі ўсіх жыхароў вёскі. А тут з'явіўся і сам пасол хана Баты-Гірэя, які паставіў ультыматум: аддаць горад без бою і плаціць даніну. Вораг пасмяяўся, што Анастасія нават шаблю не можа трымаць у руках, каб абараніць Слуцк. У адказ яна прапанавала праверыць гэта: «Я павінна даказаць сваю здольнасць камандаваць войскам. Бог не дапусціць паразы! І я ў сваім горадзе, мне дапамогуць сваёй падтрымкай жыхары!» Гледачоў запрасілі паўдзельнічаць у бітве з сапраўднай зброяй. Многія адгукнуліся. Нават самыя маленькія случчане з ахвотай узяліся за мячы і шаблі. Праўда, ім не даверылі сапраўдныя. А пасля калектывы гарадскога Дома культуры выканалі песні пра Анастасію Слуцкую. Ім падпявалі гараджане.

Самы актыўны ўдзел у святкаванні прыняў і гандаль. Гасцям прапаноўвалі лепшую прадукцыю. Работнікі кафэ «Калізей» у гонар юбілею горада раздалі жыхарам Слуцка і іх гасцям бясплатна 900 пірожных.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.17 | 18.38 | 11.21 |
| Віцебск — | 7.09 | 18.26 | 11.17 |
| Магілёў — | 7.08 | 18.28 | 11.20 |
| Гомель — | 7.03 | 18.26 | 11.23 |
| Гродна — | 7.33 | 18.53 | 11.20 |
| Брэст — | 7.32 | 18.55 | 11.23 |

### Месяц

*Маладзік 01.10 — 08.10*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

### Імяніны

*Пр. Аляксандра, Аляксея, Андрэя, Валянціна, Васіля, Данілы, Івана, Іосіфа, Канстанціна, Уладзіміра.*
*К. Разаліі, Ружы, Конрада, Францішка.*



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**У маладой і прыгожай настаўніцы з вялікімі грудзьмі ў 10 «А» класе за першай партай сядзяць пяць чалавек.**

Толькі тата можа заснуць пад тэлевізар, які гарлапаніць, і прачнуцца, калі яго выключыць.

**Мужык завёў на сваім участку пчальнік. Сябар яго пытаецца:**

**— Навошта табе гэтыя пчолы? Няўжо цяжка мёд у краме купіць?**

**— Купіць, можа, і няцяжка, толькі пасля таго, як маю цешчу пчолы пакусалі, яна да нас больш ні нагой.**

Чалавецтва да гэтага часу не барозніць абшары галактыкі толькі таму, што нейкая баба аднойчы сказала: «Табе твая фізіка даражэй за мяне!»




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3935.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 кастрычніка 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12